Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЛІПЕНЯ 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 135
(26493)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

У Беларусі на закупку прадукцыі раслінаводства ў 2009 годзе будзе выдадзена крэдытаў на Br2,43 трлн

У Беларусі на закупку прадукцыі раслінаводства ўраджаю 2009 года і іншай прадукцыі ў гэтым годзе будзе выдадзена крэдытаў на Br2,43 трлн. Адпаведны ўказ № 386 «Аб некаторых пытаннях дзейнасці арганізацый, якія ажыццяўляюць закупку прадукцыі раслінаводства ўраджаю 2009 года і іншай прадукцыі і разлікі за яе» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 21 ліпеня.

Указам прадугледжваецца кампенсацыя банкам (ААТ «Белагрmaпрамбанк», «ААБ Беларусбанк», «Белінвестбанк», «БПБ-Банк» і «Белзнешэканомбанк») часткі працэнтаў за карыстанне крэдытамі ў суме Br2,43 трлн, што выдаюцца арганізацыям, якія ажыццяўляюць закупку прадукцыі раслінаводства ўраджаю 2009 года і іншай прадукцыі.

Названыя крэдыты выдаюцца на тэрмін да аднаго года пад гарантыі ўрада і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Крэдыты ў суме Br2315,6 млрд накіроўваюцца на закупку збожжа, льнотрасты, льновалакна, льняногa семя, алейнага семя рапсу, цукровых буракоў, піваварнага ячменю, бялковай сыравіны, камбікорму, зернебабовых і крупяных культур, вотруб'я, правіту, кукурузы, насення сланечніку, мелесу, фасфатаў, прэміксаў, насення агародніных культур, кармавых караняплодаў, цыбулі-сеянкі, у тым ліку для дзяржаўных патрэбаў, а таксама на аплату транспартных расходаў па дастаўцы такой прадукцыі. Сродкі выдзяляюцца ў беларускіх рублях і замежнай валюце з ліпеня 2009 года па жнівень 2010 года.

У гэтым годзе для дзяржаўных патрэбаў будзе закуплена 1025 тыс. тон харчовага збожжа, 332 тыс. тон алейнага семя рапсу, 3600 тыс. тон цукровых буракоў, 150 тыс. тон піваварнага ячменю, 186 тыс. тон збожжа на спірт і 35 тыс. тон ільновалакна.

Крэдыты ў суме Br114,4 млрд выдзяляюцца на закупку бульбы, пладоў, агародніны, ягад і грыбоў (у тым ліку дзікарослых), ячменю для вытворчасці кафейнага напітку, аплату матэрыялаў для іх перапрацоўкі, тары і транспартных расходаў па дастаўцы такой прадукцыі. Яны прадастаўляюцца ў беларускіх рублях у гэтым годзе.

На закупку прадукцыі ў насельніцтва прадугледжана выкарыстанне наяўных грашовых сродкаў.

Як адзначылі ў прэс-службе, такая мэтавая фінансавая падтрымка дзяржавай аднаразовых закупак харчовай і фуражнай сыравіны, іншай сельскагаспадарчай сыравіны, іншай прадукцыі стварае ўмовы для забеспячэння харчовай бяспекі краіны і ўстойлівай работы прадпрыемстваў рэспублікі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Амаль Br73 млн накіравана на заахвочванне адораных вучняў і студэнтаў Беларусі

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў. Адпаведнае распараджэнне Прэзідэнт падпісаў 21 ліпеня.

У цэлым на заахвочванне адораных вучняў і студэнтаў будзе накіравана амаль Br73 млн. Прэміямі адзначаны пераможцы школьных і студэнцкіх рэспубліканскіх алімпіядаў, конкурсаў, турніраў і канферэнцый.

Грашовымі прэміямі з уручэннем нагруднага знака лаўрэата спецыяльнага фонду заахвочаны шэсць пераможцаў 43-й міжнароднай Мендзялееўскай алімпіяды школьнікаў па хіміі (Туркменістан, 2009 год). Вучаніцы 9 класа мінскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 22 Наталлі Елавік, таксама пераможцы гэтай алімпіяды, назначана заахвочвальная стыпендыя спецфонду на адзін каляндарны год у памеры Br140 тыс. з уручэннем нагруднага знака лаўрэата спецфонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Едзеш ва Ўкраіну — афармі страхоўку

Грамадзянам Беларусі, якія выязджаюць ва Украіну на адпачынак, настойліва рэкамендуецца афармляць медыцынскія страхоўкі. Аб гэтым паведаміў саветнік па консульскіх пытаннях пасольства Рэспублікі Беларусь ва Украіне Уладзімір Аўтух.

Нягледзячы на тое, што пры перасячэнні беларуска-ўкраінскай мяжы афармленне поліса медыцынскага страхавання не з'яўляецца абавязковай нормай, нярэдка гэта становіцца вялікай праблемай для беларускіх грамадзян, якія трапляюць у няштатныя сітуацыі на тэрыторыі суседняй дзяржавы, адзначыў дыпламат.

У першую чаргу гэта датычыцца тых, хто накіроўваецца ў летні перыяд на адпачынак і аздараўленне да Чарнаморскага ўзбярэжжа, у тым ліку цэлымі сем'ямі, з непаўналетнімі дзецьмі, а таксама беларусаў, якія перамяшчаюцца транзітам праз тэрыторыю Украіны.

Як паказвае практыка, некаторым беларускім грамадзянам, якія вырашылі зэканоміць сродкі на аплаце медыцынскай страхоўкі і трапілі пры гэтым у бяду, даводзіцца плаціць намнога даражэй за нядбалае стаўленне да свайго здароўя.

Паводле слоў консула, у адпаведнасці з існуючымі пагадненнямі паміж беларускім і ўкраінскім бокам органы аховы здароўя пры неабходнасці аказваюць першую медыцынскую дапамогу грамадзянам гэтых краін.

У той жа час ва Украіне медыцына цяпер знаходзіцца ў такім стане, што пры ўзнікненні больш складаных сітуацый у медперсаналу, які бясплатна гатовы аказаць дапамогу пацярпеламу, пад рукой, як правіла, не аказваецца ўсіх неабходных сродкаў, медыкаментаў і прэпаратаў. І ў такіх сітуацыях вялікае значэнне мае наяўнасць у пацярпелага іншаземнага грамадзяніна поліса медыцынскага страхавання.

Прыкладам могуць паслужыць два буйныя дарожна-транспартныя здарэнні, што адбыліся за апошні тыдзень на тэрыторыі Украіны з удзелам беларускіх грамадзян у час іх перамяшчэння на адпачынак, нагадаў саветнік па консульскіх пытаннях пасольства.

Цяпер з пяці пацярпелых у ДТЗ 14 ліпеня ў Крыме беларускіх турыстаў двое віцябчан — 41-гадовая маці і 19-гадовая дачка — са шматлікімі траўмамі і пераломамі да гэтага часу знаходзяцца на лячэнні ў адной з гарадскіх бальніц Сімферопаля. Для пераезду ў Беларусь яны з'яўляюцца нетранспартабельнымі, у той жа час патрабуюць тэрміновага аперацыйнага ўмяшання, аднак украінскія медыкі такой дапамогі без страхоўкі аказаць не могуць.

У такой сітуацыі апынулася і сям'я з пяці чалавек з Мінска, якая ехала на адпачынак у Крым і трапіла ў аварыю 15 ліпеня на тэрыторыі Мікалаеўскай вобласці. Трагедыя здарылася а шостай гадзіне раніцы, калі стомленыя муж і жонка, якая знаходзілася на той момант за рулём Mitsubishi Carisma, заснулі і аўтамабіль з'ехаў з трасы. Мясцовым выратавальнікам давялося вызваляць пацярпелых з пакарабачанага аўтамабіля з дапамогай электранажніц, расціскальніка і дамкрата. На гэты час дастаўленыя ў раённую бальніцу пацярпелыя дарослыя ўжо выпісаны, а два іх сыны 8 і 10 гадоў знаходзяцца пад наглядам урачоў і маюць патрэбу ў кваліфікаванай медыцынскай дапамозе.

БЕЛТА.

Кожны чацвёрты — у сферы прыватнага бізнэсу

Кожны чацвёрты жыхар сталіцы заняты ў сферы прыватнага бізнэсу. Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні прадпрымальніцтва Мінгарвыканкама.

Колькасць грамадзян, занятых у малым бізнэсе, няўхільна расце. Па звестках ўпраўлення, колькасць малых прадпрыемстваў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія знаходзяцца на падатковым уліку, павялічылася на 34 тысячы. Цяпер у сталіцы зарэгістраваны каля 46 тысяч ІП і звыш 26 тысяч юрыдычных асобаў. Удзельная вага малога прадпрымальніцтва ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці складае каля 16 працэнтаў. Структура прыватнага бізнэсу адносна галін эканомікі выглядае наступным чынам: да прамысловага сектара адносяцца 17,6 працэнта прадпрыемстваў, будаўніцтва — 10,4, гандлю і грамадскага харчавання — 45,4, транспарту — 6,6, аховы здароўя, фізічнай культуры і сацыяльнага забеспячэння — 2,2, сельскай гаспадаркі — 0,1, іншых галін — 17,7 працэнта.

Наталля ВАВІЛАВА, «Мінск—Навіны».

ЛЁЗНЕНСКІЯ ЧЫПАЛІНКІ

Навучэнцы школ Лёзненскага раёна, якія адпачываюць у працоўным лагеры ў вёсцы Чарніцы, на праполцы палеткаў агародніны з будучым ураджаем цыбулі. На пярэднім плане сямікласніцы Антаніна СКРЫПЯЛЁВА і Аліна ЛОКЦЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Камандзіроўка па пісьме

ШКОЛА Ў ВЕРАСНІЦЫ — ДА 1 ВЕРАСНЯ

Два піянеры, пафарбаваныя ў колер сталі, сустракаюць кожнага ля школы ў вёсцы Верасніца, што ў Жыткавіцкім раёне. Яны — жывы, а дакладней, бетонны напамін гістарычнай эпохі. Тады, у канцы 50-х—пачатку 60-х, у населеным пункце была пабудавана свая сярэдняя школа. Праект быў тыповы — без размернасцяў. Бабулі і дзядулі сённяшніх вучняў не вельмі задумваліся над тым, ці зручна, ці ўтульна ў школе. Не да таго было. Сёння іншы час і іншыя патрабаванні. Менавіта таму, нягледзячы на эканамічны крызіс, бацькам і настаўнікам хочацца, каб у школе, дзе гэтай спякотнай парой у самым разгары капітальны рамонт, было ўсё, як у горадзе: і сталоўка, і спартзала, і прыбіральня ў памяшканні. Ці здзейсніцца мара? У гэтым не ўпэўнены бацькоўскі камітэт школы. Відаць, таму і з'явіўся аднолькавы ліст у рэдакцыю нашай газеты і некаторыя іншыя. Падставай для хваляванняў стаў агляд будаўніцтва бацькамі. Тыя здымкі, якія яны даслалі, сапраўды, непрыемна ўражвалі: нейкія падцёкі на сценах памяшкання і пытанне: «Чаму ў такой краіне з такімі вялізнымі лядовымі палацамі, палацамі спорту, бібліятэкай, якая вядомая ва ўсім свеце, не можа дабудавацца маленькая вясковая школа». І яшчэ скаргі на рабочых, якія «адпрацоўваюць павіннасць». І 59 подпісаў.

Я прыехала ў вялікую вёску, дзе вучнямі лічацца 157 дзяцей, разам з кіраўніцтвам ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама. Праходзім прыкладна тым жа шляхам, якім праходзіў бацькоўскі камітэт у красавіку. Без спецыялістаў-будаўнікоў складана разабрацца, у якой ступені гатоўнасці знаходзіцца зараз гэты аб'ект. Каментарыі дае Валерый Усікаў, генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Палессебуд», якое з'яўляецца генеральным падрадчыкам будаўніцтва школы. Субпадрадчык — мясцовае ПМК-97.

— Працэнтаў 75 зроблена на гэты момант. 90 % будзе да 1 жніўня. Другі паверх пачнуць з першага жніўня рабіць начыста. Добраўпарадкаванне на гэтым тыдні пачнецца.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Прамая лінія

ДАПАМОГА АД «ПРАПІСКІ» НЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ

Як вядома, апошнім часам статыстыка канстатуе паступовае павелічэнне нараджальнасці, і сам па сабе гэты факт — прыемны. Але ў той жа час не сакрэт: з'яўленне дзіцяці заўсёды адбіваецца на ўзроўні дабрабыту. А адсюль і цікавасць да тэмы сацыяльнай падтрымкі сем'яў і дзяцей. Як прызначаюцца «дэкрэтныя», хто мае права на «лішні» выхадны, якія дадатковыя гарантыі вызначаны для дзяцей-інвалідаў і што ўплывае на прызначэнне дапамогі на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады — аб усім гэтым ішла гаворка падчас чарговай «прамой лініі» нашай газеты. Такім чынам, на пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць начальнік аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандра Васільеўна ЛІСОЎСКАЯ і кансультант гэтага ж аддзела Марына Барысаўна АРЦЁМЕНКА.

☎ — Нядаўна ўзнікла такая праблема: у раёне склалі акт, нібыта я жыву ў грамадзянскім шлюбе, вынікам чаго стала спыненне выплаты дапамогі на старэйшых дзяцей ва ўзросце 7 і 9 гадоў. Аднак пагадзіцца з такім рашэннем цяжка ўжо з адной прычыны — мой як выццам «грамадзянскі муж» амаль увесь час жыве і працуе ў Расіі. Што рабіць у такой сітуацыі?

Па-другое. Наша сям'я шматдзетная, я займаюся выхаваннем адна і пакуль не працую, бо знаходжуся ў водпуску па доглядзе малога дзіцяці. Ці можна ў сувязі з гэтым разлічваць на якую-небудзь дадатковую матэрыяльную падтрымку? І яшчэ. Ці павінна я плаціць за харчаванне двух старэйшых дзяцей у школе?

Лілія Віктараўна ЦІМАФЕЕВА, *Аршанскі раён*

— Паводле заканадаўства, калі прызнана, што ёсць грамадзянскі муж, сям'я лічыцца поўнай. А з гэтага вынікае наступнае. Па-першае, для атрымання права на дапамогу на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады муж павінен працаваць — за выключэннем некаторых выпадкаў, скажам, калі муж лічыцца інвалідам, даглядае інваліда I групы або старога ва ўзросце больш за 80 гадоў. Па-другое, пры вызначэнні таго ж права на дапамогу прымаюцца пад увагу даходы як вашы, так і грамадзянскага мужа. Па-трэцяе, для атрымання дапамогі ў памеры 100 % (сёння гэта — 73070 рублёў) неабходна, каб сукупны даход на кожнага члена сям'і ў мінулым годзе не перавышаў 134196 руб., а ў памеры 50 % — 178928 рублёў у месяц (без уліку сукупнага даходу дапамогі прызначаюцца толькі пры наяўнасці дзіця-інваліда ці дзіця, хворага на СНІД, сем'ям вайскоўцаў тэрміновай службы, няпоўным сем'ям, дзе адзіны з бацькоў з'яўляецца інвалідам I ці II групы і не працуе). І нарэшце. Нават калі тры першыя ўмовы выконваюцца, дапамога на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады вам можа быць прызначана зноў-такі толькі як сям'і поўнай — інакш кажучы, без надбаўкі як адзінокай маці. Дарэчы, без надбаўкі павінна выплачвацца і дапамога на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў.

Прычым атрымліваць дапамогу адразу на ўсіх дзяцей магчыма па месцы працы грамадзянскага мужа. Але толькі пры ўмове, што ён працуе ў Беларусі і плаціць узносы на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне. Аднак калі грамадзянскі муж працуе ў Расіі, а вы не працуеце, то права на дапамогу на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады не будзе.

(Працяг на 2-й стар.)

Да суседзяў стане ездзіць прасцей?

Асноўная работа па ўзгадненні праектаў пагадненняў, што прадугледжваюць спрошчаны парадак паездак жыхароў прыгранічных тэрыторый, з літоўскім, латвійскім і польскім бакамі на ўзроўні экспертаў практычна завершана. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе МЗС.

Так, 15—16 чэрвеня адбыліся консульскія кансультацыі з Латвіяй, 20 ліпеня — з Літвой. Яшчэ раней быў узгоднены праект пагаднення з Польшчай.

«Аднак у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства ЕС нашы калегі з Латвіі, Літвы і Польшчы павінны ўзгадніць праекты пагадненняў у Еўрапейскай камісіі, — адзначылі ў знешнепалітычным ведамстве. — Згодна з інфармацыяй нашых партнёраў з гэтых дзяржаў, пасля атрымання станоўчага заключэння з Бруселя будуць завершаны ўнутрыдзяржаўныя працэдуры і пагадненні будуць гатовы да падпісання. Паводле нашых разлікаў, улічваючы перыяд летніх водпускаў у Еўропе, гэта — пытанне некалькіх месяцаў».

БЕЛТА.

Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі — 15 гадоў

Сёння спаўняецца 15 гадоў з дня ўтварэння Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. Гэты орган дзяржкіравання быў сфарміраваны 22 ліпеня 1994 года ўказам кіраўніка дзяржавы № 6.

БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ДЗВЕ ПА 100

Дзве абітурыенткі атрымалі па два 100-бальныя сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання. Пра гэты рэкорд сённяшняй уступнай кампаніі паведаміў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Міністэрства адукацыі Беларусі Мікалай ФЯСЬКОЎ.

Паводле яго слоў, калі раней сярод абітурыентаў вызначаліся ліцэісты і гімназісты Мінска, то ў апошнія гады моцную канкурэнцыю сталічным школьнікам пачалі складаць ліцэісты Магілёва. Абсалютны лідар 2009 года па сертыфікатах тэстаў Кацярына Якубёнак, выпускніца Магілёўскага абласнога ліцэя № 3. Дзяўчына атрымала 100-бальныя сертыфікаты на ЦТ па біялогіі і беларускай мове. Каб дасягнуць максімуму, ёй не хапіла ўсяго двух балаў: на тэсціраванні па хіміі яна атрымала 98 балаў са 100 магчымых.

Яшчэ адна дзяўчына, якая атрымала два 100-бальныя сертыфікаты, выпускніца СШ № 3 Віцебска Дзятлоўская Таццяна. Максімальна магчымую колькасць балаў яна набрала, прайшоўшы ЦТ па беларускай мове і біялогіі. Вынік трэцяга тэста, па хіміі, у гэтай абітурыенткі таксама вельмі высокі — 83 балы.

Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.

ПАД КОЛАМІ МАЗА ЗАГІНУЛА ЖАНЧЫНА

На праспекце Незалежнасці насупраць дома № 195 пад коламі МАЗа загінула жанчына.

Як паведаміў старшы інспектар аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Мінгарвыканкама Юрый Красноў, васьміпалосную праезную частку яна спрабавала перабегчы ў неналежным месцы, там яе і збіў грузавік. Усяго за мінулыя суткі ў сталіцы адбыліся 84 ДТЗ, з іх тры — з пацярпелымі.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

ТАТА «ПРАПІЎ» АЎТАМАБІЛЬ

Бацька траіх дзяцей двойчы быў затрыманы ў нецвярозым стане за рулём уласнай машыны «Нісан Сані».

Першы раз яго пазбавілі права кіравання транспартнымі сродкамі на тры гады і наклалі штраф у памеры 525 тысяч рублёў. У другі раз суд Ленінскага раёна горада Брэста вынес больш суровае пакаранне — штраф у памеры 300 базавых велічыняў спагнаць за кошт аўтамабіля злачынцы. Абвінавачаны ў касацыйным парадку папрасіў зменшыць суму штрафу і не забіраць у яго аўтамабіль. Але судовая калегія па крымінальных справах Брэсцкага абласнога суда пакінула прыгавор без змянення.

— Суд пры вынясенні пакарання ўлічыў раскаянне мужчыны ва ўчыненым, тое, што ён мае траіх няпоўнагадовых дзяцей, станоўчыя характарыстыкі з месца працы і жыхарства, адсутнасць судзімасці, — падкрэслівае **старшы памочнік пракурора Брэсцкай вобласці Вольга ДЗМІТРУК.** — За падобнае злачынства закон прадугледжвае і больш суровыя віды пакарання, у прыватнасці, папраўчыя работы на тэрмін да двух гадоў ці арышт на тэрмін да шасці месяцаў.

Надзея ДРЫЛА.

МАРКА ПРЫСВЕЧАНА АБРАЗУ

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі ўводзіць у абарачэнне паштовую марку «350 гадоў Баркалабаўскаму абразу Божай Маці». Памятнае гашэнне маркі адбудзецца ў Быхаве 24 ліпеня, паведаміла намеснік дырэктара Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна МАРЧАНКА. Мастак Аляксандр Блінцоў.

Выпуск гэтай маркі знамянальны для Магілёўшчыны па некалькіх прычынах. Па-першае, гэта першае ўпамінанне Быхаўскага раёна на паштовай прадукцыі. Па-другое, Баркалабаўскі абраз Божай Маці — першы цудатворны праваслаўны абраз, паказаны на беларускай паштовай марцы.

У рамках святкавання 350-годдзя Баркалабаўскага абраза Божай Маці на тэрыторыі Царквы Святой Тройцы Быхава будзе праводзіцца памятнае гашэнне маркі спецыяльным паштовым штэмпелем на канверце «Першы дзень». Ганаровае права першага спецгашэння даецца епіскапу Бабруйскаму і Быхаўскаму Серафіму. У правядзенні ўрачыстага мерапрыемства прымуць удзел епіскапы Магілёўскі і Мсціслаўскі, Тураўскі, Смаленскі, намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі, прадстаўнікі Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта і інш.

Кар. БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРЭЗІДЭНТ ПАКІСТАНА ЗАБАРАНІЎ АНЕКДОТЫ АБ САБЕ

Пакістанскія спецслужбы атрымалі распараджэнне адсочваць распаўсюджванне анекдотаў пра прэзідэнта краіны Асіфа Алі Зардары ў блогах, а таксама праз SMS і электроннай пошты. З гэтага часу кожны, хто пажартуе пра кіраўніка дзяржавы, можа быць арыштаваны і пасаджаны ў турму на тэрмін аж да 14 гадоў.

НА КІРКОРАВА ЎСЁ Ж ЗАВЯДУЦЬ КРЫМІНАЛЬНУЮ СПРАВУ

Пракурор Казані 22 ліпеня адмяніў пастанову органаў унутраных спраў аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы супраць Філіпа Кіркорава.

Паводле меркавання прадстаўнікоў пракуратуры, праверка, на аснове якой РУУС Казані вынесла рашэнне аб адмове, была павярхоўнай і няпоўнай, а само рашэнне — неабгрунтаваным. Як удакладняе «Камсамольская праўда», пракурор заявіў, што не праведзена неабходнае апытанне сведак і самога Філіпа Кіркорава. Прадстаўнікі РУУС пацвердзілі, што не мелі стасункаў з Кіркоравым, і паабяцалі правесці лінгвістычную экспертызу выказвання, па факце якога на Кіркорава паступіла скарга.

Заяву з просьбай завесці супраць Філіпа Кіркорава крымінальную справу па факце паклёпу і публічнай абразы намесніка дырэктара Татарскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя Мусы Джаліля Юры Ларыёнаў падаў у раённы суд Ваҳіцкага раёна Казані.

Падставай для гэтага сталі словы Кіркорава, вымаўленыя на сцэне тэатра падчас канцэрта 14 сакавіка 2009 года: выканаўца сказаў, што «маленькаму чорнаму татарыну-неўрастэніку патрэбен антракт, каб гандляваць бутэрбродамі».

АРЫШТАВАНЫ ГЕНЕРАЛ НАЗВАЎ ЗАКАЗЧЫКАЎ ЗАБОЙСТВА ЖУРНАЛІСТА ГАНГАДЗЭ

Былы кіраўнік дэпартамента знешняга назірання і крымінальнай разведкі МУС Украіны генерал Аляксей Пукач, затрыманы ў аўторак украінскімі праваахоўнымі органамі, прызнаў сваё дачыненне да забойства вядомага журналіста Георгія Гангадзэ і назваў імёны заказчыкаў гэтага гучнага злачынства, заявіў намеснік кіраўніка Службы бяспекі Украіны Васіль Грыцак.

«Пукач пацвердзіў сваё дачыненне да ўчынення гэтага злачынства. Ён таксама пацвердзіў дачыненне асобных службовых асобаў, будзе шмат цікавай інфармацыі», — сказаў Грыцак на брыфінгу ў Кіеве ў сераду. Адказваючы на пытанне журналістаў, ці назваў Пукач заказчыкаў гэтага злачынства, Грыцак сказаў: «Так».

Заказчыкі забойства Гангадзэ дагэтуль заставаліся невядомыя. Калі цяпер іх выдасць генерал Пукач, Украіне пагражае новы скандал. Ніткі забойства ў 2000 годзе вядуць у вышэйшыя эшалоны ўлады, а некаторыя прадстаўнікі ранейшай палітычнай эліты дагэтуль займаюць высокія пасады ў краіне.

СЛУХАЙЦЕ АГЛЯДЫ МАТЭРЫЯЛАЎ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»:

Радыё РМ 92,4 FM (Мінск) — на Радыё-Мінск з аўторка па пятніцу ў ранішняй праграме «КАВА ПА-ВЕНСКУ» (Мінск – 92.4 FM, Віцебск – 106.4 FM, Магілёў – 98.1 FM, Гомель – 105.6 FM)

Радыё Рокс — на Радыё-Рокс з аўторка па пятніцу РАНІЦАЙ У 7.40, УВЕЧАРЫ Ў 22.30 (Мінск – 102.1 FM, Віцебск – 103.0 FM, Гродна – 106.9 FM, Брэст – 101.2 FM, Гомель – 102.6 FM, Магілёў – 103.4 FM)

Беларускае радыё — на Радыё-Культура з аўторка па пятніцу ў ранішняй праграме «У РЫТМЕ ДНЯ» (Мінск – 102.9 FM, Віцебск – 99.3 FM, Гродна – 95.0 FM, Брэст – 88.5 FM, Магілёў – 99.1 FM, Гомель – 91.53 FM)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.07.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 821,00
▼ 1 еўра	3 999,90
1 латвійскі лат	5 702,45
1 літоўскі літ	1 158,71
1 чэшская крона	155,06
1 польскі злоты	937,27
▲ 1 расійскі рубель	90,77
1 украінская грыўня	356,86

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,0785
10 UAH	40,3617
1000 BYR	11,0090
EUR	44,1159

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

По поручению ОАО «Экран», КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже комплекса зданий, сооружений и оборудования, расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167, в составе:

1) Насосная станция оборотного водоснабжения – сооружение 31, об. пл. 399 кв.м; **2)** Корпус 12 – гараж, об. пл. 2336 кв.м; **3)** Хлораторная, об. пл. 62,2 кв.м; **4)** Эстакада для мойки машин ж/б; **5)** Устройство ограждения промплощадок (протяж. 402 м); **6)** Автодороги внутриплощадочные; **7)** Тепловые сети; **8)** Сети водопровода; **9)** Канализационные сети; **10)** Ливневая канализация предприятия; **11)** Внешнее электроснабжение; **12)** Подстанция КТП-1388; **13)** Конденсаторная установка (2 ед.); **14)** Кран-балка ЭП-2 (3 ед.). *Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 772 226 538 белорусских рублей.* Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009 г. Аукцион состоится **30.07.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.07.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел. (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

ПЯЦЬ ФІРМЕННЫХ МАГАЗІНАЎ АДКРЫТЫЯ Ў МІНСКУ

У Мінску прадаўжаецца развіццё фірменнага гандлю, фарміруецца сетка сучасных фірменных магазінаў. Аб гэтым паведаміла начальнік управлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ларыса КАМАРОВА.

На статус «фірменны магазін» атэставаны 9 гандлёвых арганізацый, адкрыты 5 магазінаў гандлёвай плошчай 315 кв.м. Гэта магазіны ААТ «Галантэя», Гомельскага ВА «Крышталь» філіяла «Завод Ювелір», ЗАТ «Вітэкс», ААТ «Алеся», РУП «Віцебскі лікёра-гарэлачны завод» магазін «Прыдзвінне». Цяпер у Мінску функцыянуюць 160 фірменных магазінаў гандлёвай плошчай 25,2 тыс. кв.м, з іх 75 харчовых і 85 нехарчовых.

БЕЛТА.

Абзац

◢ Культурна-дзелавы цэнтр «Дом Масквы» адчыніцца ў Мінску 24 чэрвеня. Для ўдзелу ва ўрачыстай цырымоніі ў беларускую сталіцу прыбудзе дэлегацыя на чале з мэрам Юрыем Лужковым. Дом Масквы пабудаваны на вуліцы Камуністычнай з выкарыстаннем беларускіх будматэрыялаў за кошт маскоўскага бюджэту. Агульны аб'ём інвестыцый склаў 536 млн расійскіх рублёў.

◢ **Адпускная цана на прыродны газ для запраўкі транспартных сродкаў павялічыцца ў Беларусі з 23 ліпеня на 24,6 % да Br 1065 за 1 куб.м. Адпаведнае рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове міністэрства эканомікі.**

◢ Пракуратура Мінскай вобласці завяла крымінальную справу па факце надзвычайнага здарэння на мясакамбінаце ў Слуцку па артыкуле аб парушэнні правілаў аховы працы.

◢ **Суд Цэнтральнага раёна Мінска прыгаварыў да шасці з паловай гадоў пазбаўлення волі былога дырэктара ААТ «Жлобінскі рамонтна-механічны завод» за атрыманне хабару. Хабар у памеры 10 тыс. долараў кіраўнік атрымаў за заключэнне дамовы на пастаўку вугляроднай сталі для арміравання жалезабетонных канструкцый. Памер хабару складае 15 % ад кошту здзелкі. Дырэктар затрыманы пасля атрымання грошай у сваім кабінеце. Ён прысуджаны да канфіскацыі маёмасці, адбываць пакаранне будзе ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Крымінальную справу расследавала Генеральная пракуратура Беларусі.**

◢ Прынята рашэнне аб будаўніцтве ў найбліжэйшы час некалькіх гіпермаркетаў за Мінскай кальцавой аўтадарогай. Частка з іх будзе спецыялізавацца на продажы будматэрыялаў. У год у сталіцы адчыняецца ў сярэднім не менш за 120 гандлёвых аб'ектаў.

◢ **Суд Мінскай вобласці прыгаварыў забойцаў двух супрацоўнікаў СВК «Бальшавік-Агра» Салігорскага раёна Мінскай вобласці да смяротнага пакарання і пажыццёвага зняволення. Яшчэ аднаму абвінавачванаму па гэтай справе суд прызначыў пакаранне ў выглядзе 13 гадоў пазбаўлення волі, ён прызнаны вінаватым у саўдзельніцтве забойству. Прыгавор яшчэ не ўвайшоў у законную сілу. Як раней паведамлялася, забойства галоўнага эканаміста (жанчыны) і вадзіцеля СВК «Бальшавік-Агра» (мужчыны) адбылося ў Салігорскім раёне ў канцы лютага гэтага года. Іх трупы з агнястрэльнымі раненнямі былі знойдзены ў кювеце побач з аўтамабілем, у іх было выкрадзена больш як Br60 млн — зарплата супрацоўнікаў прадпрыемства. Сёлета гэта другі смяротны прысуд у Беларусі.**

Поўны абзац

◢ Самы стары ў Вялікабрытаніі працуючы тэлевізар знойдзены ў лонданскай кватэры электратэхніка Джэфры Барынскі, які калекцыянуе старыя тэлевізары і радыёпрыёмнікі. Ён набыў тэлевізар 1936 года выпуску з экранам 12 дзюймаў (30 см) дзесяць гадоў таму ў іншага калекцыянера. Адзіная нязручнасць — у тэлевізары немагчыма пераключаць каналы, таму што тады, калі ствараўся тэлевізар, у краіне існаваў толькі адзін канал.

◢ **54-гадовая жыхарка амерыканскага штата Фларыда прыгавораная судом да трох гадоў пазбаўлення волі ўмоўна і 14-месячнага хатняга арышту. Яна прыехала на сваім аўтамабілі да казіно і вырашыла зазірнуць туды «на хвілінку». Дваіх сваіх унукаў — 2-гадовую дзяўчынку і 14-гадовага хлопчыка — яна пакінула ў салоне, сказаўшы, каб тыя яе чакалі. У выніку бабуля правяла за рулеткай больш за гадзіну. Гульню амерыканкі парушылі ахоўнікі, якія вывалаклі яе на вуліцу. Як выявілася, мінакі, якія ўбачылі ў салоне кінутых дзяцей, выклікалі паліцыю. Ідучы гуляць, бабуля апусціла ў салоне шкло вокнаў, але не ўключыла кандыцыянер. Гарачыня, якая стаяла на той час, магла моцна пашкодзіць дзецям. Вядомыя выпадкі, калі забытыя ў салоне дзеці задыхаліся і паміралі.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Прамая лінія

ДАПАМОГА АД «ПРАПІСКІ» НЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наконт дадатковай матэрыяльнай падтрымкі варта заўважыць: калі даходы сям'і нізкія, можна звярнуцца па дапамогу ў тое ж раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне або ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Што ж да пытання аб аплаце за харчаванне ў школе, то пашукаць адказ на яго лепш у раённым аддзеле адукацыі ці ў Міністэрстве адукацыі.

☎ ***— Мой 5-гадовы сын часта хварэе, таму я хачу звольніцца з працы і даглядаць яго. Ці будзе час такога догляду залічвацца ў стаж? І ці змагу я разлічваць на дапамогу ці якую-небудзь іншую матэрыяльную падтрымку?***

Марына Пятроўна, *г. Мінск*

— Паводле артыкула 185 Працоўнага кодэкса, сацыяльны водпуск даецца толькі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Пры гэтым заканадаўства не прадугледжвае сацыяльных водпускаў па доглядзе дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады, адпаведна, такі догляд у пенсійны стаж не залічваецца. Што да матэрыяльнай падтрымкі, то пры ўмове нізкіх даходаў вы можаце звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Аднак трэба мець на ўвазе: калі вы кінеце працу, то права на дзіцячую дапамогу вы ўзросце больш за 3 гады не будзе.

☎ ***— Адкажыце, калі ласка, на такое пытанне: ці можна атрымаць дапамогу за мінулы час, калі неабходныя дакументы былі пададзены пасля дасягнення дзіцем 7-месячнага ўзросту?***

Святлана Анатольеўна БАРОДЗІЧ, *г. Мінск*

— Тут два варыянты. Паводле заканадаўства, па дапамогу на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў неабходна звярнуцца на працягу 6 месяцаў з даты ўзнікнення такога права. Прычым для непрацуючых жанчын права ўзнікае з дня нараджэння дзіцяці, а вось для жанчын працуючых — з дня заканчэння «бальнічнага» па цяжарнасці і родах.

☎ ***— Мая дачка, якая з'яўляецца інвалідам III групы, пражывае ў працоўным інтэрнаце. Нядаўна дачка нарадзіла дзіця і выхоўвае яго адна. Аднак прапісваць дзіця ў інтэрнаце адмаўляюцца. Як быць?***

Мікалай Адамавіч ХАМІЦЭВІЧ, *Салігорскі раён*

— Гэта складанае пытанне — мяркуючы па ўсім, тут трэба звяртацца ў райвыканкам або ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Разам з тым варта заўважыць: атрымліваць дапамогу па доглядзе магчыма і без прапіскі дзіцяці. Дапамога будзе прызначана пры ўмове падачы даведкі ўчастковага педыятра аб тым, што дзіця назіраецца па фактычным месцы жыхарства маці. Але галоўнае тут — не прапусціць той жа 6-месячны тэрмін звароту.

☎ ***— У мяне трое дзяцей, адзін з іх — інвалід. Да апошняга часу мы пражывалі ў працоўным інтэрнаце, прычым дзеці — без прапіскі. Аднак цяпер у сувязі з заканчэннем тэрміну кантракта нас папрасілі выселіцца, а потым, у якасці выключэння, дазволілі часова зарэгістравацца ў стрыечнай сястры на год. Якім чынам мы можам вырашыць «жыллёвае пытанне»?***

Валянціна Генрыхаўна НЕВЯДОМСКАЯ

— Сітуацыя з часовай рэгістрацыяй сапраўды вельмі няпростая. Тут, Валянціна Генрыхаўна, мы раім зноў-такі звярнуцца ў райвыканкам або ў аблвыканкам — магчыма, там знойдуць якое-небудзь рашэнне з улікам статусу вашай сям'і як шматдзетнай.

☎ ***— У свой час мяне скарацілі, але пакінулі на «ложка-месцы» ў інтэрнаце прадпрыемства. Хутка я павінна нарадзіць. Ці можна ў сувязі з гэтым разлічваць на асобны пакой?***

Валянціна Іванаўна, *г. Мінск*

— Неяк уплываць на прадпрыемства, якое з'яўляецца ўласнікам інтэрната, праблематычна. Тым не менш паспрабуйце таксама звярнуцца ў адміністрацыю раёна — трэба спадзявацца, гэта дапаможа вырашыць пытанне.

☎ ***— Непакоіць з Мінска, а цікавіць наступнае: калі і ў якія тэрміны бацькі павінны падаваць даведкі аб тым, што дзіця не афармленае ў дзіцячы садок? І што будзе, калі такія даведкі не падаюцца своечасова?***

— Даведкі аб афармленні ці неафармленні неабходна падаваць тады, калі дзіцяці спаўняецца паўтара, два і два з паловай гады. Пры гэтым пры афармленні ў садок памер дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў складае толькі 50 %. І зноў-такі ў памеры 50 % дапамога пачынае выплачвацца тады, калі даведкі аб неафармленні бяруцца несвоечасова — больш чым праз месяц пасля ўзгаданага ўзросту.

100-працэнтная выплата аднаўляецца, калі бацькі ўсё ж прыносяць даведку. Пры гэтым у выпадку неафармлення бацькі могуць вярнуць грошы за час 50-працэнтнай «недаплаты». Аднак такое вяртанне магчыма не больш чым за 6 месяцаў.

☎ ***— Турбуе індывідуальная прадпрымальніца, хачу пацікавіцца: дзе я павінна атрымліваць дапамогу па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў? Магчыма, па месцы працы мужа?***

— У поўнай сям'і маці, якая з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам (або прыватным натарыусам, членам фермерскай гаспадаркі, рамеснікам, творчым работнікам ці асобай, што выконвае работы паводле грамадзянска-прававога дагавора), павінна атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў праз органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароны па месцы жыхарства. Дарэчы, зноў-такі ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне варта звяртацца па дапамогу і ў выпадках, калі індывідуальнымі прадпрымальнікамі з'яўляюцца абодва бацькі; калі бацька ІП, а маці не працуе; калі адзіны з бацькоў у няпоўнай сям'і — зноў жа ІП.

Аднак варта заўважыць: у сітуацыі, калі жанчына знаходзіцца ў працоўных адносінах і адначасова з'яўляецца індывідуальнай прадпрымальніцай, дапамога выплачваецца толькі па месцы працы маці — незалежна ад таго, дзе працуе бацька.

☎ ***— Некалькі месяцаў дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў выплачвалася па месцы навучання маці ва ўніверсітэце. Аднак у чэрвені маці ўніверсітэт скончыла. Дзе павінны рабіцца выплаты цяпер — па месцы працы мужа? І якія тут могуць спатрэбіцца дакументы?***

— Паводле заканадаўства, прызначэнне і выплата дзяржаўных дапамог на дзяцей робіцца па месцы працы, службы або дзённага навучання маці. А калі маці не працуе і не вучыцца — па месцы працы, службы ці навучання бацькі, усынаўляльніка, апекуна або іншай асобы, якая здзяйсняе догляд. Пры гэтым непрацуючым бацькам, а таксама маці-індывідуальнай прадпрымальніцы ў поўнай сям'і дапамога выплачваецца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Для прызначэння дапамогі па месцы працы бацькі неабходна валодаць звесткамі аб тым, што маці не працуе і не з'яўляецца індывідуальнай прадпрымальніцай. Як правіла, адсутнасць працы пацвярджаецца копіяй працоўнай кніжкі. Аднак калі маці дагэтуль навучалася і працоўнай кніжкі не мае, адсутнасць знаходжання ў працоўных адносінах указваецца ў заяве. І адначасова падаецца пацвярджальны дакумент, што маці не зарэгістраваная ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка.

Апроч таго, для прызначэння дапамогі па месцы працы бацькі неабходна таксама падаць копію пасведчання аб нараджэнні дзіцяці, даведку з месца жыхарства аб складзе сям'і або копіі асабістага рахунка, даведку аб перыядзе, за які выплачвалася дапамога з універсітэта і даведку аб тым, што дзіця аформленае або не аформленае ў садок — у выпадку, калі дзіцяці споўнілася паўтара, два або два з паловай гады.

☎ ***— Мая дачка нарадзіла ў 16-гадовым узросце. Штомесячную дапамогу ёй прызначылі, а вось дародавыя і пасляродавыя выплаты — не. Чаму? Прычым сітуацыя паўтараецца зноў — дачка нарадзіла другое дзіця. Якія выплаты ёй павінны рабіцца?***

Ірына Чаславаўна, *Смаргонскі раён*

— Варта заўважыць, што працуючым маці выплата дзяржаўнай дапамогі па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў пачынаецца з 2-месячнага ўзросту немаўля — дагэтуль, на два месяцы да і на два месяцы пасля нараджэння выдаецца лісток непрацаздольнасці па цяжарнасці і родах і выплачваецца дапамога зыходзячы з сярэдняй зарплаты.

Іншая гаворка аб жанчынах непрацуючых. У заканадаўстве вызначаныя асобныя правілы для беспрацоўных, студэнтак, навучэнак сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў. Дапамога па цяжарнасці і родах такім маці прызначаецца, аднак, у сувязі з адсутнасцю заробку, у памеры стыпендыі або ў мінімальным памеры — 50 % бюджэту пражыткоўка мінімуму. Пры гэтым выплата такой дапамогі таксама робіцца 4 месяцы (два месяцы да і два месяцы пасля нараджэння), а з 2-месячнага ўзросту на немаўля зноў-такі пачынае налічвацца дапамога па доглядзе дзяцей да 3 гадоў.

Іншыя непрацуючыя маці права на дапамогу па цяжарнасці і родах не маюць. Аднак выплата дапамогі па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў такім маці пачынаецца без 2-месячнай «адтэрміноўкі» — адразу ж пасля нараджэння. Пры гэтым дзякуючы апошняй акалічнасці, у выніку «страты» тут атрымліваюцца параўнальна нязначныя. У прыватнасці, давайце падлічым. 4 месяцы мінімальнай дапамогі па цяжарнасці і родах беспрацоўным, непрацуючым студэнткам і навучэнкам — гэта 487 140, а 2 месяцы выплаты дапамогі на догляд для астатніх непрацуючых маці — гэта 389 720 рублёў.

Між тым, трэба дадаць. Калі дачка нарадзіла другое дзіця, то яна, апроч штомесячнай дапамогі, павінна атрымаць аднаразовую дапамогу ў сувязі з нараджэннем у памеры 7 бюджэтаў пражыткоўка мінімуму. А калі да таго ж дачка стала на ўлік у жаночай кансультацыі да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, яна мае права на яшчэ адну аднаразовую дапамогу — у памеры 1 БПМ.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.
Фота аўтара.

(Заканчэнне будзе).

Архіў КДБ

Новы спіс загінулых ваеннапалонных

Апублікаванне новых спісаў загінулых салдат дазволіць іх блізкім даведацца, дзе тыя былі пахаваны.

Камітэт дзяржаўнай бяспекі на сваім інтэрнэт-сайце (www.kgb.by), а таксама на інтэрнэт-сайтах абласных выканаўчых камітэтаў і Мінгарвыканкама публікуе новыя спісы савецкіх ваеннапалонных — ураджэнцаў Беларусі, якія загінулі ў фашысцкім палоне.

У Цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ нагадалі, што работа над праектам пачалася яшчэ ў 2002 годзе, пасля падпісання дагавора паміж Камітэтам дзяржбяспекі і Аб'яднаннем «Саксонскія мемарыялы» аб сумесным вывучэнні архіўных дакументаў часоў Другой сусветнай вайны. У выніку разам з Міністэрствам абароны і ФСБ Расійскай Федэрацыі, а таксама Службай бяспекі Украіны КДБ стаў удзельнікам міжнароднага доследнага праекта, які падтрымліваецца федэральным урадам Германіі, па вызначэнні лёсаў ваеннапалонных і месцаў іх пахавання.

На сёння супрацоўнікі Цэнтральнага архіва КДБ апрацавалі звыш 20 тысяч трафейных нямецкіх картак больш як на 12 тысяч ваеннапалонных — ураджэнцаў Беларусі. Сумесная работа беларускіх і нямецкіх архівістаў і даследчыкаў дазволіла выдаць даведнік «Лагеры савецкіх ваеннапалонных у Беларусі. 1941—1944», зборнік артыкулаў «Савецкія і нямецкія ваеннапалонныя ў гады Другой сусветнай вайны», перавыдаць Кнігу Памяці савецкіх ваеннапалонных, якія загінулі ў лагеры Хамельбург у Баварыі, апублікаваць Кнігу Памяці савецкіх ваеннапалонных, якія загінулі ў лагеры Цайтхайн у Саксоніі.

Падчас рэалізацыі праекта беларускім і нямецкім даследчыкам удалося вызначыць месцы гібелі і пахавання звыш 200 вайскоўцаў — ураджэнцаў Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Звесткі аб даце смерці савецкіх воінаў, месцах іх пахавання, а таксама копіі архіўных дакументаў былі перададзены сваякам.

Калі ў вышэйзгаданых спісах вы сустрэнеце імёны сваіх блізкіх, па дадатковую інфармацыю звяртайцеся, калі ласка, у Цэнтральны архіў КДБ Беларусі па нумарах: 219 98 89, 219 97 59.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БЕЛТА.

Нязменнай увагай наведвальнікаў мінскага заапарку карыстаюцца дзіцяняты звычайнай насухі, што нядаўна нарадзіліся. Гэта вельмі мілыя, забаўныя звяркі, радзімай якіх з'яўляецца Паўднёвая Амерыка. Малых двое, і яны добра адчуваюць сябе ў нашых умераных шыротах. Яшчэ ў заапарк з Масквы прывезлі некалькі чырвоных ваўкоў, якія па знешнім выглядзе нагадваюць адначасова ваўка, лісу і шакала. Гэта вельмі рэдкі від, які знаходзіцца пад пагрозай знікнення.

Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

АБ ЗАБЕСПЯЧЭННІ РОЎНЫХ ПРАВОЎ ГРАМАДЗЯН У СФЕРЫ ПРАЦЫ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ісоткі У.П., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Чыгрынава С.П.

на падставе часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў

у парадку рэалізацыі права на ўнясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапаноў аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (або) дапаўненняў разгледзеў у судовым пасяджэнні зварот, у якім паведамляецца аб фактах ключэння найменькімі ў аб'явы аб свабодных рабочых месцах (вакансіях) умоў адносна ўзросту і полу работніка, якія, па меркаванню заяўніка, маюць дыскрымінацыйны характар.

Прааналізаваўшы адпаведныя палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, міжнародна-прававых актаў, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь, Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ПК), Закона Рэспублікі Беларусь «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

Забеспячэнне правоў і свабод грамадзян абвешчана вышэйшай мэтай дзяржавы (частка першая артыкула 21 Канстытуцыі). Замацаванае ў Асноўным Законе палажэнне аб прадастаўленні ўсім роўных правоў для ажыццяўлення любой дзейнасці, акрамя забароненай законам (частка другая артыкула 13), прадугледжвае недапушчэнне дыскрымінацыі грамадзян ва ўсіх галінах жыцця, у тым ліку ў сферы працы.

Канстытуцыя гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на працу як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека, гэта значыць права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэбнасцей (частка першая артыкула 41).

Згодна з часткай першай артыкула 8 Канстытуцыі Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства.

Важнейшымі міжнародна-прававымі дакументамі ў сферы працы з'яўляюцца Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, а таксама Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека абвяшчае, што кожны чалавек мае права на працу, на свабоду выбару работы; кожны чалавек, без якой-небудзь дыскрымінацыі, мае права на роўную аплату за роўную працу (артыкул 23). У Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах устаноўлена, што дзяржавы, якія ў ім удзельнічаюць, прызнаюць у ліку іншых права на працу, што ўключае права кожнага чалавека на атрыманне магчымасці зарабляць сабе на жыццё працай, якую ён свабодна выбірае або на якую ён свабодна згаджаецца (артыкул 6).

Змест агульнапрызнаных правоў чалавека ў сферы працы раскрываецца ў канвенцыях і рэкамендацыях Міжнароднай арганізацыі працы (далей — МАП). Так, згодна з пунктам 1 артыкула 1 Канвенцыі МАП № 111 адносна дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў ад 25 чэрвеня 1958 года (далей — Канвенцыя № 111), тэрмін «дыскрымінацыя» уключае:

а) усякае адрозненне, выключэнне або перавагу, заснаваныя на прыметах расы, колеру скуры, полу, рэлігіі, палітычных перакананняў, нацыянальнай прыналежнасці або сацыяльнага паходжання і маюць сваім вынікам ліквідацыю або парушэнне роўнасці магчымасцей або звароты ў галіне працы і заняткаў;

б) усякае іншае адрозненне, выключэнне або перавагу, якія маюць сваім вынікам ліквідацыю або парушэнне роўнасці магчымасцей або звароты ў галіне працы і заняткаў, як яны могуць быць вызначаны дзяржавай — членам МАП па кансультацыі з прадстаўнічымі арганізацыямі прадпрымальнікаў і працоўных, дзе такія існуюць, і з іншымі адпаведнымі органамі.

Пры гэтым не лічацца дыскрымінацыяй усякае адрозненне, выключэнне або перавага, заснаваныя на спецыфічных патрабаваннях, звязаных з пэўнай работай (пункт 2 артыкула 1 Канвенцыі № 111).

Тэрміны «праца» і «заняткі» уключаюць доступ да прафесійнага навучання, доступ да працы і да розных заняткаў, а таксама ўмовы працы (пункт 3 артыкула 1 Канвенцыі № 111), гэта значыць забарона дыскрымінацыі дзейнічае ў адносінах не толькі работнікаў, але і іншых асоб, якія жадаюць працаўладкавацца.

Праведзены Канстытуцыйным Судом прававы аналіз Канвенцыі № 111 сведчыць аб тым, што ў ёй не вызначаюцца ўсе дыскрымінацыйныя акалічнасці, паколькі дапускаецца наяўнасць акалічнасцей, якія могуць быць прызнаны ў якасці такіх на нацыянальным узроўні.

У Рэспубліцы Беларусь гарантыі забеспячэння канстытуцыйнага права грамадзян на працу, а таксама прынцып роўнасці пры рэалізацыі гэтага права замацаваны ў заканадаўстве аб працы.

У адпаведнасці з часткай першай артыкула 14 ПК дыскрымінацыя, гэта значыць абмежаванне ў працоўных правах або атрыманне якіх-небудзь пераваг у залежнасці ад полу, расы, нацыянальнага паходжання, мовы, рэлігійных або палітычных перакананняў, удзелу або неўдзелу ў прафсаюзах або іншых грамадскіх аб'яднаннях, маёмаснага або службовага становішча, недахопаў фізічнага або псіхічнага характару, якія не перашкаджаюць выкананню адпаведных працоўных абавязкаў, забараняецца.

Аналагічныя патрабаванні адносна дыскрымінацыйных акалічнасцей прадугледжаны ў абзацы другім часткі другой артыкула 10 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», што вызначае дзяржаўную палітыку і гарантыі дзяржавы ў галіне садзейнічання занятасці насельніцтва.

Згодна з часткай трэцяй артыкула 14 ПК не лічацца дыскрымінацыяй любыя адрозненні, выключэнні, перавагі і абмежаванні, заснаваныя на ўласцівых дадзенай рабоце патрабаваннях, а таксама абумоўленыя неабходнасцю асаблівага клопату дзяржавы аб асобах, якія маюць патрэбу ў павышанай сацыяльнай і прававой абароне (жанчыны, непаўналетнія, інваліды, асобы, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, і інш.).

Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, усе іншыя акалічнасці, што прыводзяць да адрозненняў, выключэнняў, пераваг і абмежаванняў, не звязаныя з дзелавымі якасцямі і не абумоўленыя спецыфікай працоўнай функцыі ці статусам работніка, могуць разглядацца як дыскрымінацыйныя. Разам з тым частка першая артыкула 14 ПК і абзац другі часткі другой артыкула 10 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» змяшчаюць вычарпальны пералік акалічнасцей, якія заканадавец адносіць да дыскрымінацыйных у сферы працы.

У адпаведнасці з Законам «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» дзяржаўная служба занятасці насельніцтва садзейнічае грамадзянам у пошуку падыходзячай работы, а наймальнікам — у падборы неабходных работнікаў (частка другая артыкула 13). Пры працаўладкаванні наймальнікамі часта выкарыстоўваюцца і публічныя формы прапанавання работы. Рознымі спосабамі (шляхам размяшчэння аб'яў у сродках масавай інфармацыі, на рэкламных шчытах і інш.) наймальнікі інфармуюць аб наяўных у іх вакансіях. Зацікаўленыя ў вопытных кваліфікаваных работніках, якія валодаюць прафесійнымі ведамі і практычнымі навыкамі, здольны граматна арганізоўваць работу і выконваць даручаныя заданні, наймальнікі нярэдка ўключаюць у свае прапановы, адрасаваныя нявызначанаму колу асоб, якія жадаюць працаўладкавацца, патрабаванні, што датычацца полу, узросту, месца жыхарства і іншых акалічнасцей. Указаныя патрабаванні ў шэрагу выпадкаў выключаюць для некаторых асоб магчымасць заключэння працоўнага дагавора.

Патрабаванні да ўзросту, пасля дасягнення якога дапускаюцца ўступленне ў працоўныя праваадносіны і іх спыненне, устаноўлены Канстытуцыяй, ПК і іншымі законамі.

У адпаведнасці з заканадаўствам заключэнне працоўнага дагавора дапускаецца, як правіла, з 16 гадоў. З пісьмовай згоды аднаго з бацькоў (усынавіцеляў, папячыцеляў) працоўны дагавор можа быць заключаны з асобай, якая дасягнула 14 гадоў (артыкул 21, часткі першая і другая артыкула 272 ПК). Права на паступленне на дзяржаўную службу маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту (пункт 1 артыкула 24 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь»).

У заканадаўстве не змяшчаецца агульнага патрабавання аб неабходнасці абавязковага спынення працоўных праваадносін у сувязі з дасягненнем работнікам пэўнага ўзросту. Асобныя выключэнні датычацца, напрыклад, дзяржаўных служачых, для якіх гранічны ўзрост прабывання на дзяржаўнай службе складае 65 гадоў (пункт 1 артыкула 41 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь»), для членаў Канстытуцыйнага Суда — 70 гадоў (частка трэцяя артыкула 116 Канстытуцыі).

Абмежаванні, звязаныя з узростам, могуць быць устаноўлены заканадаўствам таксама ў сілу спецыфікі працоўнай функцыі.

Такім чынам, заканадавец суадносіць магчымасць устанаўлення працоўных адносін і іх спынення з дасягненнем асобай пэўнага ўзросту толькі ў выпадках, калі выкарыстанне ўзроставага крытэрыю абумоўлена спецыфікай працоўнай функцыі ці асобым статусам работніка.

Канстытуцыйны Суд мяркуе, што ўстанаўленне на практыцы найменькімі пры вырашэнні пытанняў працаўладкавання іншых, не прадугледжаных заканадаўствам, абмежаванняў па ўзросту з'яўляецца неправамерным.

У артыкуле 30 Канстытуцыі замацавана права грамадзян Рэспублікі Беларусь свабодна перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь. Дадзеная норма карэспандуе іншым канстытуцыйным палажэнням, што гарантуюць рэалізацыю грамадзянамі права на свабодны выбар работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэбнасцей. Такім чынам, такая акалічнасць, як месца жыхарства, што ўстанаўліваецца найменькім у якасці абавязковага патрабавання пры прыёме на работу, таксама не можа служыць падставай для адмовы ў заключэнні працоўнага дагавора, паколькі не ўлічвае прадугледжанае Канстытуцыяй права грамадзян на свабоду перамяшчэння і абмежаўвае магчымасці рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян на працу.

Адсутнасць у частцы першай артыкула 14 ПК і абзацы другім часткі другой артыкула 10 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» указанняў на ўзрост і месца жыхарства на практыцы можа прывесці да таго, што дадзеныя акалічнасці будуць разглядацца як дыскрымінацыйныя, тым больш, што ў артыкуле 21 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» не змяшчаецца палажэнне аб забароне ўстанаўлення найменькім дыскрымінацыйных акалічнасцей у прапановах рабочых месцах (вакансіях).

Згодна з артыкулам 18 Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы да сумеснага вядзення Саюзнай дзяржавы і дзяржаў-удзельніц адносіцца ў тым ліку забеспячэнне роўных правоў грамадзян у пытаннях працаўладкавання. Канцэпцыяй сацыяльнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2005 года, зацверджанай Пастановай Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы ад 20 студзеня 2003 г. № 3, дзеянне якой прадоўжана да 2010 года, у якасці аднаго з асноўных напрамкаў і прыярытэтаў развіцця Саюзнай дзяржавы ў сацыяльна-працоўнай сферы вызначана фарміраванне агульнага рынку працы.

Пры параўнанні нарматыўнага замацавання забароны дыскрымінацыі ў сферы працы ў нашай дзяржаве і Расійскай Федэрацыі відавочна наяўнасць адрозненняў, сутнасць якіх заключаецца ў непаўнаце рэгламентацыі гэтага пытання ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь. Акрамя дыскрымінацыйных акалічнасцей, прадугледжаных у пункце 1 артыкула 1 Канвенцыі № 111, што знайшлі адлюстраванне ў частцы першай артыкула 14 ПК, у Працоўным кодэксе Расійскай Федэрацыі змяшчаюцца ўказанні на ўзрост, месца жыхарства і іншыя акалічнасці (артыкулы 3, 64), адмова ў прыёме на работу па якіх таксама з'яўляецца недапушчальнай. Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, адзначанае адрозненне ў прававым рэгуляванні падобных адносін не забяспечвае роўнасці правоў пры працаўладкаванні ў межах Саюзнай дзяржавы.

Уключэнне найменькімі ў прапановы аб свабодных рабочых месцах (вакансіях) патрабаванняў, якія датычацца ўзросту, месца жыхарства, іншых акалічнасцей, якія могуць быць прызнаны ў якасці дыскрымінацыйных, стварае перадумовы для парушэння замацаваных у Канстытуцыі правоў і свабод грамадзян: права грамадзян на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэбнасцей (частка першая артыкула 41); права жанчын на роўныя з мужчынамі магчымасці ў працы і прасоўванні па службе (частка пятая артыкула 32); свабоды перамяшчэння і выбару месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь (артыкул 30).

З улікам палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынцыпаў і норм міжнародна-прававых актаў, выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу норм артыкула 14 ПК, артыкулаў 10 і 21 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», выходзячы з прадугледжаных Асноўным Законам гарантый забеспячэння права на працу як найбольш годнага спосабу самасцвярджэння чалавека і неабходнасці дасягнення паўнаты прававога рэгулявання адносін у сферы працы, Канстытуцыйны Суд лічыць, што адсутнасць ва ўстаноўленым у заканадаўстве аб працы пераліку дыскрымінацыйных акалічнасцей указанняў на такія акалічнасці, як ўзрост і месца жыхарства, а таксама вычарпальны характар дадзенага пераліку значна абмяжоўваюць гарантыі рэалізацыі канстытуцыйнага права на працу.

На падставе выкладзенага, кіруючыся часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкуламі 22, 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд

ВЫРАШЫЎ:

1. Прызнаць неабходным у мэтах забеспячэння гарантый ажыццяўлення канстытуцыйнага права грамадзян на працу, паўнаты

ШКОЛА Ў ВЕРАСНІЦЫ — ДА 1 ВЕРАСНЯ

Бацькі на сходзе ў вёсцы Верасніца Жыткавіцкага раёна.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зразумела, калі праводзіцца выязная планёрка з заказчыкамі і падрадчыкамі, усе будуць працаваць. Вялікай колькасці рабочых не бачна, але ж Валерый Іосіфавіч тлумачыць, што сёння тут роўна столькі, колькі патрэбна. На другім паверсе школы машына шліфуе драўляную падлогу, і мне, неспецыялісту, зразумела, што да апрацоўчых работ зусім недалёка.

На сход прыходзяць бацькі — здаецца, амаль усе з тых, хто паставіў свой подпіс пад лістом у рэдакцыю. Размову з людзьмі ў зале пачынае **начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Марына БОНДАР**.

— Па вашым звароце мы прыязджалі сюды не раз. Неабходнасць умацавання канструкцый была пацверджана лабараторыяй БелДУТа. Драўляныя канструкцыі згнілі, і нам давялося амаль поўнасцю перабудоўваць школу. Рашэнне было прынята, у школе займацца было нельга, спецыялісты пацвердзілі, што школа на той момант знаходзілася ў чацвёртай ступені аварыйнасці. Мы замовілі праект і цяпер да завяршэння падыходзіць сур'ёзная рэканструкцыя. Школа ў Верасніцы знаходзіцца на пастаянным кантролі. Ніколі размова нават не ішла аб тым, каб тут прыпыніліся работы або фінансаванне. Летась было накіравана на Верасніцу 1,5 мільярда рублёў.

Што датычыцца фінансавання ўвогуле, як расказала мне **намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Таццяна АТРОХАВА**, каштарысная вартасць першага пускавога комплексу складае больш за 3,5 мільярда рублёў. Грошы прыцягваюцца з розных крыніц: з раённага бюджэту, з абласнога. 360 мільёнаў рублёў, якія сёлета зарабілі жыхары Гомельшчыны на рэспубліканскім суботніку, — таксама ўклад у скарбонку Верасніцкай школы. Сёлета размова ідзе аб пуску першай чаргі — капітальна адрамантаванага будынка разам з харчблокам. Спартыўная зала застаецца марай наступнага года. Прынамсі, фундамент пад яе зроблены, значыць, сродкі ўкладзены і працяг будзе абавязкова, запэўнівае Валерый Усікаў. Што датычыцца прэтэнзій, выказаных у лісце, адказвае:

— У народзе кажуць: ніколі не трэба паказваць незакончаную працу. Так і тут. Сёння — вы бачылі — гэтага практычна няма. Другі паверх гатовы для чыставой апрацоўкі. Мы яе зробім да 1 жніўня, каб адразу на другі паверх можна было мэблю насіць, і вас прыцягваць: чысціць, мыць і прыбіраць — як ва ўсіх школах.

Між тым, настаўнікам разам з бацькамі, расказвае **дырэктар Верасніцкай школы Валянціна КАЗАК**, не прывыкаць займацца будаўнічымі і дапаможнымі работамі. Менавіта яны выцягвалі смецце са школы, калі былі разбураны драўляныя перакрыцці. Яны ж гатовыя і цяпер падключыцца да працы — толькі б школа прыняла вучняў 1 верасня. Вельмі было складана цэлы навучальны год дзяцей вазіць у розныя школы Жыткавіцкага раёна, кажа маці **9-гадовай вучаніцы школы Іна РАДЗЕЦКАЯ**.

— Каб другі год дзеці ездзілі ў Тураў — я супраць. Я сваё дзіця пракантраляваць не магла. Калі яна прыязджала, я з ёй садзілася ў 9 гадзін рабіць урокі. Я хачу верыць, што школу здадуць і дзіця пойдзе сюды вучыцца. Але ж я хадзіла летась ў кастрычніку на прыём да старшыні нашага райвыканкама. І ён мне так катэгарычна паабяцаў, што ў нас дзеці пасля зімовых канікулаў пойдуць у школу. У нашай мясцовай газеце было надрукавана, што школа пачне працу са студзеня 2009 года. Дзеці не пайшлі — тэрміны адцягнуліся. Менавіта таму ў мяне, як у маці, ёсць сумненні, што 1 верасня яны пойдуць у якасна пабудаваную школу.

— Безумоўна, гэта не вельмі зручна — падвозіць дзяцей у школы іншых вёсак. Але ж у Гомельскай вобласці ўвогуле так дабіраюцца да ўстаноў адукацыі больш за 10 000 дзяцей. Гэтая лічба штогод не мяняецца. Гэта планавая жыццёвая праца, — адказвае жанчыне начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Марына Бондар. І дадае: — Я ўсё жыццё ў адукацыі і ведаю, у якія крытычныя тэрміны часам уводзіліся аб'екты. Але ж ніколі мы не дазволілі зайсці дзецям у тыя школы, якія не здадзены. Тут у вас былі ўсе: да старшыні аблвыканкама. І ўсе зацікаўленыя, каб школа сёлета была ўведзена. Я абяцаю, што да вас на лінейку прыеду сёлета.

— Мы яшчэ перажываем таму, што баімся: запусцяць школу, мы пойдзем на заняткі, правучымся месяц-два, і тая тынкоўка, якая абсыпалася раней, абсыплецца зноў, — кажа **Святлана БІЧКА, настаўнік пачатковых класаў**. І рамонт будзе за кошт настаўнікаў і бацькоў. Вось чаму мы так перажываем.

Бацькоў і настаўнікаў супакойваюць будаўнікі. І растлумачваюць, чаму не маглі раней інтэнсіўна працаваць на будаўніцтве Верасніцкай школы.

— Ваша школа на той момант была не ўвадная. А акрамя вашай школы, у нас яшчэ 50 тысяч квадратных метраў жылля трэба было зрабіць і плюс, і плюс, і плюс.., — кажа Валерый Усікаў. — Сёння на будаўніцтве 30 чалавек працуе, заўтра будзе 50 чалавек на два дні. Зробіцца тое, што не рабілася тры тыдні, за два дні. Паспеем і добраўпарадкаванне зрабіць — гэта ж частка праекта. Мы ж, як і вы, плануем сваю дзейнасць. У нас тысяча праблем, якія трэба закрыць на самых розных аб'ектах.

Для намесніка начальніка ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Таццяны Атрохавай, якая курыруе праблемы будаўніцтва, Верасніцкая школа — як родная. Яна тут бывала не раз, хоць і адлеглась ад Гомеля няблізкая. Памятае яна, як складана пачыналася будаўніцтва, якія былі сумненні.

— Калі мы з вамі сустракаліся ў 2006 годзе, думалі: пачынаць ці не будаўніцтва, у вас былі моцныя сумненні: мы школу разбурым, а што мы зробім? А што, у нас можа быць спартыўная зала? А што, у нас можа быць харчблок? Мы адразу пачалі праектаваць і ў 2008 годзе зрабілі задзел. Мы не парушылі нашы планы. У нас 22 школы ў вобласці маюць драўляныя перакрыцці і пабудаваныя ў той жа прыкладна час, як і ваша школа. Да іх пакуль не дайшла чарга — па тэхнічным стане яны могуць пачакаць. У вашай чакаць было нельга. І цяпер першы этап работ, які прадугледжвае рамонт асноўнага будынка і прыбудова харчблоку, падыходзіць да фіналу.

Між тым, пакуль камісія аглядала аб'ект, да Таццяны Фёдараўны пастаянна падыходзілі субпадрадчыкі з самымі рознымі пытаннямі. Праблем яшчэ, сапраўды, шмат, што, аднак, не перашкаджае даваць цвёрдыя абяцанні.

— Мы ж пастаянна на сувязі і з генеральным падрадчыкам, і з заказчыкам — упраўленнем капітальнага будаўніцтва Жыткавіцкага райвыканкама, і з субпадрадчыкамі. Робім усё, каб аб'ект быў здадзены. І ён будзе завершаны да 1 верасня. Ну а што датычыцца недапрацовак, вы, як спажыўцы, павінны ведаць: калі заключаецца дагавор, у абавязковым парадку вызначаецца, на працягу якога тэрміну трэба звяртацца, калі выяўляюцца нейкія недахопы. Два гады ў гэтым выпадку.

— Ніхто не дазволіць увайсці ў школу, пакуль не будзе падпісаны акт дзяржкамісіі, — пацвярджае начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Марына Бондар. — Такі парадак. Што датычыцца спартзалы, мы не планавалі яе здаць сёлета. Але ж у наступным годзе мы будзем завяршаць і спартзалу.

Сход з бацькамі дзяцей, што вучацца ў Верасніцкай школе, доўжыўся каля гадзіны і пытанняў на ім задавалася няшмат — што некалькі здзівіла. Але ж напрыканцы з натоўпу была сказана такая фраза:

— Пасля таго, як мы напісалі скаргу, нам сказалі — першых дзесяць чалавек звольняць, кантракт не будуць працягваць.

Хто канкрэтна спрабаваў запужаць людзей, засталося тайнай — людзі адмоўчваліся, усё ж баяліся. І хоць начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Марына Бондар запэўніла, што ніякіх рэпрэсій не можа быць згодна з законам, людзі ўсё ж запатрабавалі яшчэ і пісьмовы адказ на сваю скаргу. Відаць, як гарантыйны дакумент.

Тым часам на Гомельшчыне, акрамя Верасніцкай, да ўводу ў верасні пасля капітальнага рамонту рыхтуюцца яшчэ тры школы. Дзве з іх у Чачэрскім раёне — у Роўкавічах і Залессі, і яшчэ ў дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Сідзельнікі» Мазырскага раёна. Паўсюль ідуць інтэнсіўныя будаўнічыя работы — да 1 верасня застаецца крыху больш за месяц.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Начальнік упраўлення Гомельскага аблвыканкама Марына БОНДАР разам з генеральным дырэктарам унітарнага прадпрыемства «Палессебуд» Валерыем УСІКАВЫМ аглядаюць харчблок Верасніцкай школы.

РАЗ ТРУБА, ДВА ТРУБА...

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

На «Гарачы тэлефон» пазваніла наша чытачка Валянціна Шуст. Яна цяпер прыехала да маці ў вёску Садовую Клецкага раёна. І якраз у гэты час пачаўся рамонт вуліцы, дзе стаіць іх хата. Прыехала тэхніка, паклалі новы асфальт і пачалі мяняць абапал дарогі трубы ў канаве для сцёкавай вады. І аказалася, што камусьці адну трубу кладуць — толькі насупраць веснічак, а камусьці дзве — яшчэ і насупраць гаража. І ля хаты маці Валянціны Міхайлаўны кладуць якраз толькі адну трубу. Працаўнікі-дарожнікі кажуць — так намалявана ў плане, нічога зрабіць не можам. І вось Валянціна Шуст прасіла дапамагчы, даць параду, як «здабыць» другую трубу.

Вядома, рэдакцыя труб не выпісвае, але каб разабрацца ў сітуацыі, я патэлефанаваў галоўнаму інжынеру ДРБУ № 212 Ігару Давыдку. Ён спытаў адрас нашай чытачкі і папрасіў ператэлефанаваць праз палову гадзіны. За гэты час ён пад'ехаў на месца, разабраўся і праблема была вырашана — знайшлася яшчэ адна труба і для гаража.

У прынцыпе, здаецца, пытанне знятае. Аднак я хацеў бы засяродзіць увагу на тым, што насамрэч праблема значна шырэйшая. Бо вінаватыя не тыя, хто дарогу будуе, а тыя, хто яе праектуе. Згадзіцеся, што ў нас часта бывае такое: спачатку нешта зробяць, а потым высвятліцца, што трэба было зрабіць зусім не тое і не на тым месцы. Вось і ў галоўнага інжынера зараз тэлефон разрываецца: аднаму трубы не хапае, другому не там яе паклалі. Але ж у яго ёсць план. І парушыш яго — аб'ект не прымуць. А не паслухаць людзей, якім жыць на гэтай вуліцы, таксама нельга. Бо ў той жа вёсцы Садовай інвалід папрасіў перанесці трубу ад далёкага гаража, якім ён не карыстаецца, да бліжэйшага. Ну як інваліду адмовіць? Не будзем разбірацца, хто рабіў праект у гэтым асобным выпадку (дарэчы, яго складалі за некалькі гадоў да пачатку рамонту), такіх праектаў па краіне — мноства ў кожнай сферы жыцця, але давайце лепей будзем праектаваць так, каб гэта было зручна, давайце будзем ну хоць бы папярэдне раіцца з людзьмі. Каб потым з-за адной трубы не адпраўляць кіпу дакументацыі на перагляд і дапрацоўку.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Приорбанк
Открытое акционерное общество
RZB Group

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-а

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 июля 2009	на 1 июля 2008
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	218 402,1	84 050,9
3	Средства в Национальном банке	1102	2	169 049,5	235 265,9
4	Ценные бумаги:	1103		112 428,2	157 551,5
	для торговли	11031	3	76 686,5	157 551,5
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	35 741,7	0,0
	в наличии для продажи	11033	3.2	0,0	0,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	879 144,9	623 833,4
6	Кредиты клиентам	1106	5	3 560 917,5	3 359 687,7
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	9 736,4	7 736,4
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	198 551,9	145 925,5
9	Прочие активы	1109	8	127 612,3	62 042,4
10	**ИТОГО активы**	**110**		**5 275 842,8**	**4 676 093,7**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	8 794,9	9 032,5
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	2 047 701,3	1 993 286,2
14	Средства клиентов	1206	11	2 227 270,3	2 055 097,1
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		150 626,7	98 126,5
16	Прочие обязательства	1209	12	120 989,6	78 135,9
17	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**4 555 382,8**	**4 233 678,2**
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	412 279,3	270 105,1
20	Эмиссионный доход	1212		0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213		62 008,8	43 508,8
22	Накопленная прибыль	1214	14	158 460,9	59 164,8
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	87 711,0	69 636,8
24	Всего капитал	121		720 460,0	442 415,5
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**5 275 842,8**	**4 676 093,7**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	4 119 243,3	2 941 113,2
28	Обязательства	1302	17	1 184 279,0	1 093 801,9

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-а

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 июля 2009	на 1 июля 2008
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		276 245,2	191 645,2
2	Процентные расходы	2012		171 856,0	108 622,2
3	Чистые процентные доходы	201	18	104 389,2	83 023,0
4	Комиссионные доходы	2021		111 502,0	79 559,3
5	Комиссионные расходы	2022		20 651,1	21 252,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	90 850,9	58 306,9
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	40 562,1	26 349,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	518,8	-10,9
9	Доход в форме дивидендов	205		130,2	25,9
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	38 355,3	9 713,7
11	Прочие доходы	207	23	81 932,0	34 050,7
12	Операционные расходы	208	24	100 375,7	84 174,5
13	Прочие расходы	209	25	25 723,1	35 164,3
14	Налог на прибыль	210		39 552,3	19 002,8
15	**ПРИБЫЛЬ**	**2**		**114 376,8**	**53 689,5**

Временно и.о.
Председателя Правления С.И. Шишов

Заместитель главного бухгалтера С.И. Капцевич

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 28.08.2008 года. УНП 100220190.

РАСІЙСКІ АКЦЁР ДЗМІТРЫЙ ПЯЎЦОЎ АКАЗАЎСЯ ЎЦЯГНУТЫМ У СПРАВУ АБ КРАДЗЯЖЫ


Фота Пятра ФАМІНА.

Прагляд новага фільма з удзелам Дзмітрыя Пяўцова на адной з мінскіх кватэр скончыўся крадзяжом трох сумак, чатырох мабільных тэлефонаў і 250 тысяч беларускіх рублёў. Цікава, што і сам Пяўцоў знаходзіўся у гэтай кватэры.

Знаходзячыся ў Мінску на здымках чарговага фільма, Дзмітрый зазірнуў да знаёмага, каб паглядзець нядаўна знятую кінастужку са сваім удзелам. Акрамя акцёра, на «кінасеансе» прысутнічалі яшчэ трынаццаць чалавек.

Як паведамілі ў прэс-службе Кастрычніцкага РУУС, госці пакінулі свае рэчы на стуле ў вітальні, пасля чаго прайшлі ў пакой, дзе і глядзелі фільм. Каля гадзіны ночы сабраліся разыходзіцца, і тут тры дзяўчыны не змаглі знайсці свае сумачкі. Акрамя грошай у іх былі пашпарты, банкаўскія пластыкавыя карткі, вадзіцельскія пасведчанні. Супрацоўнікі праваахоўных органаў мяркуюць, што гаспадары проста забылі зачыніць уваходныя дзверы. Зладзеі, відаць, зазірнуўшы ў кватэру, схапілі першыя сумачкі, што трапілі пад руку, і ўцяклі. Кошт адной з сумачак, да слова, уладальніца ацаніла больш чым у 600 тысяч рублёў.

У пацярпелай і гасцей, у тым ліку і ў Дзмітрыя Пяўцова, узяты тлумачэнні ў сувязі з тым, што здарылася. Заведзена крымінальная справа па частцы 1 артыкула 205 КК РБ «Крадзеж».

Аляксей ІВАНЮШКА, «Мінск—Навіны».

СМЯРОТНЫЯ СВАРКІ

20 ліпеня ўвечары ў сваёй хаце ў вёсцы Амхавая-1 Магілёўскага раёна быў знойдзены труп 51-гадовага мужчыны. Яго смерць была гвалтоўнай: не целе — нажавыя раны. Міліцыя хутка высветліла, што гэтым вечарам муж і жонка пасварыліся на глебе рэўнасці, і 49-гадовая жанчына апошнія аргументы ў сямейнай спрэчцы падмацавала нажом.

У Асіповіцкім раёне ў вёсцы Замошша 21 ліпеня раніцай у хаце знайшлі труп 55-гадовага мясцовага жыхара. Сумнеў выклікалі драпіны на твары нябожчыка. Паводле папярэдняй медэкспертызы, мужчына памёр ад кровазлівання ў мозг. Міліцыя і тут дзейнічала аператыўна і высветліла, што напярэдадні ўвечары пасля сваркі гаспадара хаты моцна збіў 26-гадовы аднавясковец.

Алена КАЗЛОВА.

Сітуацыя

Дзіцячыя пляцоўкі небяспечныя для жыцця...

Карэспандэнт «Звязды» разам з работнікамі пракуратуры праверыў стан дзіцячых пляцовак. Ад таго, што ўбачыў, прыйшоў у жах

Аказваецца, большасць дзіцячых гульнявых пляцовак ва ўсіх раёнах Віцебшчыны не адпавядаюць неабходным стандартам. А некаторыя натуральна пагражаюць жыццю і здароўю людзей. І куды глядзяць работнікі камунальных службаў? Бо, як правіла, гульнявыя пляцоўкі і збудаванні знаходзяцца на балансе жыллёва-камунальных службаў. А бывае, як, напрыклад, у Полацкім раёне, пляцоўка наогул не знаходзіцца ні на чыім балансе. А ў Чашніках на месцы, дзе павінны гуляць дзеці, знаходзіцца... стаянка аўтатранспарту.

Згодна з патрабаваннямі стандарту, абсталяванне павінна быць устаўлявана так, каб яго эксплуатацыя была бяспечная для жыцця. Дык як жа зразумець: чаму ў Наваполацку ў дварах дома № 86 па вуліцы Маладзёжнай на горцы адагнуты вострыя металічны элемент дэкору, разышліся зварачныя швы, на горцы «Шлем» таксама ёсць вострыя элементы канструкцыі? А на горцы ля дома № 102 элементы жалаба прыбіты цвікамі, а ў астатніх месцах ліст жалаба наогул адарваны.

У Расонскім раёне рашэннем райвыканкама гульнявыя збудаванні і малыя архітэктурныя формы, што па вуліцы Камсамольскай, перададзены на баланс мясцовай камунальнай структуры. Трэба было даследаваць іх стан, адрамантаваць. Але, як высветлілася падчас праверкі, нічога такога не было зроблена. На некалькіх пляцоўках у Талачыне шмат смецця. А ў абласным цэнтры на вуліцы Лазо побач з пляцоўкай для гульняў вялося работы па рамонце цеплатрасы, былі адкрыты люкі бетонных калодзежаў, але зону работ не абазначылі часовай агароджай! А па вуліцы Праўды дзеці гуляюць на пляцоўцы непадалёк ад высакавольтнай лініі электраперадач.

Як паведаміла «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына ЯНУКОВІЧ**, па выніках праверкі гарадскія і раённыя пракуратуры вынеслі кіраўнікам суб'ектаў гаспадарання 13 прадпісанняў аб выпраўленні выяўленых парушэнняў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже следующего объекта недвижимого имущества:

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Инвентарный номер	Год постройки	Общая площадь, кв.м	Начальная стоимость объекта, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1.	Изолированное помещение	Минский р-н, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, пом.1	600/D-52876	2005	264,3	1 420 638 930	20 000 000

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.

Торги состоятся **04.08.2009 года**, в **10.00,** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 3 этаж, зал совещаний.

Шаг аукциона – **5 %** начальной стоимости объекта.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район» № 3012204960010 в ф-ле Минская городская дирекция ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 153001963, УНН 600438617.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе объектов осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 10 банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **03.08.2009 г.** до **14.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103.

Тел. (017)237 91 32, (029)757 12 02.

АБЫШЛОСЯ БЕЗ РЭВАЛЮЦЫІ

Хатні матч БАТЭ супраць «Македоніі» пацвердзіў перавагу ў класе беларускага чэмпіёна над супернікам. Дзякуючы дзвюм вікторыям, барысаўчане прабіліся ў трэці кваліфікацыйны раўнд Лігі чэмпіёнаў.

Каб пераламаць ход двухматчавага рандзеву, македонцам не дапамаглі ні парады Бруна Мбанангоя, ні імя вядомага рэвалюцыянера, увекавечанае ў афіцыйнай назве клуба.

Толькі чакаць ад балканцаў гасцёўскай ветлівасці і шахматнага спакою не давялося. Каб прайсці далей, падапечным Ілча Д'ярдзьеска трэба было тройчы забіваць барысаўчанам. Задача магчымая, але ж пры зладжанасці барысаўскай абароны і добрай падтрымцы хатняга стадыёна была цяжкавырашальнай. Балканскія наскокі на Ліхтаровіча і кампанію былі частымі, але досыць прымітыўнымі, і гульня ў «бі—бягі» чыталася абаронцамі Віктара Ганчарэнкі досыць лёгка. Галкіперу Сяргею Верамко амаль не давялося ўступаць у гульню. Тонус Сяргей падтрымліваў старым і праверaным спосабам: размінаўся амаль па ўсёй тэрыторыі сваёй штрафной пляцоўкі. Неўзабаве македонцы наогул спынілі рухавік атак, і маленькай рэвалюцыі, якую так чакалі заўзятары з Балканаў, не адбылося. Дух вядомага ў Македоніі рэвалюцыянера Горчэ Петрава, імя якога прысутнічае на тытульнай шыльдзе каманды, так і не натхніў футбалістаў на спартыўныя подзвігі. Прадстаўнікі былой саюзнай Югаславіі аказаліся непадрыхтаванымі, і нават асноўны цяжар працы, як падалося з трыбуны, лёг на бразільскіх і габонскіх легіянераў.

— Напярэдадні паядынку я размаўляў з суайчыннікам Бруна Мбанангоем, які гуляе за мінскае «Дынама», — кажа пасля матчу габонскі абаронца «Македоніі» Жорж Амбурэт. — Ён папярэджваў, што ў барысаўчан моцная атака, і нам прыйдзецца вельмі цяжка. Як паказвае вынік, ён казаў праўду...

І сапраўды, форварды БАТЭ маюць вялікі патэнцыял. Але нагадалі яны пра свой узровень толькі пасля перапынку. А да гэтага толькі запомніліся ўдарам праз сябе ў выкананні Сасноўскага, няўдалымі штуршкамі Скавыша і Крыўца. Згадзіцеся, не так шмат для каманды, якая прагне трапіць у групавы раўнд Лігі чэмпіёнаў. А можа прычына не толькі ў рэалізацыі?

— Усе мы перад матчам хваляваліся, што будзе недаацэньванне. І крышачку пераціснулі. Да забітага гола каманда не выглядала разняволенай, — тлумачыць пасіўнасць каманды яе трэнер Віктар Ганчарэнка.

Спробы нізам прайсці праз абарону гасцей разбіваліся аб неперадольную македонскую сцяну, і толькі фланга-выя закідванні прынеслі гаспадарам галявы ўраджай. Якасныя падачы Ігара Стасевіча прымушалі македонцаў хвалявацца і проста адбівацца. Прайшло яшчэ колькі часу і македонцы ўсё ж такі выкінулі белы сцяг. Стасевіч тонкім пасам знайшоў у пляцоўцы Сяргея Сасноўскага, які без перашкодаў адправіў мяч пад перакладзіну.

— Адчування, што сёння заб'ю, у мяне не было, — дзеліцца з журналістамі пасля гульні Сасноўскі. — Безумоўна, забіваць галы прыемна, аднак для мяне галоўнае ў абароне згуляць на нуль...

Прыемна, што Сяргей не толькі парадаваў надзейнасцю, але і падштурхнуў дакладным ударам сваю каманду на больш рашучыя дзеянні. Хутка атакуючую палітру барысаўчан дапоўніў яскравымі фарбамі Віталь Радзівонаў, які нядаўна вярнуўся з Германіі. Ён хоць і пырхаў нябачным матыльком, але джаліў як пчала. Ужо ў дадзены час Віталь дачакаўся «скуранога» ля штангі і ў адзін дотык усталяваў канчатковыя лічбы на табло. 2:0 — лік, які дазваляе БАТЭ ўпэўнена ісці ўгору па лігачэмпіёнскіх прыступках. Хто далей?

Тарас ШЧЫРЫ.

г. Барысаў.

Фота Пятра ФАМІНА.

Як старшыя падатковыя інспектары закон парушалі

Два старшыя дзяржаўныя падатковыя інспектары аддзела адной з раённых падатковых інспекцый Віцебска асуджаны на 2,5 года пазбаўлення волі кожны з выплатай штрафу — па 7 мільёнаў рублёў. За што трапілі за дрот адказныя работнікі паважанага ведамства?

Як паведаміла «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына ТАЎТЫН**, яны карысталіся службовымі паўнамоцтвамі, каб, акрамя зарплаты, мець і яшчэ нешта. Для гэтага парушалі парадак правядзення кантрольных закупак, кантрольных афармленняў заказаў. Так, падчас правядзення так званай кантрольнай закупкі дапаможнай свайму знаёмаму бясплатна замяніць маторнае масла і маслены фільтр у аўто. А калі б не інспектары, заплаціў бы ён больш за 70 тысяч рублёў. А так Ігар і Вячаслаў (назавём іх так) супрацоўнікам прыватнага прадпрыемства аўтасэрвісу растлумачылі — маўляў, вялося кантрольнае афармленне заказу. Пытанні пра аплату ёсць? Не было — хто хацеў сварыцца з правяраючымі?!

Прыкладна праз тыдзень такім жа чынам, але ў іншай аўтамайстэрні былі праведзены аналагічныя работы ў машыне калегі інспектараў. Калега эканоміў тыя ж 70 тысяч рублёў.

А яшчэ аднаму таварышу «на халяву» дапамаглі зрабіць рамонт «Форда», які абышоўся б яму ў 83 тысячы рублёў. І другую машыну «Аўдзі-80», пафарбавалі бясплатна (эканомія 836 тысяч рублёў). Больш за тое, пры падтрымцы інспектараў гэтаму ж таварышу індывідуальныя прадпрымальнікі бясплатна ўстанавілі ў кватэры двое міжпакаёвых дзвярэй агульным коштам 930 тысяч рублёў і акно ПВХ (кошт — больш за 1 мільён рублёў).

І машыну іншага знаёмага прывялі ў парадак. Пад выглядам кантрольнага афармлення заказу падатковы інспектар Ігар за замену вадзяной помпы не аплаціў 180 тысяч рублёў.

Вячаслаў «на халяву» прывёў у парадак свае зубы. Работы па санацыі зуба і ачыстцы ад зубных «камянёў» у дзвюх прыватных стаматалагічных клініках аказалі на суму ў 90 і 120 тысяч рублёў адпаведна. Вядома ж, грошы ён не заплаціў. Гэта ж «кантрольныя» зубы?

Цікава, што ў судзе Ігар і Вячаслаў сваёй віны не прызналі. Тлумачылі: праводзілі кантрольныя закупкі ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства. А знаёмыя... Дзякуючы ім ствараліся ўмовы для плённай работы пры ажыццяўленні кантрольных закупак. Таму і ў кватэры дзверы і акно паставілі. І нявыпіску адрыўнога талона таксама кантралявалі падчас гэтых закупак. Між іншым, паводле іх слоў, чалавек, які ўстанавіў дзверы ў кватэры іх знаёмага, наогул спужаўся, калі яму назваліся інспектары, і сказаў, што дзверы гэтыя яму не патрэбны.

Цяпер інспектары адбываюць пакаранне ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. А дома жонкі чакаюць, сем'і. Няўжо мала зараблялі? Няўжо не разумелі, што ўрэшце стане вядома пра іх дзеянні?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГАЮЧАЯ МОЦ КАНЮШЫНЫ

Канюшына знаёмая многім з дзяцінства. Сустракаецца яна практычна ўсюды: на лугах, палях, травяністых схілах, узлесках і ўзбочынах дарог. Яе ружова-лілова-чырвоныя шарападобныя галоўкі адразу кідаюцца ў вочы. У асноўным, канюшына вядомая нам як кармавая расліна, аднак яна яшчэ і прыродная лекарка. З даўніх часоў свежым лісцем канюшыны гояць раны і язвы, а настойкай суквецця лячаць малакроўе і сухоты.

Надземная частка канюшыны ўтрымлівае эфірны алей, дубільныя рэчывы, смолы і кумарыны, саліцылавую кіслату, гліказіды і флаваноіды, вітаміны С, Е, групы В і каратаноіды. Дзякуючы такому багатаму хімічнаму складу, канюшына аказвае адхарквальнае, мачагоннае, супрацьзапаленчае і антысептычнае дзеянне; эфектыўная пры лячэнні скурных хваробаў; аслабляе сімптомы менапаўзы, бо змяшчае некаторыя рэчывы — напрыклад, ізафлавоны, якія дзейнічаюць падобна эстрагену. Канюшына забяспечвае дэтаксікацыю печані і арганізма ў цэлым, добра ачышчаючы кроў і лімфу, паляпшае адток жоўці, нармалізуе дзейнасць кішэчніка.

● Пры прастудзе прыгатуйце настой канюшыны: 2 шк. сухой сыравіны заліце 1 л кіпеню, настойвайце 40 хвілін, працадзіце, прымайце па 2 ст. лыжкі 2—3 разы на дзень. (Настой рэкамендуецца прымаць таксама пры малакроўі, галаўных болях і галавакружэнні, для прафілактыкі атэрасклерозу.)

● Пры дыябеце, замест звычайнай, піце гарбату з канюшыны: у шклянцы кіпеню заварвайце 2—3 сушаныя галоўкі расліны.

● Пры вітыліга, псарыязе: 3 ч. лыжкі сухіх суквецця заварыце шклянкай кіпеню, настойвайце гадзіну, піце па 1/4 шк. 4 разы на дзень. Адначасова можна рабіць прымочкі: заварыце ў шклянцы кіпеню 2 ч. лыжкі кветак, настойвайце 5—6 гадзін (лепш у тэрмасе), прыкладайце змочаныя ў настоі сурвэткі да пашкоджанай скуры.

● Пры парушэнні менструальнага цыкла: 2 ст. лыжкі канюшыны заліце шклянкай кіпеню, закрыйце накрыўкай і настойвайце 6—8 гадзін. Піце па 1/4 шклянкі за 20—30 хвілін да яды.

● Пры запаленні яечнікаў: 20 г здробненай сыравіны заліце шклянкай кіпеню, трымайце на вадзянай лазні 30 хвілін. Астудзіце, працадзіце, давядзіце гатаванай вадой да зыходнага аб'ёму. Прымайце па 1 ст. лыжцы 4—5 разоў на дзень да яды.

● Для паляпшэння апетыту: вазьміце 2 ст. лыжкі суквецця канюшыны з верхам на 0,5 л гарэлкі. Настойвайце 10 дзён. Прымайце па 1 ч. лыжцы перад ядой на працягу 3 месяцаў з перапынкамі 10 дзён праз кожны месяц.

● Пры болях у суставах дапамагаюць ванны з настоем канюшыны і цыкорыі. Травы заварваюць разам. Вазьміце па 20 г кожнай травы на 0,5 л кіпеню, настойвайце гадзіну, выліце адвар у ванну.

● Настоем суквецця прамываюць запаленыя вочы, прымяняюць яго пры залатусе, апёках, пролежнях, для прыгатавання ваннаў пры рахіце ў дзяцей.

Увага! Асцярожнымі трэба быць з канюшынай пры болях у страўніку і дыярэі, пры сардэчных хваробах, гіпатаніі, тромбафлебіце, цяжарнасці.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

«3» августа 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, проводит повторный аукцион по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для обслуживания этих объектов.

На аукционные торги выставляются:

Время проведения аукционов	Сведения о предметах аукционов
10.00	**Здание мехмастерских** (инв. № 621/С-1904), расположенное по адресу: Минская область, г. Несвиж, ул. Слуцкая, 52,. общей площадь объекта – 487,7 кв. м, 1928 года постройки – фундамент ж/б ленточный, стены и перегородки кирпичные, чердачные ж/б панели. Территория заасфальтирована, имеется забор, сетка рябица, калитка. Объект находится в собственности Несвижского района, расположен на земельном участке площадью 0,2128 га. Срок аренды земельного участка – 51 год. **Условия аукциона по продаже объекта:** организация пункта общественного питания, либо оказание одного из видов бытовых услуг; организация стоянки автомобилей, организация гостиничного бизнеса, осуществление победителем аукциона в двухмесячный срок после подписания договора государственной регистрации права на недвижимое имущество, в течение шести месяцев изготовить проектно-сметную документацию на реконструкцию недвижимого имущества, в течение двух лет с момента государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, ввести объект в действие, создание не менее 15 рабочих мест. **Начальная цена предмета аукциона:** 115 534 382 рубля (в т.ч. недвижимое имущество: 108 779 522 рубля, право заключения договора аренды земельного участка 6 754 860 рублей). **Сумма задатка** предмета аукциона – 11 000 000 рублей. **Продавец имущества:** Отдел физической культуры, спорта и туризма Несвижского райисполкома, расположенный по адресу: Минская область, г. Несвиж, ул. К. Маркса, 36а, тел. (801770) 5 30 78. **Арендодатель земельного участка:** Несвижский районный исполнительный комитет. **Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30 мая 2009 г. № 98.**
11.00	**Комплекс зданий бывшего пионерского лагеря «Пралеска»** и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для их обслуживания (единый предмет аукциона): **казарма 3-этажная** (инв. № 622/С-26582), общей площадью 1743,1 кв.м. 1960 года постройки – фундамент железобетонные панели, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, подведены инженерные коммуникации, дорожка асфальтированная 687 кв.м; **казарма 2-этажная** (инв. № 622/С-26581), общей площадью 479,8 кв.м. 1960 года постройки – фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, подведены инженерные коммуникации, дорожка асфальтированная 407 кв.м; **здание столовой** (инв. № 622/С-26577), общей площадью 459,5 кв.м. 1960 года постройки – одноэтажное, фундамент железобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, подведены инженерные коммуникации; **штаб 1-этажный** (инв. № 622/С-26578), общей площадью 195,0 кв.м. 1960 года постройки – фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, подведены инженерные коммуникации; **склад продуктов** (инв. № 622/С-26573), общей площадью 96,7 кв.м. 1960 года постройки – одноэтажный, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, перекрытия деревянные, имеется электроосвещение; **ледник** (инв. № 622/С-26575), общей площадью 91,3 кв.м. 1960 года постройки – одноэтажный, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, имеется электроснабжение; **овощехранилище** (инв. № 622/С-26572), общей площадью 169,0 кв.м. 1960 года постройки – одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, имеется электроснабжение; **КПП (контрольно-пропускной пункт)** (инв. № 622/С-26574), общей площадью 36,8 кв.м. 1960 года постройки – одноэтажный, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, имеется электроснабжение, площадка асфальтированная 195 кв.м. и ворота; **склад вещевой** (инв. № 622/С-26576), общей площадью 101,4 кв.м. 1960 года постройки – одноэтажный, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, перекрытия деревянные, имеется электроосвещение; **склад 1-этажный** (инв. № 622/С-26583), общей площадью 143,1 кв.м. 1960 года постройки – фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные. Объекты, находятся в собственности Столбцовского района и расположены по адресу: Минская область, Столбцовский район, пос. Новоколосово на земельном участке площадью 2,79 га. Срок аренды земельного участка – 20 лет. **Условия использования земельного участка:** по целевому назначению. Начальная цена предмета аукциона: 608 662 893 рубля (в т.ч. недвижимое имущество: 608 573 243 рубля, право заключения договора аренды земельного участка 89 650 рублей). **Сумма задатка** предмета аукциона – 60 000 000 рублей. **Продавец имущества:** Отдел образования Столбцовского райисполкома, расположенный по адресу: Минская область, г. Столбцы, ул. Социалистическая, 17, тел (801717) 5 48 07. **Арендодатель земельных участков:** Столбцовский районный исполнительный комитет. **Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30 мая 2009 г. № 98.**
11.15	**Лот включает** следующие здания и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для их обслуживания (единый предмет аукциона): **здание детского сада** (инв. № 622/С-26571), общей площадью 129,1 кв.м. 1989 года постройки – **здание одноэтажное**, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, подведены инженерные коммуникации, забор деревянный; **здание склада топлива** (инв. № 622/С-29790), общей площадью 14,8 кв.м. 1989 года постройки – здание одноэтажное, фундамент деревянные стулья, стены дощатые, инженерные коммуникации отсутствуют; **здание склада для продуктов с погребом** (инв. № 622/С-29789), общей площадью 15 кв.м. 1989 года постройки – здание одноэтажное, стены кирпичные, бетонные, подвальные перекрытия железобетонные. Инженерные коммуникации отсутствуют. Объекты лота расположены по адресу: Минская область, Столбцовский район, д. Яченка на земельном участке площадью 0,1943 га. **Условия использования земельного участка:** по целевому назначению. Срок аренды земельного участка – 20 лет. **Начальная цена предмета аукциона:** 99 668 835 рублей (в т.ч. недвижимое имущество: 99 636 519 рублей, право заключения договора аренды земельного участка 32 316 рублей). **Сумма задатка** предмета аукциона – 9 900 000 рублей. **Продавец имущества:** Отдел образования Столбцовского райисполкома, расположенный по адресу: Минская область, г. Столбцы, ул. Социалистическая, 17, тел. (801717) 5 48 07. **Арендодатель земельных участков:** Столбцовский районный исполнительный комитет. **Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30 мая 2009 г. № 98.**

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома: **www. minsk-region. gov. by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

Начальная цена продажи объектов понижена на 20 %.

Победитель обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и расходы, связанные с формированием земельного участка, изменением и прекращением существования земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельных участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка. Рассрочка платы за право заключения договора аренды не представляется. После совершения победителем аукциона по продаже объекта названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями этого аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686.** Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявок **31 июля 2009 г. до 17.00. Участникам аукциона необходимо пройти заключительную регистрацию перед началом аукциона.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Здароўе на талерцы

СЕНЬЁРЫ-ПАМІДОРЫ

Першапачатковая назва гэтай агародніны была «томатль», французы перарабілі яе ў tomate (тамат). А вось слова «памідор» пайшло ад італ. pomo d'oro — залаты яблык. Памідоры — плады адной з самых папулярных сёння агародных культур. Без памідораў не абыходзіцца ні адзін стол, іх сакавітыя скрылікі ўпрыгожваюць мноства салатаў. А што ўжо казаць пра розныя кетчупы, соусы і аджыкі? Памідоры карысныя для арганізма і незаменныя на кухні — таму не ўпускайце шанц і выкарыстайце іх па поўнай.

Памідоры маюць змястоўны набор карысных для чалавечага арганізма рэчываў.

Спелыя плады багатыя на цукры і вітамін С, утрымліваюць бялкі, крухмал, арганічныя кіслоты (лімонную, яблычную, вінную і ў невялікай колькасці шчаўлевую), клятчатку, пекцінавыя рэчывы, кальцый, калій, натрый, магній, жалеза, медзь, фосфар, серу, хлор, марганец, а таксама карацін, вітаміны групы В, нікацінавую і фоліевую кіслоты, вітамін К.

Асаблівай увагі заслугоўвае лікапен (ён надае пладам чырвоны колер) — магутны натуральны антыаксідант, які нейтралізуе малекулы свабодных радыкалаў да таго, як яны пашкодзяць здаровую клетку. (Дарэчы, у тэрмічна апрацаваных таматах лікапену нават больш, чым у сырых. І ён лепш засвойваецца ў прысутнасці тлушчаў.) Лікапен зніжае рызыку развіцця раку і сардэчна-сасудзістых захворванняў; прадухіляе змяненні ў сятчатцы вока, якія могуць стаць прычынай слепаты ў сталым узросце.

Свежыя памідоры і таматны сок узмацняюць сакрэцыю страўніка, дзейнічаюць як лёгкае слабіцельнае, перашкаджаюць збіранню газаў; з'яўляюцца добрым дыурэтыкам пры хваробах нырак і мачавога пухіра; рэкамендуюцца пры астэніі, атэрасклерозе, аслабленні памяці, малакроўі.

І яшчэ адна вельмі карысная ўласцівасць таматаў для тых, хто хоча падтрымаць фігуру або пахудзець, — іх невялікая каларыйнасць (23 ккал на 100 г). А хром, які ўваходзіць у склад памідораў, садзейнічае больш хуткаму насычэнню і папярэджвае прыступы «звярынага» голаду.

Памідоры лепш не трымаць у халадзільніку, паколькі холад замаруджвае выспяванне і «забівае» іх водар і смак. Захоўвайце іх пры пакаёвай тэмпературы, удалечыні ад прамых сонечных прамянёў. А каб няспелыя памідоры хутчэй пачырванелі, іх трэба змясціць у папяровы пакет і пакласці туды яблык.

Увага! Ужыванне таматаў варта абмяжоўваць тым, у каго выяўлена алергія на чырвоныя агародніну і садавіну.

САЛАТА ПАМІДОРНАЯ З СЫРАМ

Вам спатрэбіцца: *6 памідораў, 1 цыбуліна-рэпка, 100 г сыру, 4 ст. лыжкі алею, кроп, соль, перац.*

Памідоры нарэзаць скрылікамі, цыбулю нашаткаваць саломкай. Сыр надзерці на буйной тарцы. Усё змяшаць, заправіць соллю, перцам, алеем, упрыгожыць зяленівам кропу.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Фігура і міфы

Інфарм-укол

Хлусня: некаторыя прадукты, напрыклад, ананас, грэйпфрут, сельдэрэй або суп з капусты могуць спальваць тлушч і спрыяць зніжэнню вагі.

Праўда: не існуе прадуктаў, якія б спальвалі тлушч. Некаторыя прадукты пры ўздзеянні з кафеінам могуць павялічваць хуткасць метабалізму на невялікі час, але гэта не азначае, што такія прадукты зніжаюць вагу. Іншая справа, ужыванне любой клятчаткі ў прынцыпе. Чым больш раслінаў і менш тлустай ежы ў рацыёне, тым бліжэй ідэал фігуры.

Хлусня: тлустыя арэхі не варта есці таму, хто збіраецца худзець.

Праўда: арэхі сапраўды ўтрымліваюць багатую колькасць тлушчаў, а значыць, і калорый. Аднак тлушчы гэтыя — поліненасычаныя, гэта значыць, вельмі карысныя, здольныя прафілактаваць павышаныя ўзроўні халестэрыну, рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў. Арэхі з'яўляюцца складнікам самага што ні на ёсць здаровага харчавання яшчэ і з-за багатага ўтрымання расліннага бялку. А 30 г арэхаў — гэта ў сярэднім 170 ккал. Карацей, няма чалавека, які набраў бы вагу на арэхах.

Хлусня: ад мучнога і салодкага абавязкова папраўляюцца.

Праўда: паводле шэрагу спецыяльных даследаванняў, калі ў ежы мала тлушчаў, то чалавек наўрад ці моцна паправіцца нават пры ўключэнні ў сваё меню мучнога і салодкага. Іншая рэч, шэраг салодкіх прысмакаў багатыя не толькі на вугляводы, але і на тлушчы, якія, як вядома, з'яўляюцца больш каларыйнымі за першыя.

Хлусня: ад алею не паправішся

Праўда: алей, як ні круці, — тлушч. Хоць яго яшчэ і называюць посным. Калі звычайнае сметанковае масла, маргарын, тлустую смятану і маянэз вы ўсё часцей мняце на алей (аліўкавы, сланечнікавы, кукурузны і г.д.), то нельга сказаць, што вы робіце няправільна. Іншая рэч, захапляцца алеем (у сэнсе лішняя лыжачка не нашкодзіць) нельга. Алей паважае меру, інакш вы рызыкуеце не толькі не пахудзець, але і набраць вагу.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

КРАІНА ЗДАРОЎЯ

Выпуск № 25 (139)

Прамая лінія

ВОЧКІ ПАТРАБУЮЦЬ РАЗГРУЗКІ

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Моцным «падрыўніком» здароўя вачэй у дзяцей была і застаецца, як вядома, школа. Не сакрэт, што на пачатку навучання назіраецца адна колькасць блізарукіх, а напрыканцы — у разы большая. Пры гэтым ад нараджэння праблемы са зрокам шэраг дзесяцігоддзяў запар мае прыкладна аднолькавая колькасць дзяцей, якія ўваходзяць у групу рызыкі. Дарэчы, для своечасовай дыягностыкі праблем з вачыма афтальмолаг аглядае дзіця ў 3,6 месяца і ў 1 год. Далей рэкамендуецца падтрымліваць падобную практыку штогод.

Прыроджаныя паталогіі вачэй сустракаюцца не часта, але вылучаюцца разнастайнасцю. Скажам, самай распаўсюджанай паталогіяй, якая патрабуе хірургічнага ўмяшання ў нованароджаных, з'яўляецца непраходнасць слёзных шляхоў. Своечасовага выяўлення і хірургічнага ўмяшання патрабуе яшчэ адна распаўсюджаная на сёння паталогія ў свеце — рэцінапацыя неданошаных, або змяненне сасудаў сятчаткі і шклопадобнага цела ў дзяцей, якія нарадзіліся раней за тэрмін.

Сярод дзяцей старэйшага ўзросту стабільна расце колькасць блізарукіх. У прафілактыцы такога стану вялікую ролю адыгрывае вытрымліванне гігіены нагрузак. Праўда, многія з дарослых ігнаруюць укараненне дысцыпліны ў сям'і. Нельга парадаваць і тых, хто спадзяецца выключна на выратавальныя сучасныя тэхналогіі. На жаль, тая ж лазерная карэкцыя — гэта толькі спосаб карэкцыі, але ні ў якім разе не спыненне міяпіі, якая прагрэсуе. Зусім іншая справа — стацыянарная міяпія да 3 дыяптрый, калі вока проста прыстасавалася да работы на блізкай адлегласці і прагрэсу стану не адбываецца.

А на вашы пытанні адказала галоўны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Вікторыя КРАСІЛЬНІКАВА.

☎ — Мінск, Настасся. Дзіцяці — 4 гады. Пры нярэдкім асвятленні або бліжэй да вечара ў дзяўчынкі правы зрэнак расшыраецца больш за левы. Што гэта можа быць?

— А якое вока пры гэтым бліжэй да акна?

— Святло падае раўнамерна.

— Не заўсёды рэакцыя зрэнак звязана з паталогіяй вока.Часам гэта бывае праяўленнем неўралагічных захворванняў. Калі вы дасканала абследаваліся ў акуліста, то цяпер павінны звярнуцца да дзіцячага неўролага. Толькі пасля такога поўнага абследавання можна будзе дакладна сказаць, што ў наяўнасці: праблема са здароўем або індывідуальная асаблівасць дзіцяці.

— Трэба звяртацца да спецыяліста па месцы жыхарства?

— Спачатку ў сваю паліклініку, а калі там не дапамогуць, можна і ў спецыялізаваныя дзіцячыя цэнтры рэспубліканскага ўзроўню, дзе можна дасканала абследаваць дзіця і атрымаць разгорнутую карціну.

☎ — Мінск, Людміла. Дачцэ 18 гадоў. У яе міяпія, праўда, дакладны паказчык не скажу... Носіць акуляры. Але, можа, параіце што-небудзь для ўмацавання зроку? Кажуць, можна закапаць чарнічны сок у вочы...

— Блізарукасць — гэта калі пераламляльныя здольнасці рагавіцы і хрусталіка не дазваляюць размясціць выява на самой сятчатцы, а менавіта — перад сятчаткай. Акуляры дазваляюць размясціць выяву на самой сятчатцы. Вярнуць той зрок, што быў у раннім дзяцінстве, вашай дачцэ ўжо не ўдасца, хіба толькі выканаць лазерную карэкцыю зроку. Вашай дзяўчынцы можна парэкамендаваць вытрымліваць гігіену зроку, правільныя нагрузкі, каб зрок па меншай меры захоўваўся на ранейшым узроўні. Калі не падабаюцца акуляры, можна карыстацца кантактнымі лінзамі. Што датычыцца кропель, то любыя з іх не вернуць зрок, але можна прапанаваць прыём антыаксідантнага комплексу — вітамінаў А, Е і С або можна прымаць комплексы на аснове экстракту чарніц. Можна і проста ўжываць самі ягады, але толькі не закапваць у вочы. Акрамя таго, ваша дачка павінна раз на год абследавацца па месцы жыхарства і праходзіць агляд вочнага дна з фундус-лінзай для пазбягання цяжкіх ускладненняў.

☎ — Барысаў, Алена. Сыну 14 гадоў. Займаецца боксам. Скажыце, якія пагрозы зроку існуюць пры такім захапленні? Наколькі я разумею, адслойванне сятчаткі — самая горшая пагроза?

— Калі ўдар прыпадае менавіта на вобласць вока, можа надысці кантузія вочнага яблыка. Яна бывае чатырох ступеняў у залежнасці ад таго, якія траўмы атрымала вока, — зваротныя ці незваротныя. Адслаенне сятчаткі — чацвёртая стадыя кантузіі, досыць цяжкае ўскладненне. Нагогул вока ўладкавана так, што павінна супрацьстаяць пазаштатным сітуацыям, у тым ліку лёгкім траўмам. Калі ў вашага сына няма прыроджаных захворванняў вачэй, няма міяпіі, асабліва высокіх ступеняў, то ён можа смела працягваць заняткі. Усё ж такі не ўсе вялікія спартсмены страцілі за сваю кар'еру зрок. Безумоўна, траўмаў лепей пазбягаць, паколькі паўтарэнне такіх сітуацый можа прывадзіць да парушэнняў дробных структур вока.

— Вы сказалі, што можна займацца, калі няма міяпіі...

— Усё залежыць ад таго, якая міяпія. Слабая, без змяненняў на вочным дне, не з'яўляецца супрацьпаказаннем для заняткаў фізкультурай і спортам. Сярэдняя, як правіла, суправаджаецца змяненнямі з боку сятчаткі, і гэта накладвае пэўныя абмежаванні. Напрыклад, цяжкай атлетыкай не могуць займацца дзеці з блізарукасцю звыш 3 дыяптрый.

— І скакаць нельга?

— У мяккую ваду — можна, а на батуце скакаць нельга. Ёсць нават спецыяльны загад, дзе прапісана, якімі відамі спорту нельга займацца пры тых ці іншых хваробах вачэй.

☎ — Баранавічы, Лідзія Сяргееўна. Цяпер многа кажуць пра абарону вачэй ад ультрафіялету. Чула, што дапамагчы тут могуць нават не цёмныя, звычайныя, акуляры... Можа, сапраўды, варта заказваць менавіта такі пластык для паўсядзённых акуляраў? У якіх «оптыках» можна заказаць такія акуляры?

— Такія акуляры сапраўды існуюць. Аднак цяпер абароне ад ультрафіялету надаюць, я сказала б, надзвычай вялікую ўвагу. Баюся, мы тут больш гонімся за модай, чым за бяспекай. Чаму я так кажу? Таму што нават наша звычайнае шкло ў дамах, офісах не прапускае ўльтрафіялету. Такім чынам, сіні спектр сонечнага выпраменьвання адсякаецца і ў самых звычайных акулярах. Больш за тое, вока так уладкавана, што абараняе сятчатку ад апраменьвання з дапамогай хрусталіка, які паглынае частку промняў ультрафіялету. Так што ў значнай ступені цёмныя акуляры — гэта не столькі прафілактыка праблем са зрокам, колькі звычайная рэклама. Да таго ж, лічыцца, што не столькі ўльтрафіялетавае, колькі інфрачырвонае апраменьванне шкодзіць вачам. Значна больш падстаў для размовы пра бяспеку для вачэй варта весці, калі мы глядзім на агонь. Інфрачырвонае, цеплавое апраменьванне значна больш разбурае структуру хрусталіка, чым ультрафіялет.

— Дык не абавязкова насіць у сонечнае надвор'е сонечныя акуляры?

— Па-першае, не ўсе яны, як вядома, валодаюць абарончым эфектам. А па-другое, больш да месца яны ў той сітуацыі, калі вы вымушаны знаходзіцца на сонцы некалькі гадзін.

☎ — Мінская вобласць, Рэгіна. У суседкі маіх сваякоў нядаўна выявілі туберкулёз вачэй. Цяпер яна лечыцца ў тубдыспансэры. Раскажыце, калі ласка, пра памянёнае захворванне? Адкуль яно бярэцца? Ці бывае ў дзяцей?

— Туберкулёз — заразнае захворванне, што выклікаецца палачкай Коха, якая ў сваю чаргу перадаецца паветрана-кропельным шляхам.

— А як трапляе ў вока?

— З крывёй разносіцца па арганізме. Мы ўсе інфіцыраваныя палачкай з дзяцінства, калі нас прышчэплівалі ад актыўнай формы туберкулёзу. Іншая справа, у адных з нас ёсць імунітэт да гэтага захворвання, а ў іншых няма. Пры любым аслабленні імуннай сістэмы захворванне можа ахапіць любы орган. Пры гэтым больш правільна будзе гаварыць пра інфекцыйна-алергічнае паходжанне захворвання. Асноўная крыніца паражэння — лёгкія, але можа быць і вока, напрыклад, дзе ўтворыцца ачаг інфекцыі.

— Гэта добра лечыцца?

— Досыць добра, праўда, лячэнне працяглае, на працягу года, пасля чаго пацыенты знаходзяцца на дыспансэрным уліку. Праз пэўны час наступае поўнае ачуньванне.

— Афтальмолаг на звычайным прыёме можа разгледзець туберкулёзнае захворванне вачэй?

— Безумоўна. Адно, што спачатку ён можа толькі западозрыць, а для ўдакладнення сітуацыі неабходна даабследавацца.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

НЕ ІМКНІЦЕСЯ НА ЭКЗАТЫЧНЫМ АДПАЧЫНКУ ПАКАШТАВАЦЬ УСЁ

Адпачынак — самы доўгачаканы час. Асабліва калі плануецца падарожжа ў гарачыя краіны. Вы будзеце купацца, каштаваць розныя нацыянальныя стравы, гуляць па прыгожых мясцінах. Але ніхто не дасць гарантыі, што на экзатычным адпачынку вас не падпільнуе небяспека. Напрыклад, можна стаць ахвярай алергіі. Як пазбегнуць яе? Пра гэта нам расказала галоўны пазаштатны дзіцячы алерголаг Міністэрства аховы здароўя, дацэнт кафедры педыятрыі БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук Алена ВОЙТАВА.

— Безумоўна, прычынай алергічных рэакцый могуць быць многія фактары. Дапусцім, змены ў харчаванні. Розныя экзатычныя плады, якія адпачывальнікі імкнуцца пакаштаваць, могуць стаць прычынай высыпак, якія свярбяць, ацёкваць твару і канечнасцяў, дыярэі. Адзін з мацнейшых алергенаў — морапрадукты, незалежна ад таго, як яны будуць гатавацца. Алергенныя ўласцівасці рыбы, крэветак, кальмараў і г.д. нават пры тэрмічнай апрацоўцы і вяленні захоўваюцца.

Пры паездцы ў далёкія, асабліва трапічныя краіны, важна памятаць пра тое, што там вельмі шмат насякомых, укусы якіх таксама здольныя выклікаць алергічныя рэакцыі. У выніку на месцы ўкусу з'яўляецца ацёк скуры, навобмацак гарачы; пачырваненне ці розныя высыпкі, можа пагаршацца агульны стан, павышацца тэмпература.

Небяспечныя і кантактныя праявы. Дапусцім, з раслінамі. Хочаца сарваць прыгожую кветку ці абмахвацца галінкай — і ў наяўнасці алергічная рэакцыя. Уласна кажучы, для Беларусі гэта таксама актуальна. Летам вельмі шмат кантактных праяў з баршчэўнікам. Гэтая высокая, прыгожая расліна так і спакушае, каб да яе дакрануліся. Асабліва да яе цягнуцца дзеці: ламаюць, забаўляюцца з ёй. У выніку такіх кантактаў можа ўзнікнуць так званая таксінаалергічная рэакцыя. Пры ёй з'яўляюцца вялікія пухіры на скуры, участкі запалення ў выглядзе палос у месцах кантакту.

— А ці могуць стаць прычынай алергіі сонца, вада ў вадаёмах?

— Што датычыцца сонца, то яно можа стаць прычынай пэўнага варыянту крапіўніцы. Справа ў тым, што павышаная інсаляцыя выклікае некаторыя змяненні ў арганізме, і на скуры з'яўляюцца высыпкі. Таму людзям, якія ведаюць аб гэтай сваёй праблеме, рэкамендуецца выкарыстоўваць засцерагальныя крэмы, імкнуцца загараць да 12.00 і пасля 17.00 гадзін, калі інсаляцыя зменшыцца. Варта карыстацца тэнтамі, непажадана выходзіць на адкрытае сонца. Будзе лепш, калі адзенне, капелюшы, нават самі тэнты будуць не са штучнага матэрыялу, а з натуральнага: бавоўны, лёну. Менавіта яны перашкаджаюць лішняму сонечнаму апраменьванню.

Цяпер аб вадзе. Напрыклад, марская вада ідзе на карысць пацыентам з дэрматытам. Мы нават рэкамендуем ім паехаць на адпачынак у Крым. Там добрыя натуральныя кліматычныя ўмовы. Калі мора чыстае, яно мае свой лячэбны эфект.

Але іншая справа, калі размова ідзе пра далёкія паўднёвыя краіны. Склад мікрафлоры там у марской вадзе можа спрыяць алергічным праявам. Акрамя таго, і кантакт з некаторымі водарасцямі бывае небяспечным. Што датычыцца закрытых вадаёмаў у Еўропе, то там, на жаль, застаецца актуальнай праблема цыркарыёзу. Ён праяўляецца мясцовай алергіяй — высыпкамі, якія свярбяць, так званы сверб купальшчыка, у месцах укаранення паразіта.

— Алена Усеваладаўна, дзе б вы параілі адпачываць бацькам з дзецьмі-алергікамі?

— Усё залежыць ад таго, якія клінічныя праявы алергіі. І калі ехаць за мяжу, то трэба абавязкова мець на ўвазе, што, магчыма, спатрэбіцца дапамога медыцынскага работніка. Неабходна ведаць, дзе знаходзіцца медустанова, ці ехаць у санаторый, каб спецыялісты маглі аказаць кваліфікаваную дапамогу, асабліва астматыкам. Але перад ад'ездам трэба пракансультавацца ў лечачага ўрача ці алерголага.

Аднак я не прыхільніца таго, каб дзяцей да трох гадоў вазілі на адпачынак далёка. З імі шмат праблем па прычыне адаптацыі. Адбіваецца змяненне клімату і часовых паясоў. Для дзяцей пры гэтым надыходзіць імуна-стрэсавы момант. І на яго фоне іншыя фактары агрэсіі, тыя ж патэнцыяльныя алергены могуць выклікаць алергічныя рэакцыі.

— Як трэба паводзіць сябе на адпачынку ў экзатычных краінах, каб пазбегнуць алергічных рэакцый?

— Перш за ўсё трэба мець пэўныя ўстаноўкі на паводзіны. Ведаць, што можна, а чаго нельга рабіць, асабліва калі размова ідзе пра трапічныя краіны. На экзатычным поўдні шмат насякомых і паразітаў, якія для нас — вялікая рэдкасць. Многія з іх праходзяць лічыначную стадыю развіцця ў вадзе, лічынкі могуць пранікаць праз непашкоджаную скуру. Таму купацца трэба толькі ў кантралюемых вадаёмах, у месцах, дзе гэта дазволена, а не на ўлонні дзікай прыроды.

Для піцця і мыцця садавіны і гародніны трэба выкарыстоўваць толькі бутэляваную ваду.

Абавязкова насіць пантофлі, не хадзіць у незнаёмых месцах басанож, нават калі здаецца, што там чыста. Шэзлонгі, гамакі размяшчаць вышэй над зямлёй.

На мой погляд, лепей заняцца прафілактыкай, чым лячэннем. Не трэба выпрабоўваць свой арганізм, асабліва дзіцячы, і імкнуцца пакаштаваць на экзатычным адпачынку ўсё.

Для купіравання вострых алергічных рэакцый можна ўзяць з сабой супрацьалергічныя прэпараты. Напрыклад, квіфенадзіна гідрахларыд. Аднак я ўсё ж рэкамендую пры кожных высыпках, ацёках мяккіх тканак пракансультавацца ва ўрача, бо зусім верагодна, што гэта можа быць праявай іншых сур'ёзных захворванняў, напрыклад, інфекцыйных, якія патрабуюць спецыфічнага лячэння.

Вольга ШАЎКО.

ДЗЕТКІ І ТАБЛЕТКІ

21 ліпеня ўвечары тры хлопчыкі з вёскі Цяцерына былі шпіталізаваны ў Круглянскую цэнтральную раённую бальніцу. Дыягназ — медыкаментознае атручэнне.

Два 5-гадовыя хлопчыкі і 3-гадовы малы знайшлі ў закінутай хаце пакунак са старымі таблеткамі і пачаставаліся «белымі кружочкамі».

Сярод таблетак (артафен, аскафен, аспірын, парацэтамол і іншыя) былі і такія, якія маглі негатыўна адбіцца на здароўі дзяцей. Таму медыкі вельмі сур'ёзна падышлі да ачышчэння арганізмаў.

Ужо на наступны дзень хлопчыкаў перавялі з рэанімацыі ў педыятрычнае аддзяленне: іх стан урачы цяпер ацэньваюць як здавальняючы. Праз некалькі дзён малых абяцаюць выпісаць дадому пад нагляд сельскіх медыкаў. У раённай бальніцы між іншым узгадалі, што падобны выпадак у тым жа самым месцы быў некалькі гадоў таму: дзеці на сметніку ў Цяцерыне знайшлі таблеткі, і атручэнне за тым часам прывяло да смяротнага выніку.

Алена КАЗЛОВА.

ПАКІНУЛА ГОЛЫМ

У міліцыю звярнуўся брастаўчанін, што жыве ў мікрараёне «Кавалёва». Паводле яго заявы, не такім познім вечарам — а палове дзявятай — на яго напала малазнаёмая жанчына і гвалтам адабрала мабільны тэлефон, 130 тысяч рублёў, 10 долараў. Хуліганка не пакінула бедаку нават кашулі. 40-гадовая рабаўніца затрымана.

Яна СВЕТАВА.

Занатоўкі мастака

Баба Ядзя, бацька і вялікія рэчы

Мне было гады тры, можа крышачку болей, але, хутчэй за ўсё, мне было тры. Перад тым як заснуць, я плакаў, глядзеў на белую абкладзеную кафляй грубку і ціха плакаў. Баба Ядзя суцяшала мяне, гладзіла па галаве і пыталася — чаго я румзаю. Я спрабаваў растлумачыць бабе прычыну свайго страху і, адпаведна, нагоду для слёз. Я тлумачыў, а яна мяне не разумела, яна не разумела, што ўсе рэчы ў пакоі павялічваюцца і пашыраюцца. Шафа, ложак і белая грубка растуць. Яны раздзьмуваюцца і запаўняюць сабою ўвесь пакой. Паветра ў пакоі змяншаецца, мне робіцца цяжка дыхаць, праз гэта я і плачу. Баба Ядзя казала, што рэчы расці не могуць, што мне гэта толькі падаецца, што мне трэба адпачыць, а каб адпачыць, неабходна выспацца. Нават з заплюшчанымі вачыма, я чуў, як рэчы разрастаюцца і грувасяцца. Я плакаў з заплюшчанымі вачыма, і так, у горкіх слязах, засынаў. Раніцай рэчы ніколі не раслі, яны некалькі разоў раслі позна ўвечары. Ужо ў дарослым веку я аднойчы згадаў пра разрастанне рэчаў на ўвесь пакой, і распавёў пра гэта свайму бацьку. Ён сказаў, што ў сваім дзяцінстве таксама бачыў, як растуць рэчы, і гэтаксама моцна спалохаўся гэткага дзіва. Бываюць моманты, калі мне вельмі хочацца вярнуцца ў той дзіцячы стан, хочацца паглядзець, як разрастаецца цёплая, абкладзеная бліскуча-белай кафляю, грубка, хочацца заплакаць...

Дзёма і штучны крышталік

Катаракта прывяла Дзёму ў лякарню. Там замест свайго мутнага яму паставілі ў вока празрысты, але штучны крышталік. Пасля аперацыі доктар забараніў Дзёму тужыцца ў час спраўляння вялікай патрэбы. Ён і не пнуўся... Выйшаўшы з прыбіральні, Дзёма вярнуўся ў палату, дзе вылёжваў тыднёвы рэабелітацыйны тэрмін, і пачуў ад свайго аднапалатніка: «Ты ж не тужыўся, Дзёма?» — «Не!» — «Прасядзеў на ўнітазе паўгадзіны і ні разу не напнуўся?» — «Ні разу!» — «Дык можа ты, Дзёма, нічога і не змог зрабіць?» — «Усё зрабіў, як мае быць! Я ж не вораг сабе...» — «Зрабіць ты, Дзёма, відаць і чуваць, зрабіў, а ваду зноўку не спусціў!» «Устаў, Дзёмка, з ложка і пабег, Дзёмка, спускаць ваду! Толькі не нахіляйся рэзка, бо рэзкі нахіл яшчэ горш, чым пнуцца, Дзёма». Прысаромлены Дзёма пасунуўся з палаты ў прыбіральню, мармычачы сабе ў чорныя вусы: «Чорт, забыўся! Чорт, зноў забыўся! Чорт з ім, галоўнае не забыцца і не патужыцца, бо выскачыць, далібог, выскачыць з вока крышталік, і будзе гамон ды чорныя кропачкі ўваччу!»

Сяржук і маляванне

Дызайнер Сяржук не ўмее маляваць. Чорт бы з ім, чорт бы з ягоным няўмельствам чыркаць па паперы, каб Сяржук не выкладаў менавіта маляванне. А ён, няздара-крываручка, якраз малюнку і спрабуе навучыць студыёзусаў. Як пісаў разумны турак Актай Рыфат пра такога ж крывалёснага недарэку: «Матэматыцы я не абвучаны, але ж служу ў канторы лічбаводам. Абажаю баклажаны ў алеі. Я яе люблю, яна мяне не любіць». Так і Сяржук служыць у канторы настаўнікам малявання. Кантору тую ён ненавідзіць, а студыёзусаў ён лічыць тупарозумнымі. Сваёй вінаватасці ў тым, што студыёзусы не могуць навучыцца маляваць, Сяржук не бачыць. На ягоным месцы, сумленны чалавек... Ды дзе ты бачыў сумленнага чаландрэка? Сумленны выкладчык... Гэта, дакладна, не пра Сержука. Сумленны даўно б пакінуў кантору, але гэты крываногі кантору не пакіне, кантора для яго — адзіная крыніца харчавання. Сяржук з канторы грошы цягне і цягне. Студэнты і бацькі студэнтаў плацяць, бо спадзяюцца за свае грошы атрымаць кавалак навукі, а Сяржук тыя грошы грабе і нікога не вучыць. Мо ён бы і хацеў навучыць маладзёнаў і маладзіц маляваць, але ж не можа. Ён не можа нават жанчыну аголеную намаляваць! На маляванні аголенай жанчыны якраз і правяраецца талент малявальшчыка. Можаш аголеную — малявальшчык, не можаш — ідзі прэч роўненькай дарожкаю. Кепскае стварэнне Сяржук — гнюснае, злоснае і бяздарнае. І бяда не ў тым, што ёсць на свеце дызайнер Сяржук, а бяда ў іншым: у канторах, якія прапануюць за грошы паслугі па навучанні, такіх крывагаловых Сержукоў пераважная большасць. Таму, калі на дарозе навучання твайго ці дзяцей тваіх трапляўся ці трапіўся добры выкладчык, яго трэба слухаць, любіць і шанаваць.

Рэлігійны чалавек і рытуальны чалавек

Той, хто мае глыбокія рэлігійныя пачуцці, можа быць названы рэлігійным чалавекам, што справядліва. Такі чалавек спрабуе свае пачуцці суаднесці з той ці іншай царквою. Цэрквы прапаноўваюць рэлігійнаму чалавеку шэраг рытуалаў. Рэлігійны чалавек можа прыняць рытуалы. У большасці выпадкаў рэлігійныя людзі пагаджаюцца з нейкай колькасцю рытуалаў і ніякіх канфліктаў з царквою ў іх няма. Але ёсць сярод рэлігійных людзей і такія, што бачаць ненатуральнасць і штучнасць царкоўных рытуалаў. Яны бачаць у царкве шмат рытуальных людзей, якія старанна выконваюць правілы, але не маюць у сабе глыбокага рэлігійнага пачуцця. Рытуальныя людзі значна больш паспяховыя ў інстытутах царквы, чым людзі рэлігійныя. Рытуальны чалавек і ў царкве выбудоўвае свае паводзіны рацыянальна і лагічна. Рэлігійны чалавек алагічны, і чым больш моцнае ў яго рэлігійнае пачуццё, тым далей ён стаіць ад рытуальнага чалавека і ад царквы. Мне, як мастаку, аднолькава цікавыя абодва такія чалавекі. Мяне цікавіць сваёй прасветленасцю рэлігійны чалавек, але не менш цікавы для мяне і рытуальны чалавек, бо ён здатны займацца саборабудаваннем.

Адам ГЛОБУС.

Антыкрызісная эканоміка

Георгій ГРЫЦ:

«НАЛЕТА ГІГАНЦКАГА РОСТУ СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ НЕ БУДЗЕ»

Меркаванне шэрагу экспертаў, якім яны дзяліліся летась, што гэты год будзе цяжкім для большасці краін, а ў другім паўгоддзі пачнецца перыяд узнаўлення эканомік, спраўдзіўся часткова. Сапраўды, гэты год аказаўся няпростым, аднак да свайго дна крызіс яшчэ не дайшоў. І хоць беларуская эканоміка ва ўмовах сусветнага крызісу дэманструе нядрэнныя тэмпы, яна адна з нямногіх краін Еўропы, у якой назіраецца рост валавога ўнутранага прадукту, негатыўныя тэндэнцыі ў эканамічным развіцці захоўваюцца. За спінай ужо першае паўгоддзе і ёсць нагода, каб азірнуцца і пагутарыць пра нейкія вынікі. Па каментарый адносна сучасных умоў сацыяльна-эканамічнага развіцця мы звярнуліся да вядомага эксперта, намесніка дырэктара Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Георгія ГРЫЦА.

— На нарадзе ў Прэзідэнта па бягучых пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў мінулую пятніцу называліся найбольш вострыя праблемы, якія цяпер існуюць, — кажа Георгій Грыц. — Узгадаем тое ж падзенне паказчыкаў у знешнеэканамічнай дзейнасці, у першую чаргу, падзенне па экспарце, якое перавышае падзенне па імпарце. Вялікая праблема — затаварванне складоў, праблемы ў бюджэтаўтваральных прадпрыемствах, якія найбольш пацярпелі ад глабальнага крызісу. Як мне падаецца, гэтая дастаткова складаная сітуацыя ўзнікла з-за таго, і гэта ўжо прызналі асобныя міністры эканамічнага блока, што напачатку былі зроблены памылкі адносна тэрмінаў заканчэння крызісу. У прыватнасці, міністр эканомікі адзначыў наступнае: спадзяванні Урада, што ў першым квартале крызіс пройдзе свой пік, а затым пачнецца плаўнае ўзнаўленне попыту на знешніх рынках, ад якіх Беларусь вельмі залежыць, было памылковым пунктам гледжання. Крызіс мае больш сістэмны доўгачасовы характар. На маю думку, як вынік, і захады, што рабіліся, неабходна стымуляваць адкладзены попыт, і не пераглядаць заданне, плануючы паказчыкі, якія былі выдадзены яшчэ ў дакрызісны перыяд з улікам, што ў другім квартале гэты попыт узнікне і неліквідная прадукцыя рэалізуецца, гэта была, на мой погляд, сістэмная памылка. На жаль, яна не настолькі бяскрыўдная, як падавалася на той перыяд, ці падаецца цяпер.

— Вы маеце на ўвазе тое, што імкненне забяспечыць валавыя паказчыкі пры адсутнасці попыту прывяло да праблемы затаварвання складоў?

— Самае сумнае, што былі поўнасцю выбіты і абаротныя сродкі: прадпрыемствы працягвалі плаціць зарплату, закупляць імпарт і пры адсутнасці рэалізацыі ўсё заставалася на складах. Таму сёння трэба дастаткова смела перагледзець сітуацыю. Дастаткова прынцыповае пытанне — тыя прыярытэты, што выцягнуць эканоміку ў гэтых умовах, і на якія спадзяецца Урад. У асноўным гэтыя прыярытэты накіраваныя на стымуляванне ўнутранага попыту. Гэта жыллёвае будаўніцтва, стымуляванне спажывецкага рынку.

— Важнай падаецца і сітуацыя і ў агракомплексе, паколькі гэтая галіна вызначае харчовую бяспеку краіны.

— Але справа ў тым, што гэтыя захады, на маю думку, не зусім адназначныя. Калі, напрыклад, узяць апошнія каментарыі намесніка старшыні праўлення Нацыянальнага банка Паўла Калаура, то ён таксама выказвае сумненні наконт таго, што ўнутраны попыт можа быць заменай тым стратам, якія панесла беларуская прамысловасць. Таму што, калі прадаць тую ж вырабленую тэхніку — вялікагрузныя аўтамабілі, трактарную прадукцыю і спажывецкія тавары на беларускім рынку (а ўсе ведаюць, што ў нас у рублі выраблены прадукцыі каля 70 капеек — імпартная прадукцыя, уключаючы тыя ж энергарэсурсы), усё адно беларуская грашовая маса ляжа на валютную біржу. У нас на БВФБ ужо сёння ў разы попыт на валюту перавышае прапанову. Значыць, узнікне гіганцкі адкладзены попыт.

«Трэба рыхтавацца да таго, што ўмовы знешнеэканамічнай кан'юнктуры ў 2010 годзе будуць такія ж, як і ў гэтым годзе.

— А што датычыцца будаўніцтва, на якое ўскладаюцца вялікія надзеі: менавіта будаўніцтву жылля надаецца асаблівая ўвага як вельмі важнаму фактару стабілізацыі?

— Пры тых гіганцкіх інвестыцыях, якія ўжо ўкладзеныя ў будаўніцтва, для мяне трывожнымі з'яўляюцца два сімптомы. Па-першае, чамусьці гіганцкія інвестыцыі ў будаўніцтве не выклікалі такі ж ажыятажны попыт на будматэрыялы. Па справаздачных пяці месяцах беларуская прамысловасць будматэрыялаў паказала падзенне. Трывожна і тое, што няма попыту на беларускія будматэрыялы. Калі казаць пра адкладзены попыт, возьмем звесткі та запатрабаванасці на само жыллё. Апошнія аўкцыёны, што правёў Мінгарвыканкам, паказалі, што жыллё, якое ўжо пабудавана і па цэнах фактычна на 5-10 працэнтаў перавышае сабекошт, засталося нерэалізаваным. Значыць, надзеі, што ў насельніцтва ляжаць мільярды долараў, як многія кажуць у «панчохах», і што яно сёння кінецца купляць жыллё, таксама выклікаюць сумненні. Тыя, у каго гэтыя грошы ёсць, цяпер ужо забяспечаныя жыллём, а тыя, у каго гэтых грошай няма, — дзе іх узяць? Браць крэдыты, але іх трэба вяртаць за кошт сваіх даходаў. Але гэтых даходаў няма, таму што няма вытворчасці.

«Ва ўмовах крызісу асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на пытанне эканоміі сродкаў.

Таму малой крывёй выйсці з гэтай сітуацыі, мяркуючы, наўрад ці ўдасца. Крызіс ёсць крызіс, і, як кажа Прэзідэнт, ва ўмовах крызісу асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на пытанне эканоміі сродкаў. А ў выніку эканоміі хтосьці павінен пацярпець, недаатрымаць. Нарэшце, патрэбна адрасная падтрымка якімсьці прарыўным галінам. Стандартныя антыкрызісныя інструменты, якія выкарыстоўваў прэзідэнт Рузвельт, аўтаматычна пераносіць на Беларусь неразумна, таму што ў нас зусім іншыя структуры эканомік, зусім розныя структуры насельніцтва: у нашай краіне 10 мільёнаў насельніцтва, у ЗША да Вялікай Айчыннай было некалькі больш за 200 мільёнаў.

Таму трэба знайсці прыярытэтныя галіны. Айчынная эканоміка мае ярка выражаны прамысловы напрамак, і захаванне вытворчага патэнцыялу справядліва лічыцца нашай заслугай. Аднак інвестыцыйны цыкл, укладанне інвестыцый у прамысловасць, у прамыслова-інвестыцыйныя праекты, як правіла, складае 5-7 гадоў. Толькі ў выпадку, калі мы зараз вызначым гэтыя прыярытэты, будзем аказваць ім адрасную падтрымку, у тым ліку на ўзроўні падаткаабкладання, выдачы льготных крэдытаў, тады гэты інвестыцыйны тэрмін можна звузіць у два-тры разы. На ўсіх сродкаў не хопіць.

У некаторай ступені прыярытэтныя праекты вызначаныя, але вызначаныя як напрамак, напрыклад, біяэлектроніка. Але трэба весці гутарку аб канкрэтных інвестыцыйных праектах, з канкрэтнымі бізнэс-планамі. Іх сёння не хапае. Таксама неабходна, каб гэтыя праекты не былі замкнутыя, каб прадпрыемствы пацягнулі за сабой сумежныя галіны.

Трэба разумець, што крызіс сам па сабе не скончыцца, і гэты крызіс будзе мець у лепшым выпадку сярэднетэрміновую перспектыву. Паводле прагнозу эканамістаў, налета істотнага росту сусветнай эканомікі не будзе. І трэба рыхтавацца да таго, што ўмовы знешнеэканамічнай кан'юнктуры ў 2010 годзе будуць такія ж, як і ў гэтым годзе.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

КАБЕЛЬ ПАЙШОЎ НАЛЕВА

Супрацоўнікамі КДБ па Гомельскай вобласці затрымана група, якая займалася крадзяжом таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на шэрагу прадпрыемстваў энергетычнай галіны Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Следчым аддзелам заведзена 21 крымінальная справа, фігуранты якіх — 19 грамадзян. Сярод іх — адказныя асобы і тыя, хто дапамагаў рэалізоўваць скрадзенае.

Грамадзяне падазраюцца ў тым, што на працягу 2005—2009 гадоў сістэматычна выкрадалі з прадпрыемстваў кабельную прадукцыю і іншыя электратэхнічныя вырабы. Спачатку яны незаконна замяняліся або спісваліся. Потым скрадзенае рэалізоўвалі суб'ектам гаспадарання розных формаў уласнасці — як за наяўныя сродкі, так і шляхам паставак ад імя лжэпрадпрымальніцкіх структур. Атрыманыя грашовыя сродкі размяркоўваліся паміж членамі групы ў адпаведнасці з роляй кожнага. Сярод злачынцаў — майстры і кіруючыя работнікі будаўніча-мантажных упраўленняў: яны займаліся рамонтам і мадэрнізацыяй электраліній у сельскай мясцовасці. За год па дакладнай схеме яны выкралі і перапрадалі матэрыялаў і абсталявання больш чым на 100 мільёнаў рублёў. Арганізатары крымінальнага бізнэсу не былі супрацоўнікамі энергагаліны.

Як паведамляе прэс-служба ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці, у ходзе следства падазроныя часткова кампенсавалі прычыненыя страты. На разліковыя рахункі прадпрыемстваў пералічана каля 48 мільёнаў беларускіх рублёў. Гандлярам дзяржаўнай маёмасцю суд можа даць да 12 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ІДЭІ — У НАДЗЁННЫХ СПРАВАХ

— Побач з хатай, дзе мая бабуля нараджала маю маці, стаяла гармата і была перадавая лінія. Вайна прайшла праз лёс кожнага з нас і сёння галоўнае, калі мы пачынаем з моладдзю весці гутарку аб вайне, каб гэта не было зафармалізавана. Бо часам бывае страшна, калі яны кажуць, што Міхаіл Кутузаў або Багдан Хмяльніцкі — героі Вялікай Айчыннай...

Наша размова са старшынёй Гомельскага абласнога аб'яднання «Белая Русь», членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, рэктарам Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі, кандыдатам эканамічных навук, дацэнтам Алай Аляксандраўнай Навумчык пачалася з тэмы, якая не страчвае актуальнасці для грамадства.

— Мы вырашылі, што наша грамадская арганізацыя можа правесці акцыю па дапамозе ветэранам Айчыннай вайны. Намеснік старшыні прэзідыума Гомельскай абласной арганізацыі «Белая Русь», дырэктар ААТ «Электраапаратура» Віктар Жыгар адшукаў магчымасць да свята Незалежнасці праспансіраваць уручэнне газавых пліт тым ветэранам, каму яны патрэбныя. І адначасова мы дамовіліся з раённымі аддзяленнямі гаргазу аб бясплатным іх падключэнні.

— У людзей, зацікаўленых у тым, каб Беларусь была моцнай, няма сумненняў, што моладзь павінна цікавіцца гісторыяй сваёй радзімы і сваёй сям'і. Застаецца пытанне — як гэта зрабіць?

— У Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, рэктар якога Веніямін Сянько ўзначальвае раённую структуру нашага грамадскага аб'яднання, вялікая практыка работы з моладдзю. Яны займаюцца добраўпарадкаваннем могілак, у тым ліку брацкіх, у невялікіх населеных пунктах. Ведаеце, якое гэта выхаваўчае значэнне мае! Калі чалавек бачыць на помніку сваё прозвішча, ён цікавіцца: хто гэта, ці не сваяк? Вось гэта наша гісторыя... Акрамя таго, студэнты, навучэнцы школ хадзілі да ветэранаў. З фотаздымкаў сямейнага архіва зрабілі экспазіцыю. Маладыя бачаць гэтыя чорна-белыя фатаграфіі і разумеюць: жыццё такое хуткацечнае, такія прыгожыя былі іх прадзеды... Адзін з ветэранаў, Аляксандр Аляксандравіч Сянкевіч, расказаў нам, што ён пасадзіў у агародзе радок з цюльпанамі ў гонар загінулых сяброў. Вы б бачылі, як ветэраны захоўваюць кожную паштоўку, якую атрымліваюць. Так разумееш, што гэтыя паштоўкі абыякава пісаць нельга — для кожнага ветэрана гэта сур'ёзная эмацыянальная падтрымка. Асабістыя сустрэчы са сталымі людзьмі даюць імпульс для моладзі. У нас была дзяўчынка — карэспандэнт студэнцкай газеты. Яна хадзіла да ветэрана, каб пра яго напісаць. Потым закончыла ўніверсітэт, працуе ў Магілёве, а нядаўна прыехала да гэтага ветэрана і кажа: ён жа мне як дзядуля! Яму гэта таксама прыемна. У іншага ветэрана былі, у Рыгора Рыгоравіча Паўлава. Ён сляпы. Пытаецца: «Вы мяне прымаеце ў сваю арганізацыю?» Адказваю: «Так». «Калі плаціць узносы? Я гатовы». Ветэраны ў нас вельмі актыўныя, ім вельмі важна мець станункі і таму мы іх усіх прымаем у нашу арганізацыю. Але ж я да гэтага часу не ведаю, як ад іх браць узносы.

Грамадская прыёмная Гомельскага абласнога аб'яднання «Белая Русь» працуе непасрэдна на рынку: Ларысу ШАШАРУК кансультуе начальнік сектара па працы з індывідуальнымі прадпрымальнікамі Гомельскага цэнтральнага рынку Канстанцін РАДЗЕВІЧ.

— Толькі ў кастрычніку мінулага года адбыўся першы з'езд, на якім была прынята праграма Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання. Пакуль рана казаць аб выніках, але ж: па якіх справах яшчэ можна пазнаць «Белую Русь»?

— Мы імкнёмся браць актыўны ўдзел у самых розных мерапрыемствах. Напрыклад, для кадэтаў, якія выхоўваюцца ў Гомельскім ліцэі МНС, будучых аборонцаў Айчыны, мы арганізавалі майстар-клас са спартсменамі футбольнай каманды Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі, якая гуляе ў вышэйшай лізе па міні-футболе. Безумоўна, хлопцы былі ўражаныя: ёсць на каго раўняцца.

— Грамадская прыёмная Гомельскага абласнога аб'яднання «Белая Русь» працуе з прадпрымальнікамі. Прадпрымальнікі — самая дынамічная, прасунутая, творчая, але ж і самая складаная частка насельніцтва. Чаму вы выбралі пачаць з іх?

— Калі мы абмяркоўвалі магчымыя напрамкі і формы работы ў грамадстве нашага грамадскага аб'яднання, у якасці адной з формаў выбралі грамадскую прыёмную. У пачатку гэтага года мы зразумелі, што можам быць карыснымі менавіта для гэтай катэгорыі людзей. Тады быў прыняты цэлы пакет дакументаў адносна лібералізацыі эканамічнага жыцця ў рэспубліцы. Гэта і спрошчаная схема рэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў, і змяненні ў падаткаабкладанні, і пэўныя спрашчэнні ў мытным афармленні грузаў, якія паступаюць з трэціх краін праз Расію... Каб растлумачыць прафесійна і проста гэтыя дакументы, мы вырашылі правесці такую грамадскую прыёмную.

— Своеасаблівы лікбез?

— Так. З улікам таго, што ў нашай пярвічнай арганізацыі ёсць спецыялісты ў галінах падаткаабкладання, права і фінансаў. На цэнтральным рынку мы праанансавалі гэтае мерапрыемства. У першы прыём было толькі 2 чалавекі. А потым людзі прыносілі свае таваратранспартныя накладныя і пыталі: што мне дасць пераход на спрошчаную сістэму падаткаабкладання? І мы разам разлічвалі і паказвалі, што пры тым жа аб'ёме дзейнасці па спрошчанай сістэме вы заплаціце столькі, а па традыцыйнай схеме сума падатку будзе іншая. У першым выпадку вам трэба вось столькі дакументаў і дзеянняў зрабіць, у іншым — другі алгарытм дзеянняў. Калі ўсё проста расказваеш, людзі адразу разумеюць. Былі розныя пытанні. Адзін прадпрымальнік не мог перавезці праз мяжу расійскія грошы, не аформіўшы гэта адпаведным чынам. Ён быў вельмі ўзбуджаны. Калі з вуснаў незалежных экспертаў пачуў, што не так складана аформіць усё правільна, ён супакоіўся. Відаць, патрэбны такі трэці погляд, каб чалавек зразумеў, што закон не супраць яго. У рабоце грамадскай прыёмнай Гомельскага абласнога аб'яднання «Белая Русь» быў усплёск, а потым наведвальнікаў стала некалькі менш. Адначасова мы цікавіліся, як ідзе рэгістрацыя індывідуальных прадпрымальнікаў. Калі была спрошчана схема падаткаабкладання, значна павялічылася колькасць рэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў. Потым сітуацыя стабілізавалася.

Старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання «Белая Русь» Ала НАВУМЧЫК з ветэранам вайны Аляксандрам СЯНКЕВІЧАМ.

— Думаю, нарматыўных дакументаў будзе яшчэ шмат прымацца, і ў вас непачаты край работы...

— Так. У абласной арганізацыі сёння налічваецца 3,5 тысячы чалавек. Асабліваясь аб'яднання «Белая Русь» у тым, што яно, у адрозненне ад многіх іншых, не нацэлена на пэўны сегмент у грамадстве. Гэта і ветэраны, і моладзь, гэта людзі актыўнага ўзросту. Аб'ядноўвае гэтых людзей імкненне стварыць квітнеючую краіну. Мы аб'ядноўваемся для таго, каб нам з вамі жылося камфортна. Наша грамадскае аб'яднанне стараецца забяспечыць дыялог з існуючай уладай і актыўна садзейнічаць працвітанню роднай Беларусі.

Гутарыла Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота з архіва Гомельскага абласнога аб'яднання «Белая Русь».

Беларусь і ЕС

«УСХОДНЯЕ ПАРТНЁРСТВА» — ГЭТА ВАМ НЕ БУЛКА З РАЗЫНКАМІ

Днямі ў мінскай гасцініцы з сімвалічнай назвай «Еўропа» для правядзення мерапрыемства па тэме стасункаў з краінамі Еўрапейскага Саюза прайшла сустрэча нямецкіх і беларускіх партнёраў. Выступіць на ёй у якасці галоўнага дакладчыка пагадзіўся дзяржаўны сакратар па справах федэрацыі і еўрапейскага супрацоўніцтва зямлі Брандэнбург Герд Хармс. Ва ўрадзе зямлі ён адказвае за пытанні еўраінтэграцыі.

Частыя госці з Брандэнбурга

Трэба адзначыць, што апошнім часам з гэтай зямлёй у нас складваюцца дзелавыя і сапраўды партнёрскія стасункі. Узнікае ўражанне, што з Брандэнбургам «Усходняе партнёрства» развіваецца па сваім сцэнарыі. Адносна нядаўна, у красавіку гэтага года, адбыўся візіт у нашу краіну прэм'ер-міністра гэтай федэральнай зямлі Маціяса Платцака. Акрамя афіцыйнай праграмы, ён выступіў з лекцыяй у Мінскім адукацыйным цэнтры імя Іаганэса Рау (МАЦ) на тэму «Рэгіянальнае супрацоўніцтва ў Еўропе». Тады кіраўнік федэральнай зямлі даволі пераканаўча гаварыў аб тым, што агульнае мінулае немцаў і беларусаў можа і павінна стаць урадлівай глебай для ўсталявання лепшага разумення паміж краінамі. Тым больш што сёння для гэтага адкрываюцца новыя перспектывы.

Герд Хармс літаральна за некалькі гадзін да размовы ў «Еўропе» таксама выступіў з дакладам у МАЦ. Яго тэмай ён абраў аднаўляльныя крыніцы энергіі і еўрапейскія, нацыянальныя і рэгіянальныя аспекты яе выкарыстання. Ён, у прыватнасці, прывёў цікавае параўнанне: ва ўсходняй Германіі, як і ў Беларусі, 20 гадоў таму ў ацяпляльны сезон таксама для рэгулявання тэмпературы ў пакоях адчынялі вокны. Сёння ж больш за 40% выпрацоўваемай у Брандэнбургу электраэнергіі прыходзяцца на аднаўляльныя крыніцы энергіі, а энергаэфектыўнасці надаецца важнае значэнне. У Беларусі ёсць умовы для выкарыстання розных відаў альтэрнатыўных крыніц энергіі, укаранення інавацыйных падыходаў і метадаў, развіцця беларуска-нямецкага супрацоўніцтва ў гэтай сферы.

За частаколам агульных слоў

— Я вельмі рады, што ваша краіна стала частка «Усходняга партнёрства», што яна пагадзілася далучыцца да гэтай праграмы, — пачаў сваё выступленне нямецкі палітык. На яго погляд, у Беларусі і Германіі ёсць шмат пунктаў перакрыжавання інтарэсаў. Але ён прапанаваў прысутным разам з ім паглядзець на новую праграму Еўрапейскага Саюза з пункту погляду зямлі Брандэнбург.

У час сустрэчы неаднойчы здавалася, што сама праграма пакуль існуе толькі на паперы і ў агульных рысах. Адсюль, відаць, адсутнасць канкрэтыкі. Можа, таму ў дакладзе Герда Хармса і ў яго адказах на пытанні пераважалі тэзісы і разважанні агульнага плана: «Гэта праграма — працягнутая рука, каб аказаць падтрымку краінам-партнёрам». «Усходняе партнёрства» — своеасаблівы інструмент для дасягнення больш цеснай кааперацыі паміж яе ўдзельнікамі. Яна — працяг той палітыкі добрасуседства, якую ЕС пачаў праводзіць яшчэ некалькі гадоў таму».

Мне, напрыклад, больш за ўсё спадабалася слушная думка аб тым, што «Усходняе партнёрства» — гэта не булка з разынкамі, з якой іх можна выкалупліваць і ласавацца. А таму будзем памятаць, што разынкамі Еўропа не раскідваецца. За частаколам агульных слоў госць даў зразумець, што не варта мець празмерных чаканняў ад новай ініцыятывы ЕС.

Відаць, з гэтай нагоды Герд Хармс звярнуў увагу на тое, што не трэба разглядаць «Усходняе партнёрства» і як пэўны крок, за якім з'яўляецца рэальная перспектыва членства ў Еўрапейскім Саюзе. Аднак праграма не выключае сумеснай работы з мэтай паступовага ўступлення ў ЕС. Час пакажа, а пакуль будзем развіваць ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. У гэтым сэнсе праграма дае дадатковыя шанцы. Напрыклад, гарманізацыя адносінаў у сферы эканомікі і як вынік — маючае адбыцца заключэнне пагаднення аб зоне свабоднага гандлю. Таксама вельмі карысным будзе запланаванае падпісанне пакту аб стабільнасці і бяспецы, разгортванні сумеснай работы па супрацьдзеянні карупцыі, наркатрафіку і нелегальнай міграцыі. І, магчыма, пры спрыяльным развіцці падзей стане рэальнай дамова аб бязвізавых паездках грамадзян краін-удзельніц «Усходняга партнёрства», што ў сваю чаргу дазволіць больш свабодна функцыянаваць рынку працоўнай сілы Еўропы.

Вельмі важнай часткай «Усходняга партнёрства» стане распрацоўка палітыкі энергетычнай бяспекі як у Еўрасаюзе, так і ў краінах, якія знаходзяцца на ўсходзе ад яго. Каб не паўтарыліся выпадкі, накшталт леташняга, напрыклад, калі з-за канфлікту Украіны і Расіі моцна пацярпеў зімой шэраг краін, асабліва Балгарыя.

У рамках «Усходняга партнёрства», падкрэсліў Герд Хармс, мяркуецца весці дыялог на чатырох платформах. Яны датычацца такіх фундаментальных рэчаў, як прасоўванне дэмакратыі, падтрымка рынкавай эканомікі, заахвочванне свабоднага гандлю, адказнае кіраванне дзяржавай, забеспячэнне стабільнасці, абарона правоў чалавека.

Расія разлічвае на прывілеяваны статус

Як вядома, ідэя праграмы «Усходняе партнёрства» ўзнікла па ініцыятыве польскіх і шведскіх дыпламатаў. Па сутнасці, яна з'яўляецца дамовай паміж Еўрапейскім Саюзам і Украінай, Малдовай, Азербайджанам, Арменіяй, Грузіяй і Беларуссю. Аднак Расія з раздражненнем і з пэўнай падазронасцю ўспрыняла абвяшчэнне «Усходняга партнёрства». Першыя крокі па ажыццяўленні праграмы выклікалі ў Крамлі крытыку, маўляў, Брусель за спінай Масквы вядзе нейкую малазразумелую гульню супраць Расіі. Дасталося і Беларусі, якую асобныя расійскія палітыкі нават спрабавалі абвінаваціць у здрадзе саюзніцкаму абавязку, двайных стандартах і г.д. Таму невыпадкова Герда Хармса спыталі: чаму Расію не запрасілі да ўдзелу ва «Усходнім партнёрстве»?

— Еўрасаюз зрабіў такую прапанову Маскве, але яна адмовілася. Чаму? Відаць таму, што свае стасункі з Еўрасаюзам Расія разглядае як адносіны асаблівага роду, імкнецца да прывілеяванага становішча ў сістэме еўрапейскага партнёрства. Таму расійскі бок адхіліў прапанову далучыцца да «Усходняга партнёрства». Зараз з гэтай нагоды ў Расіі ідуць дыскусіі на тэму: якім чынам будзе надалей развівацца яе партнёрства з Еўропай. У Расіі, відаць, нямала палітыкаў, якія мысляць катэгорыямі сфер уплыву. А ідэя «Усходняга партнёрства», падкрэслю, не мае на мэце ўмацаванне свайго ўплыву ў суседніх краінах, размова ў першую чаргу ідзе аб умацаванні адносінаў з суседзямі. «Усходняе партнёрства» ні ў якім разе не з'яўляецца спробай стварыць нейкую сферу ўплыву насуперак інтарэсам Расіі», — сказаў Хармс. Такі вось адказ Бруселя Маскве праз Брандэнбург.

Халявы, панове, не будзе

Натуральна, прысутных цікавіла пытанне: якая нам будзе карысць ад «Усходняга партнёрства»? У тым ліку і фінансавая. На рэалізацыю праграмы мяркуецца выдаткаваць недзе крыху больш за 700 мільёнаў еўра. Хаця, як адчувалася на тоне размовы ў «Еўропе», гэта не канчатковая лічба. Бюджэт праграмы разлічаны на некалькі гадоў. Ды і няма пакуль дакладных прапаноў і правілаў карыстання яго сродкамі. Так, па словах Герда Хармса, не трэба разлічваць на тое, што кожная краіна будзе мець свой рахунак, свабодна здымаць і траціць грошы, як ёй захочацца. Каб іх атрымаць (а размова ідзе аб мільёнах еўра, якія нялішнія ў ЕС), трэба ўдзельнікам праграмы дакладна распрацаваць свае канкрэтныя нацыянальныя праекты, а затым правесці прадметныя перамовы з Бруселем па іх фінансаванні. Удзельнікі павінны вызначыцца з колам сваіх прапаноў і познаёміць з імі Еўрасаюз.

Карац

ЁСЦЬ ШТО БУДАВАЦЬ І Ў СЯБЕ

Так гавораць будаўнікі Бярэзінскай ПМК-182, адмаўляючыся ад пагоні за доўгім рублём у чужых мясцінах

Дырэктар Бярэзінскай ПМК-182 Сяргей ГАБЕЦ.

Жывёлагадоўчы комплекс — адзін з найбольш важных аб'ектаў калектыву. На здымках: будаўнікі Вадзім ПАПОВІЧ, Уладзімір АЎЧАРЭНКА, Віталь АСТАПЧЫК, Генадзь СЛАБКО, Аляксандр МІШУК, Уладзімір ВОЛКАЎ, Віктар ПАШКЕВІЧ, Аляксандр ПАХВАЛЁНЫ, якія заняты на ўзвядзенні комплексу; агульны выгляд аднаго з памяшканняў комплексу; рабочыя моманты — на мантажы канструкцый даху, з тэадалітам — Сяргей АЎЧАРЭНКА.

Бярэзінская ПМК-182 (ПМК — перасоўная механізаваная калона) з'яўляецца даччыным прадпрыемствам УП «Мінскаблсельбуд». Асноўны від дзейнасці — выкананне будаўнічых і іншых спецыяльных мантажных работ, мехкалона мае таксама ліцэнзіі на ўнутрырэспубліканскія аўтамабільныя перавозкі грузаў, на дзейнасць па нарыхтоўцы і перапрацоўцы драўніны. У склад арганізацыі ўваходзяць раствора-бетонны вузел, піларамны і сталярны цэхі, аўтагаспадарка, будаўнічыя ўчасткі.

Апошнім часам у ПМК-182 высокімі тэмпамі нарошчваюць аб'ёмы будаўнічых работ. Так, за мінулы год тут выканалі іх уласнымі сіламі (выкананне работ уласнымі сіламі — гэта найбольш адметны паказчык, які характарызуе дзейнасць той ці іншай будаўнічай арганізацыі, пры існаванні такога інтэграванага для будаўнікоў паказчыка, як генеральны падрад) на 7897 мільёнаў рублёў, што склала 186 працэнтаў адносна папярэдняга года, за студзень—май гэтага года — на 4825 мільёнаў (рост да адпаведнага перыяду мінулага года — 206 працэнтаў). Задача, што ставіць перад сабой у ПМК-182, — выйсці за год на аб'ёмы работ уласнымі сіламі на 9,8 мільярда рублёў.

У ПМК-182 узводзяць аб'екты як прамысловага прызначэння (пераважна — сельскагаспадарчыя), так і аб'екты сацкультбыту, жылыя дамы. З 2004 года тут працуюць над выкананнем добра вядомай рэспубліканскай праграмы па адраджэнні вёскі, і ў першую чаргу па будаўніцтве для яе працаўнікоў індывідуальных дамоў, узвядзенні аграгарадкоў. За мінулы год ПМК-182 пабудавала 24 індывідуальныя дамы ў розных сельскагаспадарчых кааператывах раёна, а таксама ўвяло ў горадзе Беразіно шматкватэрны дом для жыллёва-будаўнічага кааператыва. Усяго, пачынаючы з 2004 года, працаўнікі вёскі атрымалі ад ПМК-182 каля 200 індывідуальных дамоў разам з неабходнымі гаспадарчымі пабудовамі.

Разам з нарошчваннем аб'ёмаў будаўнічых работ у ПМК-182 значна павялічылі свой колькасны склад. Калі ў 2004 годзе тут працавалі 123 чалавекі, то на пачатак гэтага года — 205, цяпер жа працуюць 239 чалавек. Прычым пры няўхільным павелічэнні колькаснага складу апераджальнымі тэмпамі павялічваецца прадукцыйнасць працы. Так, у мінулым годзе сяроднямесячная выпрацоўка на аднаго чалавека да ўзроўню папярэдняга года склала тут больш за 162 працэнты ў дзеючых цэнах і амаль 138 — у супастаўных.

У ПМК-182 немалую ўвагу надаюць пытанням энергазберажэння. За мінулы год і за першы квартал гэтага года паказчыкі па энергазберажэнні склалі, адпаведна, мінус 19 і мінус 15 працэнтаў.

На адным з памяшканняў вялізнай вытворчай базы ПМК-182 захаваўся цікавы плакат, можа — яшчэ з савецкага часу. Ва ўсякім разе ніхто тут не памятае, колькі ўжо таму плакату. А на плакаце — гэткі строгі, яўна майстар савецкага складу, які глядзіць з-пад акуляраў і гэтак хітра пытаецца: «А як ты сёння працаваў?».

Вельмі актуальнае для сённяшняга дня пытанне, калі мець на ўвазе і крызіс, і звязаныя з ім скарачэнні працоўнага часу на многіх прадпрыемствах, і іншыя не зусім прыемныя рэчы. Можна меркаваць, працаўнікоў ПМК-182 ніколькі не палохае гэта пытанне, яны могуць смела глядзець у вочы гэтаму строгаму майстру на плакаце. Летні час — ужо сам па сабе гарачы для будаўнікоў. А калі яшчэ і заказаў — незлічона... «Забяспечаны заказамі на гэты год ажно на 200 працэнтаў, — менавіта так і падкрэсліў падчас гутаркі дырэктар Бярэзінскай ПМК-182 Сяргей Габец. — І ўсе абавязкова трэба выканаць. І ўсе — своечасова».

Безумоўна, найбольш важны і найбольш важкі аб'ект для будаўнікоў Бярэзінскай мехкалоны — гэта буйная малочнатаварная ферма на 600 галоў, якая ўзводзіцца непадалёк ад горада. Заказчык МТФ — раённы аграсэрвіс, а ўзводзіцца яна ў адпаведнасці са спецыяльнай рэспубліканскай праграмай, складзенай у мінулым годзе і згодна з якой у рэспубліцы намечана ўзвесці 118 новых буйных МТФ. Тэрмін здачы гэтых МТФ — да 1 кастрычніка гэтага года, у тым ліку, зразумела, і бярэзінскай. Гэта маштабны і ў многім унікальны аб'ект, які ўзводзіцца на сучасным праекце, на якім прадугледжаны самыя перадавыя тэхналогіі ўтрымання жывёлы. Пра яго маштабнасць і ўнікальнасць добра сведчыць ужо такая лічба: агульная плошча тэрыторыі толькі для вытворчых памяшканняў — месцаў для ўтрымання жывёлы, даільнай залы, кормападрыхтоўчага аддзялення, ёмістасцяў для збору ліўневых сцёкаў і г.д. — зойме каля 5 гектараў. Зразумела, на гэтым аб'екце прадугледжаны і сучасныя праектныя рашэнні, і сучасныя будаўнічыя тэхналогіі.

— Ну вось, уверсе даху прадугледжаны ліхтар дзённага святла, які праходзіць уздоўж усяго даху і выкананы з празрыстага сучаснага матэрыялу полікарбанату, — тлумачыў тонкасці гэтых тэхналогій старшы прараб Вадзім Станчык. — Сам дах — трохслаісты, з металапрофілю і з уцяпляльнікам паміж слаямі металапрофілю...

Як ён таксама зазначаў, гэты аб'ект у яго немалой практыцы першы па такой маштабнасці і ўнікальнасці. І не толькі ў яго, але і ў самой ПМК, і ў раёне. І ў цэлым гэты аб'ект стаў для будаўнікоў ПМК-182 добрай школай. Тым не меней, нягледзячы на тое, што пры яго ўзвядзенні бярэзінскія будаўнікі з многім сутрэліся ўпершыню, яны поўнасцю ўкладваюцца ў неабходны графік, і па гатоўнасці гэтага жывёлагадоўчага комплексу да здачы ці дакладней — да здачы першай чаргі лідзіруюць у вобласці. «Працуем па падоўжаным графіку да 19 гадзін, прыхопліваем выхадныя», — расказваў Вадзім Станчык. Дарэчы, у яго будаўнічай практыцы (як і ў практыцы многіх іншых будаўнікоў, што працуюць цяпер у ПМК-182, і пра гэта — ніжэй) здарыўся ў свой час немалы перарыў — па прычыне адносна невысокай на той час запатрабаванасці будаўнікоў ды іх адносна невысокай заработнай платы.

Васіль Ільіч БАБАВОЗ — старэйшы механізатар ПМК з багатым вопытам, адзначаны шматлікімі ўзнагародамі. Нядаўна яму споўнілася 72 гады. Фотаздымак унізе зроблены ў момант, калі да паважанага ветэрана з віншаваннямі падышлі маладыя тынкоўшчыкі Аляксей ЖАЎНЯРОВІЧ і Дзмітрый ЖУКОЎСКІ. Здымак уверсе знаёміць нас з брыгадай маляроў-тынкоўшчыкаў у складзе Тамары СЫСКАВЕЦ (брыгадзір), Тамары УСАВАЙ, Кацярыны ПАТАЛЕЙ, Святланы НАВІЦКАЙ, Валянціны ЗАЗЕРСКАЙ. Побач вы бачыце новую праваслаўную царкву і дом для шматдзетных сем'яў у райцэнтры — гэта таксама будаўнічыя аб'екты Бярэзінскай ПМК, якія ўпрыгожылі горад.

— Займаўся нарыхтоўкай лесу, — расказваў Вадзім Станчык.— Але ж я будаўнік. Тут добра бачыш сваю працу, нешта канкрэтнае пасля цябе застаецца. Ды і цяперашні час выправіў ранейшую памылку, паставіў запатрабаванасць будаўнікоў ды іх заработную плату на належнае месца...

* * *

Калі мы пакідалі гэты аб'ект, старшы інспектар аддзела кадраў ПМК-182 Тамара Жукоўская, наш гід, гаварыла: «Проста не верыцца, што столькі зроблена. Калі пачыналі гэты комплекс зімой, тут жа голае заснежанае поле было...». А яшчэ яна называла прозвішчы прараба Васіля Пашкевіча, майстра Паўла Абазовіка і іншых спецыялістаў, якія таксама былі заняты на гэтым аб'екце.

— Асноўная апора на іх, на спецыялістаў з вопытам. Хоць нярэдка мы і гаворым добрыя словы ў адрас моладзі, і ўвогуле — заслужана гаворым, тым не менш — стаўка менавіта на вопыт, на старых работнікаў. Тых ведаў, што атрымліваюць маладыя людзі, напрыклад, у каледжах ды інстытутах, далёка недастаткова, каб узводзіць нават адносна нескладаныя аб'екты, каб добра разбірацца ў праектна-каштарыснай дакументацыі, добра будаваць. Толькі побач са старэйшымі работнікамі набіраюцца неабходнага вопыту і маладыя спецыялісты, што мы абавязкова ўлічваем і ў сваёй кадравай палітыцы, пры расстаноўцы людзей. І гэта датычыцца не толькі менавіта спецыялістаў, але і рабочых, і іх, можа, нават у большай ступені. Напрыклад, муляр можа набыць добры вопыт менавіта толькі з гадамі і, як правіла, побач з больш вопытнымі работнікамі... Мы ў сваёй кадравай палітыцы імкнёмся таксама рабіць стаўку на ўраджэнцаў Бярэзінскага раёна, якія, безумоўна, хутчэй здольныя замацавацца тут жа, на месцы, а значыць і ў мехкалоне. Прыемна, што вяртаюцца да нас былыя, старыя будаўнікі — Віктар Навіцкі, Уладзімір Сучкоў, Іван Пянкрат і іншыя...

З асобнымі з іх, у прыватнасці з Віктарам Навіцкім і Іванам Пянкратам, мы пазнаёміліся на будаўніцтве шматкватэрнага дома ЖБК у Беразіне. Як яны самі зазначылі, яны ў свой час, калі ў Бярэзінскім раёне, іншых рэгіёнах краіны не было ні аб'ёмаў, ні заработнай платы, з'ехалі ў Расію па доўгі рубель. Віктар Навіцкі, паводле яго слоў, аб'ехаў паў-Расіі, будаваў і ў Якуціі, і ў Маскве. І, увогуле, трохі зарабіў. А вось Івану Пянкрату не пашанцавала: абяцалі адно, а атрымліваў зусім не тое. Не спадабалася, хоць таксама нямала пакалясіў. Цяпер вось будуе дома, на радзіме. Вядома, дома лепей. Да таго ж, ёсць тут цяпер і заработная плата, і ёсць што будаваць. І ўвогуле, як падкрэслівае Іван Пянкрат, трэба менавіта на сваю краіну працаваць, а не матляцца ў пошуках доўгага рубля па чужых мясцінах...

Што яшчэ можна тут дадаць?

Вадзіцель бетонавоза Аляксандр ЧАЧЭТ; брыгадзір муляраў Валерый СЛАБКО; брыгадзір цесляроў Сяргей ЕРМАКОВІЧ, брыгада якога ўзводзіць дамы катэджнага тыпу ў вёсцы Брадзец.

Шмат чаго ў гэтым плане ўжо зроблена. Так, у 2004 годзе ў Астрашыцкім Гарадку, якая рэканструюецца, а таксама пабудовы жывёлагадоўчага комплексу ў Валожыне. Дарэчы, падобная геаграфія работ працаўнікоў ПМК-182 тлумачыцца тым, што ў «Мінскаблсельбудзе», дзеляны накрывалі школу ў Астрашыцкім Гарадку, якая рэканструюецца, а таксама пабудовы жывёлагадоўчага комплексу ў Валожыне. Дарэчы, падобная геаграфія работ працаўнікоў ПМК-182 тлумачыцца тым, што ў «Мінскаблсельбудзе», дзеля

Васіль Ільіч БАБАВОЗ — старэйшы механізатар ПМК з багатым вопытам, адзначаны шматлікімі ўзнагародамі. Нядаўна яму споўнілася 72 гады. Фотаздымак унізе зроблены ў момант, калі да паважанага ветэрана з віншаваннямі падышлі маладыя тынкоўшчыкі Аляксей ЖАЎНЯРОВІЧ і Дзмітрый ЖУКОЎСКІ. Здымак уверсе знаёміць нас з брыгадай маляроў-тынкоўшчыкаў у складзе Тамары СЫСКАВЕЦ (брыгадзір), Тамары УСАВАЙ, Кацярыны ПАТАЛЕЙ, Святланы НАВІЦКАЙ, Валянціны ЗАЗЕРСКАЙ. Побач вы бачыце новую праваслаўную царкву і дом для шматдзетных сем'яў у райцэнтры — гэта таксама будаўнічыя аб'екты Бярэзінскай ПМК, якія ўпрыгожылі горад.

* * *

Такім чынам, жывёлагадоўчы комплекс — гэта на сёння найбольш важны для калектыву ПМК-182 аб'ект. Праўда, відаць, наўрад ці можа пагадзіцца з гэтым прараб Барыс Звоннікаў, які заняты на ўзвядзенні ўжо згаданага шматкватэрнага дома ЖБК у Беразіне. Ну вядома ж, яго аб'ект не менш важны. Канкрэтна для яго. Хоць, між іншым, асабліва мільгаценне кельмаў на яго аб'екце неяк не назіралася. Пра што мы і сказалі Барысу Пятровічу.

— Ды знялі трохі маіх людзей на МТФ, на вёску Брадзец, дзе рыхтуюцца да здачы аднакватэрныя дамкі, — адказаў ён. — Шкада, можам не паспець здаць гэты ЖБК да Дня будаўніка, як меркавалі. Тым не меней, праца на ім не спыняецца, працуем з васьмі раніцы да дзевяці гадзін вечара. Такі графік устанавілі з тым, каб максімальна задзейнічаць вежавы кран, які арандуем... Для больш хуткага выканання ўсіх работ арганізавалі справу такім чынам, што хоць на доме яшчэ не закончылі сваю працу муляры (выганяюць апошні паверх), услед за імі ўжо ідуць цесляры, электрыкі, на днях павінны з'явіцца тынкоўшчыкі...

У Барыса Пятровіча — перадпенсійны ўзрост, і ён за сваю працоўную біяграфію нямала чаго пабудаваў: тры школы, два дзіцячыя садкі, школу-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў у Чэрвені, жылыя дамы ва Уздзе; працаваў на аб'ектах гарналыжнага комплексу «Сілічы»... «І не запомніш усяго», — гаварыў ён. «А як акуратна вядзе ён усю дакументацыю, — падкрэслівала Тамара Жукоўская. — Табелі ўліку працоўнага часу, справаздачы, інструктажы па тэхніцы бяспекі — усё ў яго ў поўным парадку...».

Вёска Брадзец, да якой ад Беразіна каля 30 кіламетраў, была наступным пунктам, які мы наведалі. Тут, як сказана ўжо, рыхтуюцца да здачы аднакватэрныя дамы. Нас пазнаёмілі з брыгадай цесляроў, якой кіруе Сяргей Ермаковіч, таксама яшчэ малады чалавек, але, тым не меней, сапраўдны аўтарытэт для астатніх. «Узводзім драўляныя зрубы, выконваем усе цяслярныя работы, аж да абуладкавання даху». Як варта меркаваць, добра набілі руку цесляры Сяргея Ермаковіча менавіта на абуладкаваннях даху — сёлета найбольшай карысці для справы, менавіта манеўруюць рознымі спецыялістамі з падведамных гэтаму прадпрыемству механізаваных калон. Аднак вернемся да цесляроў Сяргея Ермаковіча, дакладней — да яго самога. Ёсць у яго пакуль што не такой ужо і багатай працоўнай біяграфіі даволі цікавы факт: ён некаторы час працаваў інкасатарам банка. Словам, была ў чалавека, здавалася б, вельмі няпыльная і, здавалася б, даволі цікавая праца, на якую, шчыра прызнаем, нямала хто хацеў бы ўладкавацца. «Ды якая яна цікавая? — не пагаджаецца Сяргей Ермаковіч. — І сумная, і заработная плата не вельмі. А тут мяняюцца аб'екты, тут сапраўдная жыццёвая школа. І ўвогуле, лепш зарабляць свае грошы, чым вазіць чужыя...».

Застаецца дадаць: цяпер Сяргей Ермаковіч рыхтуецца да паступлення ў архітэктурна-будаўнічы каледж (а можа, ужо стаў студэнтам? У такім разе шчыра віншуем яго), а яшчэ сказаць пра тое, што яго брыгада лічыцца (і гэта ўжо зразумела) не толькі адной з лепшых у ПМК-182 — хлопцы з гэтай брыгады, як нам расказалі, таксама вельмі добра адстойваюць гонар мехкалоны на розных спартыўных спаборніцтвах і турыстычных злётах раёна.

І яшчэ з адным з працаўнікоў ПМК-182 пазнаёмімся — з механізатарам і, як ахарактарызавалі яго ў мехкалоне, майстрам на ўсе рукі Васілём Бабавозам. Днямі яму споўнілася 72 гады (яго ўнуку ўжо 38 гадоў), але па-ранейшаму цвёрда трымаюць яго рукі рычагі як старэнькага, ўдакладніў: у цэлым неблагі вузел, за месяц да 500 кубаметраў бетону рыхтуюць на ім, а бетон ідзе не толькі на патрэбы непасрэдна мехколоны, але і на продаж. У прыватнасці яго бяруць мясцовыя гаргаз, лясгас, дарожнікі, насельніцтва... Але разам з тым ужо вельмі паднасіліся на гэтым РБУ і стужкі, і бункеры, і дазатары. Словам, трэба пакрысе рэканструяваць яго...

Увогуле, як таксама зазначае дырэктар, да мінулага года было цяжкавата з тэхнічным аснашчэннем мехкалоны, новая тэхніка практычна адсутнічала. А вось менавіта ў мінулым годзе з'явіліся і два новыя аўтасамазвалы з прычэпамі, і новы пагрузчык, і міксер-бетонавоз, і іншыя машыны і механізмы. Амаль усе яны ўзяты ў лізінг, а вось бартавы МАЗ падарыў працаўнікам ПМК-182, як «выдатнікам», аблвыканкам. Зразумела, са з'яўленнем новай тэхнікі з'явіліся і новыя магчымасці ў будаўніцтве, што добра бачна на тых жа цяперашніх выніках.

Але трэба абнаўляцца і далей. Так, пералічвалі ў мехкалоне, ёй патрэбны новыя аўтобусы (на іх у ПМК возяць людзей на аб'екты), новы бульдозер, новы экскаватар («і нават два»), яшчэ адзін міксер-бетонавоз, «не пашкодзіў бы таксама і яшчэ адзін пагрузчык»... Такі вось даволі салідны спіс. Праўда, начальнік гаража Віктар Ржэускі (зробім тут невялікае адступленне), на якім ляжаць пытанні як выпуску тэхнікі на лінію, так і яе адпаведнага абслугоўвання, рамонту і многія іншыя пытанні, і ўвогуле, як зазначалі тут, — уся база на ім, напэўна, гэты спіс дапоўніў бы яшчэ болей. Як нам паведамілі, так бы мовіць, па сакрэце, яго ўжо колькі разоў «звальнялі» з працы за пэўныя тэхнічныя збоі.

Але менавіта ён прыкладаў, можа, самыя большыя намаганні, каб адшукаць пэўны вузел, нешта адрамантаваць, падагнаць, напыліць і г.д. І вось, нягледзячы на «звальненні», тым не меней — трымаецца Віктар Ржэускі ў ПМК ужо 31 год (між іншым, ён з'яўляецца шчырым прыхільнікам нашай газеты, шмат гадоў выпісвае яе). З папаўненнем мехкалоны новай тэхнікай жыццё начальніка гаража, трэба думаць, стане яўна лягчэйшым.

Карацей кажучы, фронт работ у Бярэзінскай ПМК-182 усё болей пашыраецца, і трэба загадзя думаць пра яго належнае тэхнічнае забеспячэнне. Як ужо зазначаў кіраўнік мехкалоны яшчэ вышэй, на гэты год калектыў забяспечаны заказамі ажно на 200 працэнтаў. Акрамя ўжо названых аб'ектаў, ён удзельнічае таксама ва ўзвядзенні найбуйнейшай у краіне МТФ у Кляновічах Крупскага раёна, разлічанай на ўтрыманне 1500 галоў (на гэтым аб'екце ПМК-182 мае каля 20 працэнтаў сваіх цяперашніх аб'ёмаў работ), у рэканструкцыі школы ў Астрашыцкім Гарадку... І ўжо цяпер ідзе актыўнае фарміраванне праграмы на наступны год. Якія аб'екты зоймуць пераважнае месца ў гэтай праграме? У асноўным дамы ЖБК. «Гэта, — падкрэслівае кіраўнік ПМК-182, — жывыя грошы людзей. І грошы не толькі на само жыллё, але і на абуладкаванне новых кватэр. Гэтыя грошы добра стымулююць агульнае развіццё эканомікі і ў першую чаргу развіццё галіны будаўнічых матэрыялаў...».

Адзін з асноўных клопатаў калектыву Бярэзінскай ПМК-182, як ужо можна было заўважыць, — гэта клопат па хутчэйшым уводзе сваіх аб'ектаў у строй. «Скарачэнне тэрмінаў будаўніцтва — гэта адначасова і зніжэнне сабекошту будаўнічых работ», — падкрэслівалі ў мехколоне. Ну а як непасрэдна на практыцы рэалізуецца гэта ўстаноўка? На практыцы тут імкнуцца ўзводзіць тыя ж дамы ЖБК не за 8 нарматыўных месяцаў, а за больш жорсткі 6-месячны тэрмін. «Калі ўсё дакладна арганізоўваць, можна выходзіць і на гэты тэрмін, і на адпаведныя тэмпы», — таксама падкрэслівалі тут.

У сённяшніх эканамічных умовах, якія, безумоўна, закранаюць усіх, у тым ліку і будаўнікоў, у Бярэзінскай ПМК-182 таксама робяць стаўку на павелічэнне аб'ёму работ уласнымі сіламі, на больш прынцыповае стаўленне да праектна-каштарыснай дакументацыі (з мэтай выключэння «лішніх» работ), на выпрацоўку мераў па зніжэнні затратаў на матэрыялы. Што ж датычыцца так званых унутраных рэзерваў, у гэтым плане асноўны ўхіл — на змяншэнне выдаткаў па ўтрыманні апарату кіравання і службовага транспарту і некаторых іншых выдаткаў, падобных на названыя. А пры гэтым намечана непахіснай утрымліваць заработную плату людзей, дакладней — не дапускаць яе зніжэння. Дарэчы, цяпер сяроднямесячная заработная плата ў ПМК-182 складае каля 1100 тысяч рублёў.

Увогуле, стаўленне да людзей, як можна было добра бачыць, у мехколоне асабліва ўважлівае. «Вы ж не забудзьце назваць у матэрыяле нашых вадзіцеляў», — казала інжынер па забеспячэнні і адначасова намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Ірына Саскавец. І тут жа пералічвала іх прозвішчы: Васіль Хвашчэўскі, Віктар Маслаў, Рыгор Барысёнак, Віктар Шышкін, Андрэй Самец... А Тамара Жукоўская была заклапочана тым, каб былі таксама названы, у дадатак да ўжо агучаных ёю прозвішчаў, і прозвішчы прарабаў Пятра Каравага, брыгадзіраў Васіля Хахла, Валерыя Слабко, Івана Саскаўца, Пятра Шпака, прычым абавязкова адзначана, што іх брыгады таксама найлепшыя... У гэтым пераліку гучалі таксама многія іншыя прозвішчы...

Іван БАРАНОЎСКІ,
фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 690018954.

Даччынае ўнітарнае прадпрыемства «ПМК-182»
223311, г. Беразіно, вул. Мультана, 106.

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Бярэзінская ПМК-182 здае ў арэнду вытворчае памяшканне плошчай 18х60 квадратных метраў, якое знаходзіцца на тэрыторыі базы ПМК у горадзе Беразіно і забяспечана ўсёй неабходнай інфраструктурай.

* * *

Бярэзінская ПМК-182 прадае ў неабмежаванай колькасці дошку неабразную таўшчынёй 25 міліметраў. Цэны — нізкія; самавывоз, пры дадатковай дамоўленасці дастаўка аўтатранспартам прадпрыемства.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 24 августа 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Адрес земельного участка.	Площадь	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1 бульвар Днепровский, остановка «М/р Юбилейный-2».	0,0021 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000004003167	206 000	19 000
Лот № 2 проспект Мира, остановка «Магазин № 77».	0,0034 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000004003163	370 000	33 000
Лот № 3 улица Габровская, остановка «Облгаз» (в центр).	0,0008 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000007004755	53 000	5 000
Лот № 4 пл. Орджоникидзе, остановка «Пл. Орджоникидзе» (огр. р. Днепр).	0,0019 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000004003160	233 000	21 000
Лот № 5 проспект Шмидта, остановка «Университет продовольствия» (от центра).	0,0010 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005004091	86 000	8 000
Лот № 6 улица Симонова, остановка «Улица Симонова».	0,0013 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне (№ 1)	740100000005004088	71 000	6 000
Лот № 7 улица Симонова, остановка «Улица Симонова».	0,0013 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне (№ 2)	740100000005004089	71 000	6 000
Лот № 8 улица Сосновая, остановка «Противотуберкулезный диспансер».	0,0012 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000007004758	68 000	6 000
Лот № 9 улица 30 лет Победы, остановка «С/к «Олимпиец».	0,0017 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000002005103	142 000	13 000
Лот № 10 улица Габровская, остановка «Б-р Непокоренных».	0,0015 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005004087	99 000	9 000
Лот № 11 проспект Мира, остановка «Гостиница «Могилев» (в центр) (огр. р. Дубровенка).	0,0018 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000003005712	191 000	17 000
Лот № 12 улица Космонавтов в р-не остановки «Улица Лазаренко».	0,0021 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000003005711	180 000	16 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

Юридические лица: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

Индивидуальные предприниматели: паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

Граждане – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

1) Условие предоставления земельного участка в аренду: согласование типа киосков, павильонов с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

2) Граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная (общая) сумма расходов составляет 8 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 18.08.2009 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 26 августа 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Адрес земельного участка.	Площадь	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1 улица Крупской в р-не остановки «Проходная» (улица Крупской).	0,0014 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000002005101	78 000	7 000
Лот № 2 улица Пионерская в р-не ж. д. №№ 20, 22.	0,0009 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000004003164	111 000	10 000
Лот № 3 улица Белинского в р-не ж/д поликлиники.	0,0009 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000002005102	82 000	7 000
Лот № 4 улица Челюскинцев в р-не остановки «ОАО «МЗИВ».	0,0007 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000003005710	45 000	4 000
Лот № 5 улица Кедровая в р-не ж.д. № 11.	0,0023 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000004003168	250 000	23 000
Лот № 6 улица Ленинская в р-не ж.д. №№ 46, 48.	0,0012 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000004003172	147 000	13 000
Лот № 7 улица Лепешинского в р-не Мог. гор. центра разв. мал. предприн.	0,0027 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000004003162	331 000	30 000
Лот № 8 улица Миронова, сквер 40-летия Победы.	0,0098 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000004003161	1 199 000	108 000
Лот № 9 переулок 4-й Южный в р-не ж.д. № 77.	0,0032 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000007004757	181 000	16 000
Лот № 10 улица Краснозвездная в р-не ж.д. № 30, № 56б (огр. р. Дубровенка).	0,0130 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000001005033	732 000	66 000
Лот № 11 улица Крупской в р-не ж.д. № 184.	0,0096 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000002005099	532 000	48 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**;

Юридические лица: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

Индивидуальные предприниматели: паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

Граждане – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

1) Условие предоставления земельного участка в аренду: согласование типа киосков, павильонов с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

2) Граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная (общая) сумма расходов составляет 8 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 20.08.2009 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 28 августа 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Адрес земельного участка.	Площадь	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1 улица Профсоюзная в р-не ж.д. № 15а, № 17.	0,0142 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000001005026	800 000	72 000
Лот № 2 улица Боткина в р-не УЗ «Мог. горбольница СМП».	0,0063 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000004003165	771 000	69 000
Лот № 3 улица Гришина в р-не остановки «Ж/д вокзал».	0,0012 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска	740100000002005100	99 000	9 000
Лот № 4 улица Мовчанского в р-не ж.д. № 31.	0,0170 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000006000597	776 000	70 000
Лот № 5 улица Королева в р-не ж.д. № 25.	0,0048 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000004003166	513 000	46 000
Лот № 6 улица Краснозвездная в р-не ж.д. № 56 (огр. р. Дубровенка).	0,0033 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000001005035	186 000	17 000
Лот № 7 улица Орловского в р-не ж.д. № 14.	0,0035 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000001005032	289 000	26 000
Лот № 8 улица Профсоюзная в р-не ж.д. № 14.	0,0017 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли	740100000001005034	96 000	9 000
Лот № 9 улица Фатина в р-не конечной остановки (огр. р. Днепр).	0,0040 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли (№ 1)	740100000006002419	183 000	16 000
Лот № 10 улица Фатина в р-не конечной остановки (огр. р. Днепр).	0,0068 га	до 1.06.2010	Размещение объекта розничной торговли (№ 2)	740100000006002418	311 000	28 000
Лот № 11 улица Каштановая в р-не ж.д. № 19, № 21.	0,0256 га	50 лет	Строительство и обслуживание магазина смешанной группы товаров	740100000002005098	18 144 000	1 633 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

Юридические лица: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

Индивидуальные предприниматели: паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

Граждане – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

1) Условие предоставления земельного участка в аренду: согласование типа киосков, павильонов с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

2) Граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная (общая) сумма расходов составляет 8 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 24.08.2009 года до 13.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

ФУТБОЛЬНЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ,

альбо Займальная геаграфія Віталя Радзівонава

Наш сённяшні суразмоўца яшчэ толькі-толькі адчуў смак замежнага хлеба, аднак цалкам упэўнены ў вартасці абранага шляху. Не, ён не дасягнуў пакуль футбольных вяршыняў, пра якія марыў яшчэ ў дзяцінстве, але ж легіянерскі шлях хоча скончыць там, дзе і пачаў — у Германіі. Нехта можа здзівіцца, маўляў, не Італія ў футбольным складніку, і не Расія па менталітэце. Толькі нападаючы БАТЭ Віталь Радзівонаў, як той моцны дубок, насуперак колкім вятрам трымаецца ўласнай глебы. Ён не лекар, і не дае рэцэптаў шчасця і поспеху. Усяго прывык дасягаць працуючы. Спорт не трывае лайдакоў, нязначнае занядбанне — і ты можаш апынуцца ў ар'ергардзе. Такі лёс... Віталь разумее гэта і кіруецца абраным курсам. А пакуль ёсць час, апавядае пра сваё жыццё і з дапамогаю карэспандэнта «Звязды» гартае ўласны атлас футбольнай кар'еры:

— З Германіі разам з жонкаю вярнуліся зусім нядаўна, але ўжо крышачку засумавалі па гэтай прыгожай і казачнай краіне, — пачынае дыялог Радзівонаў. — За гэтыя шэсць месяцаў мы прывыклі да Фрайбурга. Усё, як у футбольным, так і ў бытавым плане мяне задавальняла. Таму і хочацца туды вярнуцца. Але ж не забываю пра Беларусь, бо тут наш дом, Радзіма, бацькі...

— Віталь, на хвілінку ўявіце, што ў вас скончыўся кантракт з БАТЭ. Вы працягнулі б і надалей супрацоўніцтва з барысаўчанамі, альбо зноў паспрабавалі б сябе на Захадзе?

— Ведаеце, з аднаго боку, добра, што ў мяне дзейнічае кантракт — не трэба шукаць новую каманду. Тым больш, ёсць магчымасць гуляць за клуб і змагацца за ўзнагароды. За час выступленняў у Германіі я шмат чаму навучыўся ў футболе. Усё ж такі я трапіў у каманду, якая належыць да адной з лепшых у Еўропе футбольных школ. Спадзяюся, што гэта практыка дапаможа мне ў будучыні і ў выступленнях за БАТЭ. З іншага боку, безумоўна, мне хочацца зноў паспрабаваць гуляць у Заходняй Еўропе. І не проста паспрабаваць, а максімальна выкарыстаць гэтую магчымасць і зрабіць паспяховую кар'еру.

«У футбол трапіў выпадкова»

— Вяртаючыся да пачатку футбольнай кар'еры, раскажыце, як адбылося ваша знаёмства з футболам?

— Напэўна, як і ўсе школы, так і нашу наведвалі дзіцячыя трэнеры. І ўсё атрымалася зусім выпадкова. Разам з хлопцамі з класа я прыйшоў на трэніроўку. Магчыма, я пайшоў у футбольную секцыю яшчэ і таму, што нічым больш не займаўся па-за школаю. Але атрымалася так, што спорту я стаў аддаваць амаль увесь вольны час. З гэтага пачалося, так і працягвалася далей. Трэніраваліся мы на полі Палаца «Камсамолец». Яно ўвесь год было аднолькава дрэннае: пясчаны прамавугольнік з астраўкамі дзірвану. Але ж тады мы не звярталі ўвагі на ўмовы, а цалкам былі ўлюбёныя ў гульню. Затое мне пашчасціла з першымі футбольнымі настаўнікамі: Яўген Новікаў і Уладзімір Вайцяховіч былі для мяне не проста трэнерамі, а другімі бацькамі.

— Віцебскі «Лакаматыў» быў вашаю першаю футбольнаю любоўю?

— Хутчэй за ўсё, гэта была проста родная каманда. Я наведваў кожны матч «Лакаматыва» і, вядома ж, хвалявaўся за каманду. У будучыні я сам пачаў выступаць за «Лока».

— Не было крыўдна, што так мала пагулялі за віцебскую каманду?

— Напэўна, не. Каманда перажывала цяжкія часы. Клубу патрэбны былі грошы. Праз год «Лакаматыў» наогул трапіў у першую лігу. Аднак у сваім пераходзе ў жодзінскае «Тарпеда» я бачу ўжо ўласныя футбольныя дасягненні.

«У Жодзіне адчуў сябе сапраўдным мужчынам»

— На пачатку новага тысячагоддзя Якаў Шапіра стварыў у аўтаградзе досыць цікавы футбольны калектыў, які вылучаўся не толькі класным падборам гульцоў, але і адметнай з'яднанасцю і сяброўствам футбалістаў...

— Гэта сапраўды так. У «Тарпеда» таксама былі праблемы з фінансаваннем, аднак, дзякуючы сяброўскай атмасферы, мне падабалася там гуляць. Тым больш, Якаў Міхайлавіч даў мне шмат як асобае, навучыў заўжды адстойваць погляды і трымацца ўласнай пазіцыі, жыць сваім розумам. Падчас працы з Шапірам я пасталеў і як футбаліст, і як мужчына. Гэтая старонка маёй кар'еры стала знакавай. Прыемна, што і сёння я падтрымліваю сувязь з жодзінскімі балельшчыкамі.

— У БАТЭ вы перайшлі па ўласным жаданні?

— Каб разлічыцца з гульцамі, клубу трэба было прадаць некалькі футбалістаў. У гэты шэраг трапіў і я. Аднак мне радасна было трапіць у БАТЭ. З гэтым клубам я дасягнуў значных поспехаў, і ніколі не сумнявaўся ў правільнасці выбару.

«Нам дапамагаў камандны дух»

— Кажучы пра ваша выступленне ў БАТЭ, перш-наперш хочацца спытаць пра матчы на еўраарэне. Каб трапіць у групавы этап, вы сустрэліся з досыць моцнымі супернікамі: бельгійскім «Андэрлехтам» і балгарскім «Леўскі». Вядома, што перамога над любым супернікам каштоўная. Але ж пасля якой з іх вы сталі больш упэўненымі маральна?

— Гэта перамога над бельгійцамі, і менавіта першая выязная сустрэча. Пасля той гульні мы сапраўды сталі больш упэўненымі, паверылі ў свае сілы. Зразумелі, што мы гуляем не горш за «Андэрлехт», і здольныя прайсці далей. Своеасаблівая вера, камандны дух таксама дапаможа нам атрымаць перамогу. Для «Андэрлехта» наша гульня стала адкрыццём.

— Пасля вікторыі «Барселоны» ў Лізе Чэмпіёнаў, еўрапейскія журналісты ў адзін голас заспявалі пра рамантычны футбол у выкананні іспанцаў. А ці не здаецца вам, што гэтай рамантыкі, свойскасці, было больш у выступленні БАТЭ?

— Можа і так. Але, я думаю, што ў нашых дзеяннях прысутнічала шмат прагматызму. І гэта бачна з таго, як падыходзіў да матчаў наш трэнерскі штаб — да дробязяў усё прадумваў, аналізаваў. І гэта зразумела ўжо па падборы супернікаў, з якімі нам давялося сустракацца. Акрамя таго, мы максімальна выкарысталі патэнцыял. Безумоўна, можна казаць, што яны не настройваліся адпаведна на матчы з БАТЭ. Але ж гэта толькі размовы. Групавы этап каманда правяла роўна, паказваючы добры футбол. І наша выступленне не толькі радавала беларускіх прыхільнікаў, але яшчэ і падымала ўзровень упэўненасці ў сабе ўсіх беларускіх футбалістаў. Мы ўсё ж такі рабілі адну вялікую справу для айчыннага спорту.

— Вы кажаце пра несур'ёзнае стаўленне да суперніка, а ці павінна ў кар'еры прафесіянала існаваць празмерная радасць, эйфарыя, ганарлівасць.?

— Я не выключаю, што такое можа быць. Тым больш, калі чалавек знаходзіцца на хвалі поспеху, і гэта не толькі ў футболе. Такое можа здарыцца ў любой сферы жыцця. Толькі калі чалавек разумны, схільны да самааналізу, то гэткую фанабэрыстасць ён хутка ў сабе спыніць. У любой справе, калі ты будзеш ставіць сябе вышэй за іншых, то ад жыцця па носе ўсё ж такі атрымаеш.

— Падчас вашых выступленняў за БАТЭ я неаднойчы заўважаў, як у галявым моманце, які паспяхова самі маглі б скончыць, вы часам аддавалі мяч партнёру. Такое адчуванне, быццам кіраваліся жыццёвым правілам «не будзь сквапным!».

— Ды не, я наогул лічу, што форвард павінен больш забіваць, чым аддаваць пасы партнёрам. А тут, відаць, спрацоўвае нейкі падсвядомы імпульс. Бачу партнёра і механічна аддаю перадачу. А пасля я нават і не задумваюся, што мог сам забіць.

— Вы на полі такі, як і ў жыцці?

— Так. Але ж у спорце патрэбная нахабнасць, і, магчыма, якраз яе мне не хапіла ў Германіі. А ў пазафутбольным жыцці я спакойны чалавек. Праўда, часам і нервуюся, але ж гэта зрэдку *(усміхаецца)*.

«Адчуванне, быццам трапіў у казачную краіну»

— Калі я трапіў у Фрайбург, то адразу адчуў асалоду ад знаходжання ў Германіі, — дзеліцца ўражаннямі форвард БАТЭ. — У гэтым невялічкім нямецкім гарадку шмат паркаў, архітэктурных помнікаў, якія вызначаюцца асаблівай велічу, прыгажосцю...На дарогах шмат людзей на веласіпедах. У зялёных скверах студэнты займаюцца спортам. Гуляючы па вузенькіх вулачках, можна адкрыць маляўнічасць мясцовых гор. І яшчэ ўражвае спакойны, нетаропкі лад жыцця...

— Віталь, а вам не было крыўдна, што і мы мелі б зараз такую ж прыгажосць, калі б здолелі захаваць яе...

— Я лічу, што апошнім часам у нас рэстаўруюць шмат архітэктурных помнікаў. Таму і ў Беларусі ёсць што паглядзець. Але ж нямецкай дакладнасці, вытанчанасці беларусам можна было б і павучыцца.

— Знаходзячыся пасярод такой ідыліі, у вас не ўзнікала жаданне пасяліцца ў сваім доме, стрыгчы газон, паставіць у садзе бутафорскіх гномікаў?

— Падобнае часам з'яўлялася ў думках, калі мы з жонкай знаходзіліся ў Германіі.

— А вас як футбаліста ўсё задаволіла?

— У рынцыпе, усё было добра, і нягледзячы на траўму, узгадваю гэты перыяд свайго жыцця з асалодаю і лічу, што нямецкі чэмпіянат — гэта тое першынства, дзе я магу прагрэсаваць як гулец. Мне падабаецца стыль гульні, які прапагандуюць у Германіі. Да таго ж, барацьба вядзецца на кожнай частцы поля, ты ўвесь час павінен працаваць.

— Падчас вашага выступлення ў «Фрайбургу», за каманду гулялі прыкладна пяць футбалістаў, якія раней супрацоўнічалі з галоўным трэнерам у іншых клубах. Ці не было ў Робіна Дута любімчыкаў?

— Больш за ўсё часу ён удзяляў капітану, Хейка Бутчэру. Але ж так і павінна быць, бо капітан — сувязны паміж астатнімі футбалістамі і трэнерам. А больш блізкіх кантактаў я не заўважаў.

— Толькі ў клубе засталіся гульцы атакі з горшымі статыстычнымі паказчыкамі, чым у вас...

— Значыць, я ім у нечым не падыходзіў...

— Напачатку цяжка было камунікаваць з партнёрамі?

— Не ведаючы мовы, хоць бы не нямецкай, а англійскай, можна лёгка стаць ізгоем у камандзе. Напачатку немцы могуць прабачаць, а калі заўважаць нежаданне вывучаць мову... Гэта, відаць, галоўная прычына таго, што нашы футбалісты не могуць гуляць у Германіі. Я вывучаў нямецкую мову ў школе, але шмат чаго забыўся. Узгадаць яе мне дапамагаў рускі вучоны, які працуе ў Фрайбургскім універсітэце. І цяпер я магу ўжо адносна свабодна размаўляць па-нямецку. Галоўнае, што ўстаноўку трэнера на матчы я разумею. Калі быць шчырым, то сяброўскіх адносінаў, якія ёсць у БАТЭ, мне не хапала. Мы зусім рэдка сустракаліся камандай. На трэніроўках перагаворваліся, але ж больш блізкіх стасункаў не было. Думаю, што і паняцця сяброўства ў нямецкіх футбалістаў амаль не сустракаецца. Але ж быў у камандзе нігерыйскі футбаліст Еке Узома, з якім мы досыць добра камунікавалі.

— У сваім блогу вы пісалі, што нават на трэніроўках футбалісты могуць нанесці адзін аднаму траўмы...

— Так і ёсць. Толькі, думаю, гэта робіцца не спецыяльна. Кожны змагаецца за месца ў асноўным складзе, і гэта становіцца звычкаю. Дарэчы, я яшчэ заўважыў, што ў Германіі прынята цалкам трымацца трэнерскіх настаўленняў. Аднак, калі зробіш наадварот і заб'еш фантастычны гол — цябе будуць насіць на руках. Але, калі згуляеш дрэнна ў наступным матчы, могуць, вобразна кажучы, і з зямлёй зраўняць. Нягледзячы на крытыку, там любяць паспяховых людзей. Прыклад таму — наш Аляксандр Глеб.

— Ну а кур'ёзныя, смешныя сітуацыі ў такім сур'ёзным клубе ўзнікалі?

— Цяжка ўзгадаць. Затое я добра памятаю, як мы наведвалі ўсёй камандай футбольны матч дортмундскай «Барусіі». Бачым, а каля нас увесь час ходзіць нейкі чалавек, больш на клоуна падобны: у яркім парыку і смешных акулярах. Мы яго ўжо збіраліся прагнаць, калі ўбачылі, што гэта наш капітан Хейка такім чынам вырашыў нас разыграць. Было досыць смешна.

— Амаль кожны футбаліст нараканае на недахоп вольнага часу. Маўляў, заняцца нечым іншым вельмі цяжка. Што вы робіце, калі выпадае час?

— Вольнага часу сапраўды не так шмат. І калі выпадаў які адпачынак у Германіі, я праводзіў яго разам з жонкаю: мы падымаліся ў горы, а зусім нядаўна адпачывалі ў Славеніі, і не проста сядзелі на месцы, на пляжы, а вандравалі па краіне, вывучалі яе гісторыю і вядомыя мясціны. Нам вельмі спадабалася Любляна — гэта ўтульны горад з прыгожымі замкамі. А яшчэ я люблю лавіць рыбу. Звычайна, спінінгам я вуджу драпежную рыбу, вось нядаўна шчупака злавіў, дома гатавалі страву... У гэтым акрамя азарту ёсць свая прывабнасць. Ты разважаеш, задумваешся над рознымі пытаннямі. Бо футбол, трэніроўка не дазваляюць гэтага зрабіць ...

— Нямецкая рамантычная літаратура вас не зацікавіла?

— Я пакуль не пазнаёміўся з ёю, бо не хапіла часу. Але ж мяркую, калі ўсё будзе добра, абавязкова пачытаю. Толькі ўсё зноў залежыць ад часу. Нядаўна я чытаў Дэна Браўна: някепская, цікавая фантастыка.

...І далей можна было б працягнуць спіс інтарэсаў Радзівонава: напісаць пра ягоную любоў да гарбаты, пра разважанні над учынкамі, якіх не хапае ледзь не кожнаму з нас. Але ж тут мы паставім кропку і закрыем вялікі і сапраўды цікавы атлас. Магчыма, гэта пачатак для яшчэ адной размовы, дзе заўжды накіраваны на поспех Віталь паўстане гульцом моцнага, сур'ёзнага еўрапейскага клуба. Пажывём — пабачым. Аўфідэрзэйн, панове!

Размаўляў Тарас ШЧЫРЫ.

Даведка «Звязды»:
Віталь РАДЗІВОНАЎ нарадзіўся 11 снежня 1983 года ў Віцебску. Нападаючы. Выступаў за віцебскі «Лакаматыў-96», «Тарпеда» (Жодзіна), барысаўскі БАТЭ, «Фрайбург» (Германія). З ліпеня зноў у стане барысаўчан. Трохразовы чэмпіён краіны ў складзе БАТЭ. Заняў другое месца ў апытанні «Лепшы футбаліст Беларусі-2008». За нацыянальную зборную Беларусі правёў 12 матчаў, забіў 3 галы.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Простый насценны гадзіннік

Механізм, адказны за дакладнасць ходу гадзінніка

5	9							
	6		4					
7		1			6		8	
	8			1		6		9
1								8
9		5		4			7	
	2		3			5		6
					5		4	
							1	7

СУДОКУ

У квадраце з 9 на 9 клетак трэба размясціць лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным гарызантальным радку, кожным вертыкальным слупку, а таксама ў кожным малым квадраціку 3 на 3 клеткі, абмежаваным тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Сардэчна віншуем з днём нараджэння ***Івана Паўлавіча КАРАЛЁНКА.*** *Жадаем моцнага здароўя, добрага настрою, шчасця і радасці на доўгія гады.*

Родныя, в. В. Мыса Смаргонскага раёна.

Віншую з днём нараджэння ***Алену Іванаўну БАРАНАВУ*** *з вёскі Галынь. Жадаю поспехаў у працы, дабрабыту і шчасця ў жыцці, а самае галоўнае — моцнага здароўя.*

Вера, в. Галынь.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (18 ліпеня).

Па гарызанталі: Нявестка. Зарніца. Проса. Цэп. Злак. Конкурс. Арал. Шляхта. Гонка. Таса. Тула. Кашара. Зарука. Рапіра. Руб. Бак. Кабул. Строма. Зад. Кантэкст. Чака. Таган. Авёс. Рака. Вал. Дыярама. **Па вертыкалі:** Пшаніца. Актрыса. Палаш. Абібок. Хор. Рамантык. Віза. Лат. Абакан. Арат. Гара. Скрыпка. Авал. Люк. Канёк. Клінок. Сад. Сорга. Кут. Банан. Газа. Кант. Кукуруза. "Рэал". Кулак. Араб. Даўгата.

Утерянную личную печать врача **СТАНИЛЕВИЧ Валентины Анатольевны** считать недействительной.

«ВЕСНІЦА»

РАСКАЗВАЕ ПРА ПАЛЕССЕ

Гэтымі днямі з далёкіх краёў на Радзіму вярнуўся народны ансамбль танца «ВЕСНІЦА» , які створаны пры Акцябрскім цэнтры вольнага часу. Самадзейныя артысты з Палесся ездзілі на адкрыты міжнародны конкурс-фестываль «Крымскія хвалі». Удзел у гэтым прэстыжным фэсце народных талентаў прынёс акцябрскаму калектыву яшчэ адну ўзнагароду — у намінацыі харэаграфія «ВЕСНІЦА» атрымала Гран-пры. Ансамбль, якім ужо шмат гадоў кіруе Аляксандр Сарнаўскі, уразіў гледачоў і журы бліскучым выкананнем беларускіх танцаў. Дарэчы, сам кіраўнік вядомы яшчэ і тым, што выраблюе ім жалейкі, дудкі, ражкі з непаўторным харастом перадаюць народныя напевы Палесся. На гэтых здымках вы бачыце адзін з момантаў выступлення «ВЕСНІЦЫ» на Акцябрскай вуліцы і кіраўніка ансамбля ў яго «музычнай» майстэрні.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

«Чук і Гек» успомнілі Алімпіяду-80

Муз-news

Гурт «здрадзіў» хіп-хопу дзеля бадзёрага і аптымістычнага рэтра — адразу пасля вяртання з Германіі, дзе хлопцы запісвалі дуэт з мясцовым рэперам, быў зняты чарговы відэакліп на песню «Алімпіяда-80».

За яе аснову быў узяты арыгінальны тэкст песні, напісанай Давідам Тухманавым і Робертам Раждественскім у 1979 годзе — да правядзення Алімпійскіх гульняў у Маскве. «Тэкст мы абсалютна не змянялі, толькі спалучылі з сучаснай музыкай, — расказвае ўдзельнік гурта Павел Сыраежкін. — У выніку атрымаўся гэткі кактэйль з музычных традыцый дыска мінулага стагоддзя і пачатку цяперашняга, без нашага фірмовага рэчытатыву». Абноўленая песня ўпершыню прагучала летась у віцебскім амфітэатры і была прысвечана беларускім алімпійцам, якія ад'язджалі ў Пекін. Але потым «Алімпіяда-80» набыла такую вялізную папулярнасць, што спатрэбіўся і відэаролік.

Кліп, рэжысёрамі якога выступілі самі ўдзельнікі гурта, напалову складаецца з рэдкіх кадраў кінахронікі Маскоўскай Алімпіяды, а падпяваюць салістам пра «алімпійскі агонь залаты» спявачкі Нікіта і Вольга Драздова, з удзелам якіх плануецца зрабіць яшчэ не адзін ролік. Цяперашні ж пакуль знаходзіцца ў стадыі мантажу, а артысты радасна здзіўляюцца, што на гэты раз адбылося без усякіх эксцэсаў (падчас здымак папярэдняга кліпа «Фіеста» быў выпадкова разбіты дарагі аўтамабіль). Ужо напрыканцы месяца праверыць, ці ёсць тут нагода для радасці, змогуць усе ахвотныя — «Алімпіяда-80» трапіць у эфір тэлеканалаў.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СТРЭЛЫ, ПАГОНЯ, ТУРМА...

Пра выпадак на брэсцкай вуліцы ў сакавіку гэтага года, калі міліцыянеры з дапамогай зброі затрымлівалі п'янага ліхача на аўто, наша газета расказвала. Нагадаю, што аўтамабіль «Мерседэс» рухаўся на вялікай хуткасці з бульвара Шаўчэнкі ў кірунку праспекта Машэрава — самай ажыўленай трасы абласнога цэнтра. Супрацоўнікі патрульна-паставой службы ўсяляк стараліся затрымаць кіроўцу, прыгразілі нават выкарыстаць зброю, але ён не падпарадкоўваўся патрабаванням службовых асобаў. Ўцякаючы, вадзіцель нават падняў на капот міліцыянера, які спрабаваў весці з ім перамовы. Потым рэзкім манеўрам ён скінуў чалавека з машыны на асфальт, ад чаго супрацоўнік міліцыі атрымаў цялесныя пашкоджанні. Не дапамаглі і папераджальныя стрэлы ў паветра. Затрымалі зламысніка толькі ў дварэ яго дома. Высветлілася, што парушальнік, ім аказаўся грамадзянін Расіі 1980 года нараджэння, быў пазбаўлены вадзіцельскіх правоў яшчэ год таму.

І вось суд разгледзеў гэту справу. У адпаведнасці з прыгаворам суда Маскоўскага раёна Брэста вінаваты ў здзяйсненні злачынства павінен заплаціць штраф у памеры 200 базавых велічынь, ён таксама пазбаўлены волі тэрмінам на два гады.

Яна СВЕТАВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.09	21.23	16.14
Віцебск —	4.51	21.19	16.28
Магілёў —	4.59	21.13	16.14
Гомель —	5.03	21.02	15.59
Брэст —	5.25	21.37	16.12
Гродна —	5.33	21.30	15.57

Месяц

Маладзік 22 ліпеня. Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Антона, Апалона, Данілы, Пятра.*

К. *Апалінара, Брыгіты, Ганны, Яны.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +28..+30°C	КІЕЎ +36..+38°C	РЫГА +21..+23°C
ВІЛЬНЮС +25..+27°C	МАСКВА +19..+21°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +22..+24°C

Дзве даты

23 ліпеня

1815 год — нарадзіўся Іосіф Гашкевіч, выхадзец з Мінскай губерні, дыпламат, вучоны-мовазнавец, даследчык Далёкага Усходу, натураліст. Першы замежны грамадзянін, якому было дазволена выехаць за межы японскай сталіцы і здзейсніць вандраванне па краіне. Выдаў першы ў Расіі «Японска-рускі слоўнік» (1857), адзначаны медалём Пецярбургскай АН і Дзямідаўскай прэміяй — адной з самых ганаровых навуковых узнагарод Расіі.

1917 год — Ленін і Зіноўеў тайна пакідаюць Петраград і пасяляюцца пад выглядам касцоў рабочага Емяльянава каля станцыі Разліў.

Цытата дня:

«Працяглая дыскусія азначае, што абодва бакі не маюць рацыі».

Вальтэр (1694—1778), французскі пісьменнік і філосаф.

СЛЕДАМ ЗА СОНЦАМ АБО СУПРАЦЬ ЯГО

Пераважная большасць рытуальных дзеянняў вясельнага абраду падпарадкоўвалася «залатому» правілу народнай культуры: любое перамяшчэнне жаніха і нявесты, а таксама асноўных вясельных чыноў (сяброў бацькоў, дружыны маладых, сватоў) павінны былі адпавядаць кірунку руху галоўнага касмічнага свяціла — Сонца. Калі жаніх і нявеста развітваліся з роднай хатай перад вянчаннем, то бацькі абводзілі іх вакол стала толькі па ходзе гадзіннікавай стрэлкі (што ў сучасным прачытанні якраз і адпавядае нябеснаму руху свяціла). У адпаведнасці з гэтым правілам вясельны картэж рухаўся ад хаты да храма таксама ў тым жа кірунку. Зразумела, што вяртанне маладых дадому і першы пасад іх за сумесны святочны стол таксама падпарадкоўваўся той самай старадаўняй завядзёнцы. Таму яшчэ раз нагадаем, што як толькі маладыя пераступяць парог роднай хаты, бацька павяжа іх рукі крыж-накрыж ручніком і павядзе знітаваную ў адзінае цэлае пару за стол у кірунку злева направа. Што абодва нябесныя свяцілы, што пара заручаных маладых утваралі гарманічную цэласнасць і пракладвалі свой Млечны шлях па зямлі.

Уважлівыя чытачы могуць запярэчыць: аўтары ўвесь час імкнуцца праводзіць паралелі паміж архаічнай язычніцкай традыцыяй і каштоўнасцямі праваслаўнай культуры і пераконваюць іх у тым, што ў славянскай душы яны суіснуюць гарманічна, дапаўняючы адно другое. Аднак у гэтым выпадку ўзнікае пэўная супярэчнасць або мы сутыкаемся з выключэннем з агульнапрынятых правілаў: сёння ў царкве падчас вянчання маладых абводзяць вакол аналоя супраць руху Сонца, або справа налева. Каб зразумець гэту супярэчнасць, неабходна звярнуцца да недалёкай гісторыі Рускай праваслаўнай царквы. У 1666—1667 гг. была праведзена так званая Ніканаўская рэформа, якая ўнесла істотныя змяненні ў правілы і нормы жыцця Праваслаўнай царквы. Так, напрыклад, у дарэформенны перыяд існавала двухпальцавае хрышчэнне, якое сімвалізавала дваякую прыроду Хрыста — чалавечую і Боскую. Патрыярх Нікан уводзіць хрышчэнне трыма пальцамі, якое павінна было ўвасабляць святую Тройцу — Бога Айца, Бога Сына і Святога Духа. Тады ж было прынята рашэнне аб тым, што Пасхальны хрэсны ход і абвяшчэнне маладых вакол аналоя будзе заменена на «супрасалонь», г. зн. у кірунку, зарыентаваным супраць руху Сонца.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 23 (312)

Старажытная рэпа

Рэпа шанавалася старажытнымі грэкамі і рымлянамі і была ў іх на стале любімай гароднінай. У славян таксама рэпа ўпамінаецца ў старадаўніх купчых граматах. Рэпу елі вараную, параную, смажаную, з квасам, і як ласунак накшталт яблыка. Заквашвалі яе як капусту. І гэта было задоўга да таго, як на стале з'явілася бульба.

Рэпа вельмі пажыўная культура: у мясістых караняплодах ёсць цукры, мінеральныя солі, вітаміны B_1 і B_2, С, РР, правітамін А. Спецыфічны пах і востры смак рэпе надае гарчычны алей, які знаходзіцца ў мякаці. Пажыўнасць і наяўнасць вітамінаў — каштоўныя якасці, таму рэпа заслугоўвае неабыякавых адносінаў да яе агароднікаў. У даўніну заквашвалі лісты рэпы і выкарыстоўвалі яе ў якасці капусты.

У лекавым харчаванні яе рэкамендуюць для лепшай работы страўніка, аднак пры яго запаленні рэпа супрацьпаказана. Сок з рэпы лічыўся добрым сродкам ад цынгі. Гэтым сокам літаральна за два дні вылечвалі апухлыя дзясны, якія кроватачылі. Адвар рэпы п'юць як мачагонны і адхарквальны сродак. З кашкі вараных караняплодаў робяць прыпаркі пры болях у суставах, пры падагры. Даўней адвар (па шклянцы на ноч) выпівалі як лёгкі заспакаяльны сродак. З працёртай свежай рэпы і гусінага тлушчу (2:1) гатавалі мазь, якой лячылі абмаражэнні.

Сок або адвар караняплодаў рэкамендуецца пры моцным кашлі, бранхіце, бранхіяльнай астме. Адвар гатуюць з дзвюх сталовых лыжак здробненай рэпы і шклянкі кіпеню, п'юць па 1/4 шклянкі 4 разы на дзень.

Улічваючы такія заслугі рэпы, на яе варта звярнуць увагу і высаджваць хоць бы як лякарства.

Рэпа не баіцца пахаладанняў, караняплоды робяцца яшчэ больш саладзейшымі. Гэта маглі заўважыць тыя агароднікі, хто высяваў рэпу другім тэрмінам (у чэрвені) і збіраў ураджай перад замаразкамі. Гэта культура вельмі патрабавальная да вільгаці, у астатнім — яна без капрызаў. Пры недахопе вільгаці ў глебе фарміруюцца дробныя і грубыя горкія караняплоды. Рэпа расце на любых глебах, але не любіць кіслыя. Караняплоды, вырашчаныя на кіслых глебах, моцна паражаюцца кілой і дрэнна захоўваюцца.

СЛУШНЫЯ ПАРАДЫ

Стрыжыце кусты

Многія садаводы асцерагаюцца, што калі яны зрэжуць секатарам верхнюю частку кроны ў кустоў чарнаплоднай рабіны і глогу, то пацерпіць будучы ўраджай. Між тым, гэтыя культуры пры пастаянным укарочванні пладаносяць ніколькі не горш (а часам нават лепш), чым пры свабодным росце. Затое іх нізкая густая крона служыць жывой агароджай, недаступнай для чужога вока, а з невысокіх кустоў і ўраджай здымаць лягчэй. Абрэзку лепш праводзіць раз у 2—3 гады, укарочваючы крону да вышыні 1,3—1,5 м. Кусты гэтых раслін настолькі зімастойкія, што не баяцца перадзімовай абрэзкі.

ПАДКАЗКІ БЫВАЛЫХ

Абарона ад слізнякоў

● Тоўстай вяроўкай абматаць дрэва. Шурпатыя варсінкі вяроўкі будуць калоць мяккую скуру слізнякоў і яны не палезуць на дрэва.

● Зямлю пад дрэвамі і кустамі вечарам пасыпаць вапнай, размолатай у парашок.

...ад вусеняў у садзе

● Напоўніць металічнае вядро ці таз гарачымі вугольчыкамі і паставіць пад дрэва, галінкі якога ўсыпаны вусенямі, на такой адлегласці, каб полымя не пашкодзіла лістоў, на вуглі пакласці тоўчаную серу. Пары, якія падымаюцца з вядра, — згуба для вусеняў і іншых шкодных насякомых.

● Дапамагае і апырсканне паражоных галін растворам гаспадарчага мыла (кавалак на вядро вады). Рабіць гэта трэба вечарам ці перад узыходам сонца.

● Змяшаць дзве часткі хлорнай вапны і адну частку свінога тлушчу. Атрыманым цестам змазаць паклю і абвязаць ёй ствол дрэва. Ад хлорнага пару вусені адразу ападаюць на зямлю. Матылькі самі ўцякаюць з апрацаваных хлорнай вапнай дрэў, і не адкладваюць на іх яйкі.

● Пасеяны кроп па краях градак, пах якога адпуджвае вусеняў і матылькоў. Асабліва гэта добра для капусты і рэпы.

● Каб знішчыць вусеняў на капусце, паміж раслінамі спальваюць старыя анучы, апрацаваныя растопленай серай.

Чаму буракі несалодкія?

Калі на лістах буракоў з'явіліся невялікія круглыя плямы са светлым цэнтрам і выразнай чырвонай паласой, гэта сведчыць аб тым, што расліны захварэлі. Першых прыкмет захворвання, як правіла, мы не заўважаем, і толькі потым, калі большасць лістоў робяцца бурачырвонымі, а ніжнія адміраюць, вось тады мы думаем, што расліны захварэлі і іх, напэўна, трэба было б палячыць. Але з цягам часу мы заўважаем, што расліны не толькі не загінулі, а на іх з'яўляюцца новыя зялёныя лісты, тады мы думаем, што хвароба прайшла сама па сабе. Але мала хто ведае, што ранняе засыханне ніжніх і адрастанне новых лістоў адбываецца за кошт траты цукраў караняплодамі. І толькі потым хвароба нагадвае аб сабе. Буракі, паражоныя цэркаспарозам, несалодкія, нясмачныя і дрэнна захоўваюцца.

Узбуджальнікам гэтага захворвання з'яўляецца грыб, які зімуе на паражоных лістах буракоў і пустазеллі, якія хварэюць на цэркаспароз, і знаходзяцца на паверхні глебы ці на глыбіні не больш як 10 см. Хвароба буракоў праяўляецца летам праз 7—14 дзён пасля таго, як інфекцыя трапіла на лісты. Заражэнне цэркаспарозам узрастае пры чаргаванні вільготных і засушлівых перыядаў у другой палове лета, а таксама калі буракі вырошчваюцца ў паніжаных мясцінах, на сырых глебах і пры моцных палівах. Змагацца з хваробай трэба гэтак жа, як і з іншымі грыбковымі захворваннямі раслін.

Калі зрэзваць кветкі ў букет

Не рэкамендуецца зрэзваць кветкі ў гарачыя гадзіны дня: лепш за ўсё гэта рабіць вельмі рана, калі яшчэ ляжыць раса, а ў дзень — толькі ў пахмурнае надвор'е. Для зрэзвання выкарыстоўваецца востры нож альбо секатар. Зрэз павінен быць касым. Кветкі зрэзвайце з доўгім сцяблом — гэта дасць магчымасць захаваць большы запас пажыўных рэчываў. Нарцысы і цюльпаны зрэзваюць у стадыі афарбаваных бутонаў. Пярэсны (купальніцы) і маркі — калі бутоны вось-вось раскрыюцца. Ружы — калі адагнутыя чашалісцікі на бутонах. Касачы — пры раскрыцці першай (ніжняй) кветкі. Гладыёлусы — пры раскрыцці дзвюх ніжніх кветак. Дэльфініумы, астыльбы, лубін, ільвіны зеў — калі суквецці раскрыліся напалову. Духмяны гарошак — калі раскрыліся 3/4 усіх кветак. Бэз — пры раскрыцці суквецця напалову. Півоні — калі бутоны толькі-толькі пачнуць раскрывацца. Хрызантэмы, вяргіні, цынні і іншыя махровыя і буйныя кветкі зразаюць, калі яны амаль поўнасцю раскрыліся.

Перш чым скласці букет, пастаўце зрэзаныя кветкі на 3—4 гадзіны ў халаднаватае месца (халадзільнік, склеп) і накрыйце іх вільготнай марляй ці паперай.

Барацьба са шкоднікамі і хваробамі

Лоўчыя паясы (юбкі).

Тля.

У ліпені ў пладовых дрэў інтэнсіўна адрастаюць аднагадовыя парасткі, на якіх закладваецца большая частка ўраджаю наступнага года. Моцная гарачыня ўдзень перагравае маладыя лісцікі і стварае спрыяльныя ўмовы для размнажэння тлі, якая харчуецца сокам раслін. Значна прасцей не стварацца насякомым умоў для існавання на ўчастку, чым весці барацьбу з небяспекай. Пасля таго, як вы абарвалі лісты і зрэзалі парасткі, насякомыя звычайна пералятаюць на пустазелле ці на травяністыя расліны, тут яны размнажаюцца і жывуць да канца лета. Своечасовае знішчэнне пустазелля, а таксама зрэзванне пасынкаў у садзе — абавязковая ўмова для паспяховай барацьбы з тлёй. Дарэчы, лічынкі майскага жука ў працэсе свайго развіцця знішчаюць да 800 асобін тлі, а калі тлі няма, то лічынкі паядаюць адна адну.

У ліпені працягваюць накладваць лоўчыя паясы на пладовыя дрэвы. Правятрываюць і знішчаюць шкоднікаў, што назбіраліся пад імі, не менш чым 1 раз у тыдзень. З другой паловы жніўня лоўчыя паясы можна пакінуць на дрэвах да позняй восені, а затым зняць іх і спаліць разам са шкоднікамі.

Ягады чорных парэчак нярэдка паражаюцца лічынкамі пільшчыка: яны разрастаюцца, робяцца рабрыстымі і заўчасна чарнеюць. Пры выяўленні пільшчыка збіраюць пашкоджаныя ягады і спальваюць іх разам з лічынкамі, якія знаходзяцца ўнутры. Інакш незадоўга да таго, як ягады будуць сабраныя для ежы, лічынкі прагрызуць у іх адтуліны і сыдуць на зімоўку ў зямлю.

Пасля збору ўраджаю правесці апырсканне пладовых дрэў і ягадных кустарнікаў супраць тлі, кляшчоў, агнёвак, паршы.

Каб стрымліваць распаўсюджванне хваробаў па садзе, кожны дзень знімаюць гнілыя ягады і апад пладовых дрэў. Сабраныя пашкоджаныя плады трэба вынесці з участка, або глыбока закапаць (прыкладна на паўметра) у зямлю.

Канец ліпеня — лепшы час для акуліроўкі. З выбранай матачнай расліны нарэзаць парасткі даўжынёй не менш як 40 см. Нельга зразаць парасткі прадаўжэння цэнтральнага правадніка і асноўных галін (гэтым можна сапсаваць крону), а таксама браць кароткія парасткі — на іх магчыма будуць закладзены кветкавыя пупышкі. У зрэзанага парастка абрываюць лісцікі, пакідаюць чаранкі ў 1 см.

Усміхнёмся!

І трэці раз прыйшоў сігнал з глыбокага космасу, але маўчала Зямля: усе спадарожнікі перадавалі футбол.

☺

У аперацыйнай:

— Доктар, мы яго губляем!

— Шукай хутчэй, дурань! Скальпель не мог далёка праваліцца!

☺

У мужчынскіх кампаніях любяць абмеркаваць жанчын. У жаночых, як ні дзіўна, робяць тое ж самае.

☺

Хаваюць электрыка. З натоўпу:

— Такі малады яшчэ. Колькі яму стукнула?

— 220...

☺

Рыбалоў скардзіцца сябру.

— Проста не ведаю, што і рабіць. Трэці раз вяртаюся з рыбалкі і кожны раз знаходжу пад ложкам жонкі яе палюбоўніка.

— Больш не паедзеш на рыбалку?!

— Ну вось яшчэ! Думаю проста адпілаваць ножкі ў ложка...

— Давай, Сёма, зусім мала да вады засталося!..

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 3963. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12